Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

9 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.
ЧАЦВЕР
№ 191
(26304)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

Былі яблыкі па 250 рублёў, сталі па 200. Як разлічвацца з вяскоўцам?

Жыхар вёскі Новы Двор Валожынскага раёна, інвалід II групы Аляксандр Уладзіміравіч Яцук вырашыў здаць у мясцовы магазін яблыкі. Закупачная цана, якую ён убачыў у мінулую пятніцу ў мясцовай газеце, яго задаволіла — 250 рублёў за кілаграм.

— Напачатку гэтага тыдня назбіраў яблыкаў, атрымалася 470 кілаграмаў. Завёз іх у магазін, за іх паабяцалі разлічыцца на працягу аднаго-двух дзён. А ўвечары таго ж дня патэлефанавалі дадому з магазіна, маўляў, закупачная цана зніжана да 200 рублёў за кілаграм. Дык як такое можа быць, калі я сам бачыў у газеце зусім іншую лічбу? — абураўся Аляксандр Уладзіміравіч.

У самым канцы працоўнага дня ў аўторак удалося пагаварыць на гэтую тэму з эканамістам Валожынскага раённага спажывецкага таварыства Вольгай Саўчанкай. Яна паведаміла, што разлік з насельніцтвам за здадзеныя яблыкі вядзецца не за кошт прыбытку магазіна, яго абаротных сродкаў, а за кошт крэдытных грошай. Але на асваенне гэтых фінансаў (чытай: афармленне патрэбных папер) патрэбна якраз дзень-два. Ніякіх іншых прычын невялікай затрымкі з разлікамі з насельніцтвам за здадзеную прадукцыю няма.

Што да змянення закупачнай цаны на яблыкі, дык Вольга Іванаўна пацвердзіла такую інфармацыю: гэта адбылося ў аўторак згодна з рашэннем спажывецкага таварыства. Зразумела, мясцовая газета не магла аператыўна праінфармаваць насельніцтва пра такое змяненне. Ці была ў магазіне ў вёсцы Новы Двор на момант звароту туды з яблыкамі Аляксандра Яцука нейкая аб'ява наконт цаны? Вольга Саўчанка адказала, што не ўсе гандлёвыя прадпрыемствы паспелі папярэдзіць...

Лагічна разважаючы, наш чытач павінен быў атрымаць грошы за здадзеныя яблыкі па ранейшым кошце — 250 рублёў за кілаграм, праўда? Ніякай новай інфармацыі адносна закупачнай цаны ён не меў (яму яе не прадаставілі), а каб меў — магчыма, не стаў бы здаваць яблыкі. Вольга Саўчанка пагаджалася з такім меркаваннем, абяцала разабрацца ў сітуацыі больш дэталёва.

Раніцай у сераду мне паведамілі, што ўчарашняя суразмоўца з'ехала ў камандзіроўку ў Мінск. Давялося ўсё наноў выкладаць намесніку старшыні праўлення спажывецкага таварыства Валянціне Вырвіч. Яна таксама пагаджалася з вышэйвыкладзенымі аргументамі («мне няма чаго сказаць вам супраць»), дадаўшы толькі, што зніжэнне закупачнай цаны на яблыкі было вымушаным: перапрацоўчыя прадпрыемствы замест ранейшай цаны 400 рублёў +ПДВ пачалі плаціць за здадзеныя яблыкі 300 рублёў + ПДВ.

Але нечакана ўзнік новы момант. Са спасылкай на словы загадчыка магазіна ў вёсцы Новы Двор Валянціна Уладзіміраўна сказала, што быццам бы наш чытач Аляксандр Уладзіміравіч не здаў яблыкі, а толькі збіраўся гэта зрабіць. Давялося тэлефанаваць самому заяўніку. Апошні на момант нашага звароту адсутнічаў, аднак сын яго пацвердзіў, што бацька ў пачатку тыдня на кані завёз у магазін прыкладна 15 мяхоў яблыкаў...

Будзем спадзявацца, што ў Валожынскім раённым спажывецкім таварыстве падрабязна высвятляць усе акалічнасці справы. Калі чытач не завозіў яблыкі ў магазін да моманту, калі сталі вядомымі новыя закупачныя цэны, разлік з ім, зразумела, павінен быць ужо па новых цэнах. Калі завозіў, але не па сваёй віне не валодаў усёй інфармацыяй (нават у магазіне на той час яе не мелі), падаецца, будзе правільным і справядлівым разлічыцца з вяскоўцам па ранейшай закупачнай цане. Ці не так?

У цэнтры Еўропы шматдзетна

Фота Анатоля КЛЁШЧУКА.

Сімвал цэнтра Еўропы ўсталяваны на Полацкім бульвары, па якім любяць прагульвацца мамы і бабулі з немаўлятамі.

Письмо паклікала ў дарогу

«ШТО НАША ЖЫЦЦЁ — ГУЛЬНЯ?»

Чалавечае жыццё — дар божы. Гэтая прапісная ісціна, якую, на жаль, многія з нас пачынаюць усведамляць позна ці вельмі позна. Так сталася, што гэты — божы — вельмі часта знаходзіцца ў руках людзей у белых халатах. І калі амаль кожны з прадстаўнікоў мірных зямных прафесій мае права на памылку, то ўрач — ні ў якім разе. Калі доктар выцягвае пацыента з таго свету, яго работа ацэньваецца, як правіла, у даволі вузкім коле родных і блізкіх хворага. Калі здараецца, што пацыент альбо пацыентка памірае пры пэўных абставінах — іх гневу няма межаў. Гэта ўжо сапраўдная трагедыя, і такі выпадак можа мець шырокі рэзананс у грамадскасці часам з самымі непрадказальнымі наступствамі.

У рэдакцыю газеты «Звязда» нядаўна патэлефанаваў наш падпісчык з Мінска менавіта са скаргай на дзеянні ўрачэбнага персаналу Брэсцкай абласной бальніцы. Прычына звароту трагічная — у гэтай медыцынскай установе ў 74-гадовым узросце памерла яго мама, былая настаўніца. Голас у тэлефоннай трубцы прасіў разабрацца ў гэтай справе і паставіць кропкі над «і». У якасці дапаўнення прагучала: прайшло шмат часу, выйшлі усе тэрміны — а адказу з Міністэрства аховы здароўя Беларусі на пасланую скаргу так і няма...

Журналіст, зразумела, не следчы і не вялікі дока ў медыцынскай сферы, тым не менш адхіляць просьбу простага чалавека, а ў нашым выпадку і чытача, не стаў. Праз лічаныя дні ў рэдакцыі з'явіўся ліст мінчаніна Ігара Шугая. Цытуем.

«Паважаная рэдакцыя!

Да Вас звяртаецца падпісчык Ігар Шугай з Мінска. Вымушаны звярнуцца ў газету таму, што не бачу іншай магчымасці атрымаць адказы на пытанні, якія мяне хвалююць. А праблема, якая з'явілася, можа закрануць любога з нас.

25 чэрвеня 2008 года ў Брэсцкай клінічнай бальніцы памерла мая мама — Шугай Юлія Мікалаеўна. У бальніцу яна трапіла з нагоды пералому шыйкі сцягна, перанесла аперацыю, якая прайшла паспяхова, а памерла праз тыдзень пасля аперацыі ад абшырнага інфаркту прама ў стацыянары.

Узнікае пытанне: як такое магло адбыцца і чаму?

Спрабуючы аднавіць падзеі, якія папярэднічалі такому развіццю падзей, я, пасля размоў з роднымі і суседзямі мамы па палаце, прыйшоў да высновы, што ёй проста не была аказана своечасовая кваліфікаваная дапамога.

Пажылога чалавека, які неаднаразова скардзіўся на ўзніклыя болі, за некалькі гадзін не агледзеў урач. Нягледзячы на просьбу родных, у бальніцы не змаглі зрабіць кардыяграму.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

У ПАРЛАМЕНЦЕ ЎСЁ БОЛЬШ АБЦАСАЎ

Жанчын і мужчын сярод абраных Міншчынай дэлегатаў у Савет Рэспублікі — пароўну

У Маладзечне ўчора прайшлі выбары членаў Савета Рэспублікі ад Мінскай вобласці. 667 дэпутатаў раённых і Жодзінскага гарадскога савета дэпутатаў абралі сенатараў у наступнае скліканне. Прычым гендэрны склад выбранцаў збалансаваны — прадстаўнікоў прыгожай і моцнай паловы пароўну. Сярод іх ёсць і навічкі, і сенатары з вопытам (Анатоль Новікаў і Рыгор Чуйко працуюць у Савеце Рэспублікі дзеючага склікання). Запрошаны на ўрачыстае пасяджэнне Юрый Жадобін, дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Беларусі, прадстаўнік Прэзідэнта ў Мінскай вобласці, адрэкамендаваў «дэлегатаў» ад Міншчыны як годных людзей, якія будуць «дастойна прадстаўляць інтарэсы народа, рабіць усё магчымае, каб законы захоўвалі сацыяльную накіраванасць, садзейнічалі свабоднаму і гарманічнаму развіццю кожнага чалавека, каб канчатковыя вынікі заканатворчай работы гарантавалі стабільнасць і спакой у грамадстве». А якія ж планы на сенатарства ў саміх выбранцаў?

Найперш цікавы жаночы погляд, паколькі сёлета ахвотніцы паспрабаваць сябе ў ролі парламентарыя (як у верхняй, так і ў ніжняй палаце) актывізаваліся. Мы пісалі ўжо, што жанчын пабольшала ў Палаце прадстаўнікоў новага склікання. Пра гендэрны склад верхняй палаты рабіць высновы пакуль рана, аднак на прыкладзе Міншчыны тэндэнцыя пацвердзілася. У гутарцы з журналістамі старшыня праўлення Лагойскага раённага спажывецкага таварыства Ірына Парахневіч прызналася:

— Прадстаўніцтва ў Савеце Рэспублікі — гэта не толькі вялікі гонар, але і вялікая адказнасць. І адказнасць, відаць, ужо не за сябе, а за выбаршчыкаў — каб не падвесці, каб апраўдаць давер, які яны аказваюць. Я прадстаўляю спажывецкую кааперацыю — структуру, якая абслугоўвае сёння сельскае насельніцтва. Яно, як бы мы таго не хацелі, старэе. І вельмі важна не пагоршыць якасць яго абслугоўвання. Я буду ставіць пытанне аб тым, каб абслугоўванне сельскага насельніцтва было на высокім узроўні. А малыя населеныя пункты... У нас у Лагойскім раёне, напрыклад, 94 вёскі, у кожнай з якіх пражывае да 10 чалавек. І пакінуць гэтых жыхароў без абслугоўвання немагчыма. Гэта пытанне трэба вырашаць за кошт пашырэння аўтакрамаў, укаранення ў іх новага абсталявання, каб абслугоўванне было на высокім узроўні. Ну і вядома ж, праграма адраджэння і развіцця вёскі, развіццё гандлю, аказанне платных паслуг.

Аб сваім жаноцкім унёску ў работу Савета Рэспублікі яна выказалася так: «Не крыўдзячы мужчын скажу, што жанчына больш глыбока адчувае праблемы. Мяркую, са сваім вось гэтым жаночым чуццём, сваім разуменнем, жаданнем давесці да канца пачатую справу яна можа падказаць нешта моцнай палове. А недзе, магчыма, нават і ўзначаліць».

Яшчэ адна дама, Людміла Сакалоўская, намеснік генеральнага дырэктара па эканоміцы Барысаўскага завода аўтатрактарнага электрааабсталявання ўпэўнена:

— Уся мая работа (у Савеце Рэспублікі — **Аўт.**) павінна ісці праз прызму маіх прафесійных эканамічных ведаў — тое, што я назапасіла, працуючы на машынабудаўнічых прадпрыемствах на працягу амаль 30 гадоў. Лічу, у мяне дастаткова вопыту, каб яго прымяніць у плённай, крэатыўнай рабоце з дэпутацкім корпусам. Мяркую, што для таго каб забяспечыць канкурэнтаздольнасць прадукцыі, прэстыж нашай роднай Беларусі, нам неабходныя інавацыйныя тэхналогіі, інвестыцыі ва ўсе сферы эканомікі.

Маці дваіх дзяцей, яна не можа недаацэньваць важнасць работы з моладдзю на дзяржаўным узроўні. Жанчыне-сенатару, на яе думку, даводзіцца працаваць больш напружана. «Гэта высокае званне і адказнасць удвая большая. Як жанчына я павінна мець магчымасць быць дома, з сям'ёй, і ў той жа час прыярытэтам, відаць, усё ж застаецца работа, як і было заўсёды».

У рэйтынгу дэпутацкай прыхільнасці (у адпаведнасці з колькасцю атрыманых галасоў) жанчыны, дарэчы, занялі не апошнія месцы. Аднак лідарам стаў мужчына. Старшыня Мінскага аблвыканкама Леанід Крупец заручыўся падтрымкай 655 удзельнікаў галасавання. На два галасы менш атрымала Лілія Мароз — загадчык Першай Мінскай абласной дзяржаўнай натарыяльнай канторы. 652 дэпутаты аддалі свае галасы за Людмілу Сакалоўскую, якую мы згадвалі раней. Апроч памянёных у гэтым матэрыяле выбранцаў ад Мінскай вобласці, падтрымку дэпутатаў атрымалі таксама дырэктар Гарадзейскага цукровага камбіната Міхаіл Крыштаповіч і выкладчык Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў Алена Атрашкевіч (яна, дарэчы, напісала музыку для гімна Міншчыны).

Самым аўтарытэтным сенатарам ад Міншчыны, калі меркаваць па колькасці аддадзеных галасоў, з'яўляецца Леанід Крупец — яму слова:

— Я хачу падзякаваць дэпутатам за такі актыўны ўдзел, і тым хто супраць прагаласаваў (шасцёра дэпутатаў прагаласавалі супраць усіх кандыдатаў у сенатары — **Аўт.**), таму што калі б ўсё было добра, гэта таксама нядобра. І тых, якія сёння няправільна запоўнілі бюлетэні (пяць бюлетэняў былі прызнаныя несапраўднымі — **Аўт.**) — ёсць каму вучыцца яшчэ, — жартуе старшыня аблвыканкама і тут жа пераходзіць на сур'ёзны лад. — Толькі разам, толькі ў адным звяне мы можам сёння да лепшага змяніць наша жыццё. Я заклікаю ўсіх працаваць добрасумленна. За работу!

Нагадаем, што абраныя кандыдаты павінны быць афіцыйна зарэгістраванымі Цэнтрвыбаркамам. Гэта стане магчымым 14 кастрычніка, калі Цэнтральная камісія падвядзе вынікі выбараў у Савет Рэспублікі на чарговым пасяджэнні.

Ала МАЧАЛАВА.

Прамая лінія

Як процістаяць сасудзістай паталогіі галаўнога мозга?

Аб гэтым можна распытаць **Арнольда Фёдаравіча СМЕЯНОВІЧА,** прафесара, загадчыка нейрахірургічнага аддзела Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Неўралогія і нейрахірургія», члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь, Лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь.

«Прамая лінія» з яго ўдзелам пераносіцца на 14 кастрычніка, аўторак, з 16.00 да 17.00. Званіце па нумарах: 8 (017) 292 38 21 і 292 38 92.

«ШТО Ў ВАС ДОБРАГА?»

Святлана БАРОЎСКАЯ, актрыса, тэлевядучая:

— У мяне чакаецца добрая навіна: я хутка павінна атрымаць новую працу ў адным з нашых важных ведамстваў, у дадатак да той працы, што ў мяне ёсць. Яна будзе звязана з прэсай і я ўжо ў прадчуванні новай цікавай справы, яна ўжо валодае маімі думкамі. У асабістым жыцці добра тое, што я па-ранейшаму замужам і ў мяне двое дзяцей.

— А што б вы жадалі змяніць?

— Я нічога не хацела б змяніць, няхай усё застаецца так, як ёсць. Таму што самае складанае, на мой погляд, — захаваць тое, што маеш.

Аляксей ЕРМАЛАЕЎ, студэнт трэцяга курса Беларускай акадэміі музыкі:

— Здорава, што я займаюся любімай справай, іграю на сваім любімым інструменце. Я маю магчымасць выступаць, слухаць такіх музыкантаў, як Юрый Башмет і не толькі. Вядома ж, хваляваўся, калі выступаў перад ім на майстар-класе. Але я стараўся справіцца з хваляваннем і здолеў гэта зрабіць ужо ў ходзе выступлення. Гэта мне дало шмат добрага: маэстра ўдыхнуў у мяне нешта новае.

— Хочацца цяпер нешта змяніць?

— Магчыма, тое, што было сказана, я ведаў і дагэтуль: гэта моманты тэхналогіі, у самой падачы твора, у ігры. Маэстра іх агучыў і зараз у мяне толькі адно жаданне — ісці займацца!

Ірына ПЫЖЫК, прадавец латка садавіны і гародніны:

— У мяне з'явіліся новыя боты — і прыгожыя, і зручныя. Зрабіла сама сабе падарунак з заробку. Хацела якраз такія, каб і ў людзі выйсці было не сорамна, і ля латка стаяць не холадна. Яны з футрам унутры, можа яшчэ і зарана такія насіць, але ж хто пра гэта ведае? У нас жа не паспела сонца летам бліснуць — рыхтуй сані... Вось пастаіш так дзянёк-другі і марыш, каб увечары за табой прыехалі — а хоць бы і на санях. А цяпер, калі і не прыедуць, то ў гэтых ботах я пасля дня працы на нагах і сама дадому далячу.

— Што б вы хацелі змяніць?

— А што я змяню?.. Я магу толькі хацець. Мая ж праца моцна залежыць ад надвор'я. А яно ў нас такое, што позняя вясна пераходзіць у раннюю восень. Вось бы хто паклапаціўся пра тое, каб у нас і лета было. Хоць бы якое-небудзь бабінае.

Ларыса ЦІМОШЫК.

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

9 кастрычніка 2008 г. у 15.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) адбудзецца пасяджэнне адзінаццатай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

Новыя агароджы вяскоўцам абяцаюць. Водаправод, на жаль, не

З вёскі Граўжышкі Ашмянскага раёна месцічы адрасавалі рэдакцыі, можна сказаць, цэлы «стос» пытанняў. Практычна ўсе яны ў той ці іншай ступені звязаны з уладкаваннем у вёсцы аграрадка. Што, у прыватнасці, хвалявала заяўнікаў?

— Калі праводзілі добраўпарадкаванне аграрадка, паклалі асфальт, устанавілі агароджы. Але апошнія пачынаюцца чамусьці толькі ад школы, а адрэзак да навучальнай установы, дзе даўно стаяць два дамы, абышлі. У сельсавеце адказалі, быццам бы гэтыя домаўладанні не пазначаны на плане. Як гэта? І яшчэ. Зімой збіралі заявы ад жыхароў вуліцы Зялёнай на пракладку водаправода. Сабраць паперы сабралі, аднак далей гэтага справа не пайшла, — гаварылі нам жыхары вёскі.

Начальнік аддзела архітэктуры і будаўніцтва Ашмянскага райвыканкама Аляксандр Сушчэўскі, да якога мы мусілі звярнуцца ў пошуках адказу на запыт нашых чытачоў, патлумачыў наступнае.

— На цэнтральнай вуліцы вёскі па ўсёй яе даўжыні будзе ўстаноўлена новая бетонная агароджа. Дарэчы, няма яе пакуль і каля школы з таго боку тэрыторыі, якая выходзіць на гэтую цэнтральную вуліцу. Чаму? Значыць, проста не паспелі пакуль устанавіць, бо працы вельмі шмат, матэрыялы часам ідуць літаральна «з колаў»: у лістападзе аграгарадок павінен быць здадзены. Нейкія планы, пра што гаварылі вашы заяўнікі, тут ні пры чым. Агароджы будуць устаноўлены крыху пазней. Калі ўмовы надвор'я будуць спрыяць, іх нават сёлета пафарбуюць, калі не — выканаюць гэтую працу наступнай вясной. На бакавых жа вуліцах установяць новых бетонных агароджаў не прадугледжана. Тут — і тое па меры неабходнасці — могуць з'явіцца за кошт бюджэтных сродкаў драўляныя агароджы з жалезабетоннымі слупкамі. Умоўна кажучы, калі недзе плот у гаспадара ў добрым стане — навошта яго мяняць? — сказаў Аляксандр Пятровіч.

Сітуацыя з водаправодам для жыхароў вуліцы Зялёнай некалькі іншая. Так, пацвердзіў суразмоўца, раней спрабавалі прадугледзець пракладку па ёй нітку — як правіла, такія ключавыя пазіцыі закладваюцца менавіта пры будаўніцтве аграгарадкоў. Аднак у выніку выдзеленых сродкаў хапіла толькі на ўладкаванне адной артэзіянскай свідравіны на ўсю вёску. У саміх жа вяскоўцаў, тым больш жыхароў адной невялікай вуліцы, наўрад ці самастойна атрымаецца прафінансаваць такі праект — занадта вялікіх грошай ён патрабуе...

Сяргей РАСОЛЬКА.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Сёння — Сусветны дзень пошты

Аператар сувязі паштовага аддзялення № 34 Мінска Кацярына КАЗЛОЎСКАЯ.

ШЧОДРЫ ЛІПЕНЬ

У Беларусі самым багатым на нованароджаных месяцам 2008 года стаў ліпень. Як паведаміла намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна Шэметавец, у гэтым месяцы з'явіліся на свет 10 тыс. 539 малых.

На другім месцы ў своеасаблівым рэйтынгу дэмаграфічнай урадлівасці аказаўся жнівень (9 тыс. 591 дзіця), на трэцім — студзень (беларускія сем'і папоўніліся 9 тыс. 159 хлопчыкамі і дзяўчаткамі). А самы ніжні радок займае люты (8 тыс. 368 дзяцей).

У цэлым за студзень — жнівень сёлета ў Беларусі нарадзіліся 71 тыс. 282 дзіцяці — на 2,9 працэнта больш у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Спецыяліст адзначыла, што тэмпы росту нараджальнасці ў параўнанні з 2007 годам замарудзваюцца. Сярод рэгіёнаў рэспублікі па прыросце колькасці нараджэнняў лідзіруе Мінск (6,4 працэнта), на другой пазіцыі — Гомельская вобласць (4,9 працэнта), на трэцяй — Гродзенская (3,4 працэнта). Найменшы прырост адзначаны ў Віцебскай вобласці (усяго толькі 0,1 працэнта).

Алена ПРУС, БЕЛТА.

Міхаіл РАСОЛЬКА:

Каментарый па просьбах чытачоў

«АДЗІНАЯ СТАЎКА ПАДАХОДНАГА ПАДАТКУ ПА КІШЭНІ МАЛАЗАБЯСПЕЧАНЫХ ГРАМАДЗЯН НЕ ЎДАРЫЦЬ»

Сёлета жыхары Беларусі выплачваюць падаходны падатак па стаўцы ад 9 да 30 працэнтаў. Чым бліжэй да канца года, тым вышэйшая стаўка падаходнага падатку. Вядома, што замест дзеючай прагрэсіўнай гадавой шкалы ставак падаходнага падатку ў наступным годзе запланавана ўвесці лінейную адзіную стаўку ў памеры 12 працэнтаў. Пракаментаваць новы механізм падаткаабкладання грамадзян нашай газеце згадзіўся намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асобаў Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь Міхаіл РАСОЛЬКА.

— Для чаго ўводзіцца лінейная стаўка?

— Новы механізм спагнання падаходнага падатку павінен істотна спрасціць парадак вылічэння яго для бухгалтараў прадпрыемстваў і арганізацый. Другім плюсам наваўвядзення з'яўляецца тое, што ў наступным годзе будзе адменены абавязак па прадастаўленні фізічнымі асобамі даведак аб атрыманых сумах даходаў, пры змене месца працы. Трэцім плюсам стане тое, што істотна скароціцца сфера дэкларавання фізічнымі асобамі даходаў, якія былі атрыманы на працягу года. Адпадзе дэклараванне даходаў, атрыманых не па месцы асноўнай працы. Калі стаўка падаходнага падатку адзіная ў арганізацыях па ўсёй тэрыторыі Беларусі, то і дэкляраваць такія даходы не будзе патрэбна.

— Хто ў наступным годзе павінен будзе дэкляраваць атрыманыя даходы?

— Застанецца абавязак дэкляраваць даходы толькі для грамадзян, якія атрымліваюць даходы за мяжой Беларусі або ад іншых фізічных асобаў.

— Падаткавікі лічылі даволі актуальнай праблему заробкаў у канвертах...

— Спецыялісты міністэрства лічаць, што ўвядзенне лінейнай невялікай стаўкі падатку паспрыяе вывядзенню з ценявога абароту часткі даходу, які сёння выплачваецца ў канвертах. Улічваючы той факт, што максімальная стаўка падаходнага падатку сёння складае 30 працэнтаў, а стане 12 працэнтаў, то цяпер узнікае эканамічная перадумова цалкам легалізаваць даходы і выплачваць заробкі законным шляхам.

— Малазабяспечаныя грамадзяне сёння разлічваюцца з падатковымі органамі па мінімальных стаўках амаль на працягу ўсяго года. Як закранае новы механізм спагнання падаткаў гэту сацыяльную групу падаткаплацельшчыкаў?

— У выпадку ўвядзення адзінай стаўкі 12 працэнтаў будзе скарыстоўвацца стандартны падатковы вылік у памеры 250 тысяч рублёў. Мяркуецца, што гэта сума ў наступным годзе будзе адпавядаць памеру пражыткovага мінімуму. Разам з тым стандартны падатковы вылік у памеры 250 тысяч рублёў у месяц будзе давацца асобам, чый сярэднямесячны заробак не перавышае 1,5 мільёна рублёў. Напрыклад у тых работнікаў, якія атрымліваюць мільён рублёў, у наступным годзе будзе памяншацца падаткаабкладаемая база на 250 тысяч рублёў. Акрамя гэтага, застаюцца стандартныя падатковыя вылікі на дзяцей у памеры дзвюх базавых велічынь (сёння 70 тысяч рублёў) на кожнае дзіця.

Для грамадзян, якія атрымліваюць сапраўды маленькія заробкі, новаўвядзенне нават паменшыць падатковы цяжар. Яны выйграюць. Давайце падлічым памер падатку для работніка з заробкам 500 тысяч рублёў, у якога адно дзіця. Сёння яго падатковы вылік складаецца з сумы ўласнага падатковага выліку ў памеры 35 тысяч плюс 70 тысяч рублёў на дзіця. З астатняга памеру заробку бярэцца падаходны падатак у памеры 9 працэнтаў. Па новым механізме падаткаабкладаемая база будзе падлічвацца такім чынам, калі ад 500 тысяч адмінусуюць 250 тысяч рублёў стандартнага выліку работніка і яшчэ 70 тысяч рублёў на дзіця. Астатнія 180 тысяч рублёў абкладаюцца падаткам у памеры 12 працэнтаў. Відавочна, што памер падатку па новым механізме для малазабяспечаных грамадзян нават паменшыцца.

— Згодна з логікай вашых падлікаў, падатковы цяжар павялічыцца для людзей менавіта з сярэднімі заробкамі?

— Не зусім так. На практыцы, па выніках года грамадзяне выплачваюць, з улікам прагрэсіўнай шкалы, гэтыя самыя 12 працэнтаў. Магчыма, што работнікі з сярэднімі заробкамі будуць плаціць крыху большыя падаткі ў першыя месяцы года, у параўнанні з падаткамі ў гэты час па старой схеме. Аднак, трэба ўлічваць, што па прагрэсіўнай шкале заробкі на працягу года суміруюцца і ўжо праз 5—6 месяцаў падатковая стаўка «скочыць» да 15, а потым і 20 працэнтаў. Пасля ўвядзення адзінай лінейнай стаўкі з работнікаў будуць вылічваць толькі 12 працэнтаў на працягу ўсяго года.

— Відавочна, што заробкі ў работнікаў будуць павялічвацца. Ці існуе механізм карэкціроўкі стандартнага падатковага выліку і гранічнага памеру заробкаў, да якога гэты вылік даецца?

— Падатковы вылік у памеры 250 тысяч рублёў для грамадзян з заробкамі да 1,5 млн рублёў будзе дзейнічаць на працягу 2009 года. Разам з тым, мяркуецца, што разам з Законам аб бюджэце гэтыя лічбы будуць мяняцца. Спецыялісты ўпэўненыя, што стандартны падатковы вылік павінен адпавядаць памеру мінімальнага бюджэту пражыткovага мінімуму.

— Ці плануецца паменшыць сацыяльныя падатковыя вылікі для грамадзян, у якіх памер заробкаў складае, напрыклад, 2 млн рублёў?

— Нягледзячы на памер заробкаў, вылікі на дзяцей, маёмасныя і сацыяльныя вылікі, якія звязаны з будаўніцтвам жылля ці з навучаннем, застаюцца без змянення.

— У сувязі з увядзеннем адзінай стаўкі, як, на ваш погляд, павінен змяніцца агульны аб'ём паступленняў падаткаў у бюджэт краіны?

— Паводле падлікаў спецыялістаў, аб'ём паступленняў падаходных падаткаў павінен крыху павялічыцца. Па выніках мінулага года сярэдняя стаўка спагнання падаходнага падатку складае менавіта 12 працэнтаў. Павелічэнне паступленняў павінна адбыцца за кошт таго, што частка заробкаў выйдзе з ценявога абароту. Па вопыце тых краін, што пераходзілі на плоскую шкалу, бачна, што ўзровень паступленняў падаходнага падатку павялічваўся. Зараз спецыялісты Міністэрства па падатках і зборах Беларусі распрацоўваюць нарматыўны дакумент, які будзе прадугледжваць адпаведныя меры адказнасці за выплату заробкаў у канвертах. Згодна з праектам гэтага дакумента, у кантралюючых органаў будзе дакладны алгарытм па выяўленні падобных эканамічных парушэнняў. Прадугледжваецца, што пры выяўленні такіх выпадкаў выплаты заробкаў у канвертах, прадпрыемствы і індывідуальныя прадпрымальнікі будуць карацца фінансавымі санкцыямі.

Сяргей КУРКАЧ.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 08.10.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 114,00
1 еўра	2 883,60
1 латвійскі лат	4 066,56
1 літоўскі літ	835,19
1 чэшская крона	116,85
1 польскі злоты	824,94
1 расійскі рубель	80,80
1 украінская грыўня	379,53

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў
Цэнтрабанк РФ

USD	26,1629
10 UAH	46,9711
1000 BYR	12,3789
EUR	35,5632

Курс у гандлёвых кампаніях (на 07.10.2008 г.)
USD ..... 2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Інвестыцыі ў навізну

У АКАДЭМІІ НАВУК БУДЗЕ СВОЙ ТЭХНАПАРК

Беларуская эканоміка ў многім усё яшчэ грунтуецца на постсавецкіх прынцыпах. Гэта мела свае плюсы, аднак у апошні час стала баластам у паспяховым развіцці краіны.

Пра гэта паведаміў журналістам **намеснік дырэктара па навуцы Цэнтра сістэмнага аналізу і стратэгічных даследаванняў НАН Беларусі Георгій ГРЫЦ.** Паводле яго слоў, сёння энерга- і матэрыялаёмістасць прадукцыі на асобных айчынных вытворчасцях у некалькі разоў перавышае сусветныя паказчыкі. Ва ўмовах няўхільнага росту цэнаў на сыравінныя рэсурсы гэта адмоўным чынам адбіваецца на канкурэнтаздольнасці нашых тавараў на сусветным рынку. «Нават пры такой дзяржаўнай падтрымцы, якая існуе сёння ў нашай краіне, рэзерв на традыцыйныя вытворчасці ўжо вычарпаны, — паведаміў Г. Грыц. — Паводле нашых прагнозаў, калі нічога не прадпрымаць, неабарачальныя наступствы ў эканоміцы праявяцца ўжо ў 2010—2012 гадах. У нас наспела аб'ектыўная неабходнасць укаранення прынцыпова новых сучасных тэхналогій. Для Беларусі сёння надзвычай актуальны перавод эканомікі ад рэсурсаспажывальнай да эканомікі ведаў».

На гэта і скіравана Дзяржаўная праграма інавацыйнага развіцця. Яна ўтрымлівае 957 заданняў, асноўныя з якіх — стварэнне новых прадпрыемстваў з асваеннем перадавых тэхналогій, стварэнне новых вытворчасцяў на дзеючых прадпрыемствах, мадэрнізацыя існуючых вытворчасцяў.

Штогод ЗША выдаткоўвае на навуку 250 млрд бюджэтных долараў, Германія — 150 млрд долараў, Японія — 100 млрд. У Беларусі сёлета аб'ём фінансавання на навуку склаў 2 млрд долараў. Безумоўна, гэта недастатковая сума, таму мы павінны рабіць упор на кааперацыю, падкрэсліў Грыц. Яна прадугледжвае як укараненне праграмна-мэтавага метаду (калі шэраг навуковых інстытутаў аб'ядноўваюцца па адным профільным накірунку і кааперыруюцца з вытворчымі айчыннымі прадпрыемствамі), так і міжнародную кааперацыю. Выступоўца узгадаў сумесную мэтавую праграму Акадэміі навук і выканаўчага камітэта ЕўрАзС «Інавацыйныя біятэхналогіі», якая ўключае ў сябе 5 падпраграм, паўтара дзесятка праектаў (на рэалізацыю якой прадугледжана 15 млн долараў) і шэраг сумесных інавацыйных праграм у межах СНД (трансгенныя жывёлы, біяфармацэўтыка).

Чакаецца, што нягледзячы на рост цэнаў на энергарэсурсы, гэты год для Беларусі завершыцца з прафіцытам бюджэту — прыблізна ў 2 млрд долараў ЗША, паведаміў Георгій Грыц. І нягледзячы на тое, што бюджэт на наступны год ужо практычна сфарміраваны, беларускі ўрад гатовы пайсці на павелічэнне аб'ёму фінансавання айчыннай навукі, а дакладней, выдаткаваць 1 млрд долараў на прарыўныя тэхналогіі. Акадэміі навук было даручана вызначыць гэтыя тэхналогіі.

— Мы падрыхтавалі 12 праектаў. Напрыклад, праект распрацоўкі і асваення вытворчасці харчовай дабаўкі для папярэджання развіцця артэрыяльнай гіпертаніі (тэрмін акупнасці складае ўсяго 2,5 года, хоць для такога маштабу звычайна неабходна 5—7 гадоў), праект арганізацыі вытворчасці плеценых хірургічных ніцяў, тканых і вязаных вырабаў медыцынскага прызначэння (пакуль што мы ўсё набываем за мяжой, тэрмін акупнасці 3,5 года) і інш. Сапраўдным прарывам можна лічыць праект стварэння прадпрыемстваў па вытворчасці святло-выпраменьвальных вырабаў. Аб яго эканамічнай прывабнасці сведчыць той факт, што кампанія «Philips» ужо выказала гатоўнасць укласці ў яго сродкі.

Нягледзячы на станоўчыя зрухі, па некаторых прынцыпова важных накірунках інавацыйнага развіцця мы пакуль «прабуксоўваем». Так, доля нана-, бія- і касмічных тэхналогій у агульным аб'ёме вытворчасці ўсё яшчэ не перавышае 10—15 працэнтаў (для прыкладу, у некаторых іншых краінах гэты паказчык у сярэднім складае 30—40 працэнтаў). Навукаёмістасць беларускай прадукцыі не дасягае і аднаго працэнта. На думку Георгія Грыца, асноўная прычына — праблема трансфера і ўкаранення перадавых тэхналогій. Таму Акадэмія навук падрыхтавала праект стварэння акадэмічнага тэхнапарка.

— На наш погляд, Парк высокіх тэхналогій не выконвае тых функцый, якія першапачаткова на яго ўскладаліся. Таму мы ініцыюем стварэнне такой структуры, якая не толькі будзе своеасаблівай афшорнай зонай для ўкаранення інавацый, але і стане аказваць паслугі комплекснага суправаджэння. Сёння падрыхтаваны праект закона аб стварэнні венчурных фондаў і нацыянальнай венчурнай кампаніі, у сувязі з чым мы сёння распрацоўваем пытанне па стварэнні ў межах акадэмічнага тэхнапарка сваёй венчурнай кампаніі (тым больш, што шэраг беларускіх банкаў ужо выказаў згоду ўзяць у гэтым удзел). Акрамя таго, літаральна ўчора мы падпісалі пагадненне з расійскай венчурнай біржай, і цяпер беларускія прадпрыемствы, якія маюць інавацыйную скіраванасць, могуць выстаўляць свае партфелі для прыцягнення расійскіх інвестыцый.

Георгій Грыц асабліва падкрэсліў, што галоўная роля дзяржавы — стварэнне ўмоў для прыцягнення інвестыцый, а не стопрацэнтнае фінансаванне інавацыйных праектаў.

Інга МІНДАЛЁВА.

З 1 студзеня 2009 года педагогі дзіцячых школ мастацтваў усіх профіляў і тыпаў, як і раней, будуць мець адпачынак працягласцю 56 дзён

«Звязда» неаднаразова ўзнімала пытанне адносна істотнага змяншэння працоўнага водпуску выкладчыкам дзіцячых музычных школ і школ мастацтваў. У рэдакцыю паступала шмат лістоў, падпісаных не толькі дзясяткамі, але і сотнямі подпісаў. 22 красавіка 2008 года быў змешчаны артыкул «До, рэ, мі...» — своеасаблівае журналісцкае расследаванне пад рубрыкай «Чытачы ўзнімаюць праблему».

Невыпадкова на ўчарашняй прэс-канферэнцыі, прысвечанай Дню работнікаў культуры, які будзе адзначацца ў нядзелю, карэспандэнт «Звязды» пацікавілася, як вырашылася пытанне працоўнага водпуску.

Намеснік міністра культуры Віктар КУРАШ паведаміў:

«З 1 студзеня 2009 года педагогі дзіцячых школ мастацтваў усіх профіляў і тыпаў, як і раней, маюць адпачынак працягласцю 56 дзён».

Адпаведнае рашэнне было прынята Саветам Міністраў Беларусі 8 верасня 2008 года.

Добрая навіна напярэдадні свята! Нагадаю, у Беларусі 518 дзіцячых музычных школ і школ мастацтваў, там працуе каля 12,5 тысячы чалавек.

А ўсяго ў «культурнай» галіне працуе больш як 46 600 чалавек.

У Беларусі налічваецца каля 9,5 тыс. спецыяльных і публічных бібліятэк з агульным фондам каля 200 млн экзэмпляраў. Ставіцца задача: 15 працэнтаў бюджэтнага фінансавання бібліятэк накіроўваць на набыццё літаратуры. «На сёння гэта лічба ў сярэднім па краіне — 23 працэнты. За апошнія 2—3 гады бібліятэкі значна папоўніліся новай літаратурай», — адзначыў Віктар Кураш.

У сістэме Мінкульта 142 музеі. Па даручэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Дзяржаўны музей прыроды і экалогіі Беларусі ў верасні гэтага года перададзены ў падпарадкаванне Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Штогод музейная сетка папаўняецца новымі ўстановамі, ствараюцца і мадэрнізуюцца музейныя экспазіцыі. 1 верасня адкрыта для наведвальнікаў першая чарга экспазіцыі Палаца Радзівілаў у Нацыянальным гісторыка-культурным музеі-заказніку «Нясвіж».

Днямі адкрыецца экспазіцыя ў Паўночнай вежы Мірскага замка.

Пашыраецца міжнароднае супрацоўніцтва беларускіх музеяў. Рэгулярнымі сталі сумесныя выставачныя праекты вядучых беларускіх музеяў з музеямі Расіі, Украіны, Польшчы. Зараз у Нацыянальным мастацкім музеі экспануюцца выставы Слуцкіх паясоў з фондаў Дзяржаўнага гістарычнага музея г. Масквы і праваслаўных абразоў з фондаў Нацыянальнага Кіева-Пячорскага гісторыка-культурнага заказніка і Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі. У сярэднім за год у музеях рэспублікі экспануецца больш за 2 тысячы выстаў.

Музейны фонд, які з'яўляецца неад'емнай часткай нацыянальнай культурнай спадчыны, налічвае больш за 2,8 млн музейных прадметаў.

Плённа развіваецца сістэма ўстаноў народнай творчасці. Не згасае і фестывальны рух. Сёлета ў рэспубліцы праведзена больш як 50 фестываляў рознага статусу. Дарэчы, у параўнанні з 2006 годам колькасць фестываляў скарацілася амаль у тры разы.

Пытанне заработнай платы работнікаў культуры — таксама адно з актуальных. Сярэдняя заработная плата культработнікаў па краіне складае 581 тыс. рублёў. Сярод работнікаў рэспубліканскіх устаноў культуры крыху вышэйшая — 855 тыс. рублёў.

Журналісты ўзнімалі пытанне і адносна праблемнай сітуацыі, якая склалася ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы. Вось як пракаментаваў яе Віктар Кураш:

«Можа быць, шкада, а можа быць — гэта нармальны працэс у творчым калектыве, і асабліва тэатральным, калі на пэўнай ступені развіцця ўзнімаюцца пытанні аб лёсце тэатра, аб яго развіцці... Міністэрства культуры стварае ўмовы для работы. А камандаваць, што ставіць?.. Ёсць дзяржзаказ: напрыклад, да юбілею вызвалення Беларусі, да іншай важнай дзяржаўнай даты, якая святкуецца ўсенародна, пастаноўка спектакляў на адпаведную тэматыку...

Але мастацкія саветы тэатраў не павінны быць фармальнымі дарадчымі органамі пры дырэктары. Безумоўна, у асяроддзі творчых людзей складана пачуць адно-адзінае меркаванне адносна выбару п'есы ля пастаноўкі. Канчатковае рашэнне, вядома ж, — за кіраўніцтвам тэатра, галоўным рэжысёрам, бо менавіта яны адказваюць за творчы працэс у тэатры, за мастацкую частку... Таму хацелася б, каб пытанні будучыні тэатра абмяркоўваліся ў калектыве. Каб праблемы, калі яны існуюць, не заганяліся ў кут і не набывалі надзвычайную вастрыню. Гэта нармальная штодзённая работа: спрачацца, сумнявацца і знаходзіць сумеснае рашэнне складаных творчых пытанняў.

Міністэрства культуры ў курсе ўсіх праблем. Мы ацэньваем сённяшні рэпертуар тэатра імя Янкі Купалы як добры. У існуючай складанай сітуацыі мы дапаможам тэатру і сродкамі, і на арганізацыйным узроўні. На сёння, думаю, у тэатры ідзе нармальны творчы дыялог. Гэта цудоўна, што ёсць розныя думкі. Чым хутчэй калектыў агульнымі намаганнямі вызначыць пэўны шлях развіцця, тым лепш і карысней будзе для тэатра. Думаю, Купалаўскі тэатр як быў першай сцэнай рэспублікі, так і застанецца».

Мікалай Кірычэнка, генеральны дырэктар Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы:

«Калі чытаеш у некаторых СМІ пра тэатр: «бунт», «скандал»... Адбылася нармальная і даўно неабходная размова. Таму што праблемы, якія былі ўзняты ў лісце нашай актрысы да кіраўніцтва краіны, сапраўды існуюць. Я нясу адказнасць за гэту сітуацыю. Яна ўзнікла не сёння, не ўчора і нават не ў 2005 годзе, калі я стаў дырэктарам тэатра, — а доўжыцца ўжо шмат гадоў. Адбыўся сход, на якім акцёры выказалі незадаволенасць рэпертуарнай палітыкай, творчай абстаноўкай у тэатры. Зараз трэба знайсці канструктыўныя рашэнні, як выходзіць з крызісу. Але, паўтараю, гэта не «скандал» і не «бунт»! Бунт — гэта калі зруйнаваны кабінет дырэктара, ён сам акрываўлены... Так, даўно ўзнікла праблема, і я ўдзячны акцёрам, якія абсалютна шчыра выказаліся і сумленна гаварылі «ў вочы» кіраўніцтву тэатра непрыемныя рэчы...»

Хочацца спадзявацца, што, прайшоўшы праз жорнавы абмеркавання існуючых праблем (як адкрытых, так і скрытых), купалаўцы зноў, як калісьці, будуць здзіўляць гледача захапляльнымі творчымі адкрыццямі і знаходкамі.

У адным з бліжэйшых нумароў «Звязды» гэта тэма будзе прааналізавана больш падрабязна.

Таццяна ПАДАЛЯК.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Рыбакі рыбгаса «Сялец» Бярозаўскага раёна на вылаве прамысловай рыбы.

Перапраўлялі за мяжу...

Папярэднім расследаваннем УУС Магілёўскага аблвыканкама ўзбуджана крымінальная справа ў дачыненні да двух грамадзян Егіпта, якія маюць рэгістрацыю на пражыванне ў нашай краіне.

29-гадовы іншаземец, дырэктар прыватнага прадпрыемства, зарэгістраванага ў Горках, і яго 31-гадовы суайчыннік, студэнт адной з ВНУ, падазраюцца ў тым, што ў маі арганізавалі ўезд у рэспубліку 27-гадовага егіпцяніна і садзейнічалі яго выезду ў Грэцыю. Паводле папярэдняй інфармацыі, гэта не адзіны выпадак незаконнай дзейнасці падазроных: як мяркуецца, такім чынам яны пераправілі ў краіны Еўразоны некалькі дзясяткаў чалавек.

Дзмітрый СТАНКОВІЧ.

КРАЛІ ПАЛІВА

Супрацоўнікамі аддзялення па барацьбе з карупцыяй і арганізаванымі злачынствамі Брэсцкага АУС на транспарце выяўлена злачынная група, якая займалася крадзяжом і рэалізацыяй паліва. Машыніст і яго памочнік зліявалі салярку з цягніка, а іх таварыш перапраўляў здабычу ў суседнюю краіну. У гаражы «экспедытара» пры вобыску знойдзена каля 3000 літраў паліва. Усе трое затрыманы, ідзе следства.

Яна СВЕТАВА.

Ну і ну!

Ворагі сваім дзецям?

Колькасць жанчын, якія не хочуць прышчэпліваць сваіх нованароджаных дзяцей супраць туберкулёзу, у сталіцы павялічваецца.

Толькі ў адной 6-й бальніцы з пачатку года ад прышчэпкі адмовіліся 40 маці. У 2007-м такіх выпадкаў было 28, а ў 2006-м — 2, паведаміла ўрач-неанатолаг аддзялення нованароджаных 6-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска Алена Саржэўская. Да 2006 года падобных выпадкаў не было ўвогуле. Прычыны адмовы жанчыны не называюць. Вядома толькі, што ўсе яны наведвалі камерцыйныя немедыцынскія курсы па падрыхтоўцы да родаў, дзе ім правялі лікбез аб бескарыснасці прышчэпак супраць палачкі Коха. Між тым захворванасць на туберкулёз у сталіцы расце з кожным годам. На дыспансэрным уліку ў процітуберкулёзных установах нашага горада знаходзіцца больш за дзве тысячы хворых. І толькі вакцынацыя дае 100-працэнтную засцярогу ад каварнай інфекцыі.

Вольга ГРЫГОР'ЕВА,
«Мінск—Навіны».

Унітарныя прадпрыемствы БелГПП уключаны ў пералік арганізацый, якія ажыццяўляюць ацэнку кошту дзяржмаёмасці

Унітарныя прадпрыемствы Беларускай гандлёва-прамысловай палаты ўключаны ў пералік арганізацый, якія ажыццяўляюць ацэнку кошту дзяржаўнай маёмасці для правядзення з ёю здзелак і (або) іншых юрыдычных дзеянняў. Аб гэтым гаворыцца ва Указе № 543 «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 13 кастрычніка 2006 г. № 615», які 6 кастрычніка падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.

«Гэта дае магчымасць аператыўна і з мінімальнымі затратамі ажыццяўляць паслугі па ацэнцы кошту маёмасці па заказах дзяржаўных прадпрыемстваў і арганізацый», — растлумачылі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

У цэлым дакумент накіраваны на ўдасканаленне адносінаў у сферы ацэначнай дзейнасці ў Беларусі. Для стварэння адзінага прававога механізма вызначэння кошту аб'ектаў грамадзянскіх правоў як ацэншчыкамі, так і судовымі экспертамі Палажэнне аб ацэнцы кошту аб'ектаў грамадзянскіх правоў у Рэспубліцы Беларусь, зацверджанае ўказам № 615, дапоўнена нормай, згодна з якой ацэнка кошту гэтых аб'ектаў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з тэхнічнымі і іншымі нарматыўнымі прававымі актамі, абавязковымі для прымянення ацэншчыкамі і судовымі экспертамі. Для ўрэгулявання пытанняў, звязаных з ацэнкай маёмасці, якая павінна паступіць уласніку ў будучым, названае палажэнне дапоўнена нормай аб замацаванні за юрыдычнымі і фізічнымі асобамі права правядзення ўнутранай ацэнкі такой маёмасці. Указ уступае ў сілу з першага чысла месяца, што ідзе за месяцам яго афіцыйнага апублікавання.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Абзац

■ Тры сутэнёркі, якія займаліся сваёй злачыннай дзейнасцю ў сталічнай гасцініцы «Планета», прысуджаныя да 8 гадоў пазбаўлення волі кожная. Суд таксама прысудзіў дваіх былых швейцараў гасцініцы да трох гадоў. З 2000 па 2007 год асуджаныя «зарабілі» не меней за $60 тыс. Устаноўлена, што да занятку прастытуцыяй былі прыцягнутыя каля 30 жанчын ва ўзросце ад 20 да 60 гадоў. Прастытуткі аказвалі паслугі толькі іншаземцам, якія плацілі ў гасцініцы ($120 за гадзіну), швейцару аддавалі $15, каб ён упускаў іх, а 50 працэнтаў — сутэнёркам.

■ Дзяржаўныя інспектары працы ў студзені—верасні правялі больш як 10,6 тыс. праверак выканання наймальнікамі тэрмінаў выплаты заработнай платы. Парушэнні заканадаўства выяўлены ў 1218 арганізацыях рознай формы ўласнасці. Да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнуты 319 наймальнікаў, яны аштрафаваны ў памеры Br242,1 млн. Вынесены пастановы аб прыцягненні да адміністрацыйнай адказнасці 933 кіраўнікоў і іншых службовых асобаў з прымяненнем да іх санкцый у выглядзе штрафу на суму Br223,1 млн.

■ Новы навучальны год у Гродзенскай вышэйшай духоўнай семінарыі пачнецца ўрачыстай месай, якую 11 кастрычніка правядзе епіскап Гродзенскай епархіі Аляксандр Кашкевіч. Богаслужэнне пройдзе ў Фарным касцёле горада, у ім возьмуць удзел студэнты і выкладчыкі семінарыі. У час літургіі сямёра студэнтаў трэцяга курса ўпершыню ў сваім жыцці апрануць сутаны.

■ Адзін з самых тоўстых людзей свету — 47-гадовы мексіканец, вага якога дасягала 449 кілаграмаў, памёр па дарозе ў бальніцу. Сюжэт аб Хасэ Луісе Гарса незадоўга да яго смерці быў паказаны па тэлебачанні. Ён звярнуўся з просьбай аб дапамозе, заявіўшы, што стаў рэзка набіраць вагу пасля смерці сваіх бацькоў. Апошнія чатыры месяцы жыцця ён быў прыкаваны да ложка. Для таго, каб даставіць Гарса ў лякарню, давялося разабраць адну са сцен яго дома. Аднак пасля прыбыцця ў бальніцу ўрачы канстатавалі смерць Гарса, прычынай якой стаў абшырны інфаркт.

■ У Празе паставяць помнік коням, якія загінулі ў бітве пры Аўстэрліцы (тэрыторыя сучаснай Чэхіі). Аб гэтым заявілі прадстаўнікі Цэнтральна-еўрапейскага напалеонаўскага грамадства, якое аб'ядноўвае прыхільнікаў французскага імператара. Мэта стварэння манумента — аддаць належнае жывёлам, якія загінулі на палях бітваў. У 1805 годзе войска Напалеона атрымала пад Аўстэрліцам перамогу над войскамі Аўстрыі і Расіі. У агульнай колькасці ў бітве загінулі больш за дваццаць тысяч салдатаў і каля пяці тысяч коней.

■ Супрацоўнікі УУС Бабруйска затрымалі раней судзімую мясцовую жыхарку. У яе доме знойдзена 630 патронаў да пісталета Макарава калібра 9 мм, 400 патронаў да вінтоўкі калібра 7,62 мм і 2 незарэгістраваныя паляўнічыя стрэльбы. Акрамя таго 510 патронаў да пісталета Макарава жанчына здолела прадаць мясцоваму жыхару.

Поўны абзац

■ У аэрапорце горада Чжэнчжоу (Кітай) паломка ў гідраўлічнай сістэме кіравання самалёта, якая выявілася падчас пасадкі, магла прывесці да аварыі для 69 пасажыраў і сямі членаў экіпажу. Але пілоты змаглі спыніць лайнер. Наступныя падзеі прывялі гледачоў у шок. На поле выбеглі 30 чалавек, якія прыняліся ўручную пхаць 20-тонную махіну па кірунку да запасной паласы. Супрацоўнікам аэрапорта давялося «руліць» самалётам амаль кіламетр.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

НОБЕЛЕЎСКІ ЛАЎРЭАТ МОЖА ЗАСТАЦЦА БЕЗ ПРЭМІІ

Лаўрэат Нобелеўскай прэміі па фізіцы 2008 года Тасіхідэ Маскава можа не патрапіць на афіцыйную цырымонію ўручэння, паведамляе AFP. Цырымонія павінна адбыцца ў Стакгольме 10 снежня.

У сябе на радзіме нобелеўскі лаўрэат вядомы тым, што не любіць падарожнічаць. На канферэнцыі і ўручэнне розных узнагарод звычайна ездзіць яго сябар Макота Кабаяшы, які сёлета і падзяліў з Маскавай палову Нобелеўскай прэміі. Акрамя гэтага, паводле слоў жонкі Маскавы, у яго нават няма пашпарта, неабходнага для паездак за межы Японіі.

ПРАСПЕКТ ІМЯ ПУЦІНА З'ЯВІЎСЯ Ў ГРОЗНЫМ

Прэм'ер-міністр РФ Уладзімір Пуцін заявіў у інтэрв'ю газеце «Маскоўскі Камсамолец», што яму «не вельмі падабаецца» перайменаванне праспекта Перамогі ў горадзе Грозным у праспект Пуціна.

Паводле слоў прэм'ера, ён «нават не адразу зразумеў, у чым справа». Прэзідэнт Чачні Рамзан Кадыраў паведаміў Пуціну аб перайменаванні праспекта ў тэлефоннай гутарцы, аднак размова праходзіла ў машыне ва ўмовах дрэннай чутнасці. Як сказаў Пуцін, ён «толькі сёння раніцай адкрыў газету ў самалёце і ўсё зразумеў». Разгорнута каментаваць перайменаванне праспекта расійскі прэм'ер адмовіўся.

Указ, паводле якога ў Грозным з'явіўся праспект Пуціна, быў падпісаны Рамзанам Кадыравым 5 кастрычніка. Мэр горада Муслім Хучыеў растлумачыў, што такім чынам чачэнскія ўлады вырашылі адзначыць «заслугі Пуціна ў справе барацьбы з тэрарызмам, узнаўленні эканомікі, сацыяльнай сферы Чачэнскай рэспублікі».

РАСІЙСКІ ФЛОТ СТВАРАЕ БАЗУ Ў СІРЫІ

У сувязі з пагрозамі Украіны пазбавіць Чарнаморскі флот РФ базы ў Севастопалі расійскія маракі асвойваюць новы стратэгічны плацдарм у сірыйскім порце Тартус на Міжземным моры. Мясцовую гавань чысцяць і мадэрнізуюць, каб стварыць там пастаянную базу расійскіх ВМС, расказвае брытанская газета The Guardian.

Умацаванне расійска-сірыйскіх ваенных сувязяў асабліва ўстрывожыла Ізраіль. Ізраільскі прэм'ер Эхуд Ольмерт падчас візіту ў Маскву спрабаваў пераканаць расійскага прэзідэнта Дз. Мядзведзева спыніць продаж расійскай зброі Сірыі і Ірану. Яго запэўнілі, што Крэмль не дапусціць узнікнення пагрозы бяспекі Ізраіля, аднак ніякіх пэўных абяцанняў адносна продажу расійскай зброі Ольмерт, падобна, не дачакаўся.

Ваеннае супрацоўніцтва паміж Масквой і Дамаскам зноў актывізавалася на фоне пагроз Украіны выгнаць расійскі Чарнаморскі флот з базы ў Севастопалі, якая дае расійскім ВМС адзіны выхад у Міжземнае мора, адзначае брытанская газета.

ЗАВЯРШЫЛІСЯ ДРУГІЯ ТЭЛЕДЭБАТЫ КАНДЫДАТАЎ У ПРЭЗІДЭНТЫ ЗША

У Нэшвіле, штат Тэнэсі, завяршыліся другія тэледэбаты кандыдатаў у прэзідэнты ЗША Барака Абамы і Джона Макейна.

Дэбаты праходзілі ў форме адказу на пытанні выбаршчыкаў, дасланыя праз інтэрнэт і зададзеныя прысутнымі ў зале. Галоўным пытаннем, якое абмяркоўвалася падчас сустрэчы кандыдатаў, чакана быў фінансавы крызіс, яго прычыны і шляхі пераадолення. Абама і Макейн таксама паспрабавалі сфармуляваць асноўныя пункты сваіх эканамічных праграм.

Сярод знешнепалітычных тэмаў, якія закранулі кандыдаты, ізноў аказаліся ваенныя кампаніі ЗША ў Іраку і Афганістане і прыярытэты ў барацьбе з тэрарызмам. Макейн і Абама таксама абмяняліся меркаваннямі на тэму канфлікту на Каўказе, а таксама адносінаў Расіі з былымі краінамі СССР.

ГЛАБАЛЬНАЕ ПАЦЯПЛЕННЕ СПРЫЯЕ РАСПАЎСЮДЖВАННЮ «ТУЗІНА СМЕРТАНОСНЫХ ХВАРОБАЎ»

12 захворванняў, смяротна небяспечных для чалавека і дзікай прыроды, пашыраюць геаграфію свайго распаўсюджвання. Ліхаманка Эбала, халера, чума і сонная хвароба — гэтыя і іншыя захворванні, названыя «смяротным тузінам», паводле слоў вучоных-ветэрынараў з Таварыства аховы дзікай прыроды (WCS), распаўзаюцца па планеце дзякуючы кліматычным змяненням. Навукоўцы сцвярджаюць, што па стане здароўя дзікіх жывёл можна выявіць раннія прыкметы набліжэння эпідэмій і выратаваць мільёны людзей, піша газета The Times.

Даследчыкі заклікаюць стварыць па ўсім свеце органы назірання за дзікай прыродай, якія адсочвалі б сімптомы захворванняў у жывёл, перш чым хвароба перакінецца на людзей. У некаторых рэгіёнах свету назіральныя сеткі ўжо створаны і паспяхова ратуюць чалавечыя жыцці.

КАНДЫДАТ У ПРЭЗІДЭНТЫ ЗША ВЫЙШАЎ У ФІНАЛ КОНКУРСУ ВУСАЧОЎ

Кандыдат у прэзідэнты ЗША ад Лібертарыянскай партыі Боб Бар увайшоў у лік шаснаццаці фіналістаў конкурсу імя канадскага шоумена Роберта Гуле на званне самога паспяховага вусатага амерыканца.



Сярод сапернікаў Бара аказаўся, у прыватнасці, сяржант арміі ЗША Джон Альварэс, які адпусціў вусы, каб было прасцей мець стасункі з жыхарамі іракскіх вёсак (кожны дарослы іракскі мужчына абавязкова носіць вусы). Таксама сярод фіналістаў — некалькі знакамітых спартсменаў, у прыватнасці, бейсбалісты Джэйсан Джамбі і Гуз Госедж, персанаж мультсерыяла «Грыфіны» Кліўленд Браўн. Акрамя таго, у фінал выйшла газета The Boston Phoenix, якая, як адзначае Амерыканскі інстытут вусоў, «актыўна падтрымлівае рух вусатых амерыканцаў».

Пераможца конкурсу будзе вызначаны анлайн-галасаваннем, якое завершыцца 17 кастрычніка. Узнагароджанне пераможцы адбудзецца 25 кастрычніка ў Сэнт-Луісе на ўсеамерыканскім злёце вусачоў.

Гэта першы конкурс імя Роберта Гуле — знакамітага коміка, чые вусы лічацца ўзорам элегантнасці.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже аптечного киоска (павильона из металлоконструкций), находящегося по адресу: г. Молодечно, ул. Тавлая, 9. Начальная цена снижена на 50 % и составляет 6 772 500 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 30.07.2008 г. Аукцион состоится **21.10.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20.10.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 2246134
Сайт в интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	1	2	3	4
Предмет аукциона (месторасположение земельного участка, адрес, кадастровый номер)	Земельный участок, расположенный по адресу: Гродненская область, г. Щучин, ул. Кленовая, 18, в северной части г. Щучина в районе индивидуальной жилой застройки «Плянты», кадастровый номер 425850100004000156	Земельный участок, расположенный по адресу: Гродненская область, г. Щучин, ул. Ивана Мележа, 26, в северной части г. Щучина в районе индивидуальной жилой застройки «Плянты», кадастровый номер 425850100004000155	Земельный участок, расположенный по адресу Гродненская область, г. Щучин, ул. Ивана Мележа, 30, в северной части г. Щучина в районе индивидуальной жилой застройки «Плянты», кадастровый номер 425850100004000154	Земельный участок, расположенный по адресу: Гродненская область, г. Щучин, ул. Гастелло, 19, в центральной части г. Щучина, угловой участок на пересечении улиц Гастелло и Фрунзе в зоне жилой усадебной застройки, кадастровый номер 425850100003000279
Площадь земельного участка, га	0,1495	0,1500	0,1500	0,0708
Характеристика земельного участка (инженерная инфраструктура, наличие ограничений в использовании)	Существует возможность подключения к городским сетям: электричество, газопровод; участок примыкает к улице с гравийным покрытием; ограничения в использовании по перечню № 6 в связи с расположением его в охранной зоне линии электропередач напряжением до 1000 вольт на площади 0,0191 га	Существует возможность подключения к городским сетям: электричество, газопровод; участок примыкает к улице с гравийным покрытием; ограничения в использовании по перечню № 6 в связи с расположением его в охранной зоне линии электропередач напряжением до 1000 вольт на площади 0,0030 га	Существует возможность подключения к городским сетям: электричество, газопровод; участок примыкает к улице с гравийным покрытием; ограничения в использовании по перечню № 6 в связи с расположением его в охранной зоне линии электропередач напряжением до 1000 вольт на площади 0,0057 га	Существует возможность подключения к городским сетям: электричество, газопровод, водопровод, канализация, теплоснабжение; участок примыкает к улице с асфальтированным покрытием
Начальная цена предмета аукциона, руб.	1 010 859	1 014 240	1 014 240	1 705 445
Сумма задатка, руб.	101 086	101 424	101 424	170 544

1. Аукцион состоится **11 ноября 2008 г.** в 11.00 по адресу: 231513 г. Щучин, пл. Свободы, 11 (здание Дома Советов, малый зал районного Совета Депутатов).

Заключительная регистрация участников аукциона 11 ноября 2008 г. с 8.30 до 10.30.

2. Организатор аукциона – Щучинский районный исполнительный комитет, г. Щучин, пл. Свободы, 11; контактные телефоны комиссии: председатель (8 01514) 27044, заместитель председателя (8 01514) 27064, секретарь (8 01514) 28152.

3. Прием заявлений и прилагаемых документов на участие в аукционе производится с 11 октября 2008 г. по 5 ноября 2008 г. включительно с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кабинет 54.

4. Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь.

5. К заявлению прилагаются следующие документы:

заверенная копия платежного поручения о внесении задатка;

копия документа, содержащего идентификационные сведения о гражданине, без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

6. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет организатора аукциона № 3642000000090 в филиале № 424 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Щучин, код 505, получатель Щучинский районный исполнительный комитет, УНП 500066573.

7. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками. Предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

8. Победитель аукциона обязан:

подписать протокол аукциона;

в течение 10 рабочих дней после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка: внести плату за выкуп участка в частную собственность; возместить затраты за проектно-изыскательские землеустроительные работы в сумме 510613 руб. (лот 1, 2, 3) или 549957 руб. (лот 4), за государственную регистрацию в сумме 84000 руб.; возместить расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ;

в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка осуществить государственную регистрацию права на земельный участок;

получить паспорт застройщика и разрешение на проведение строительно-монтажных работ в отделе архитектуры и строительства райисполкома;

приступить к занятию земельного участка не позднее одного года после получения свидетельства о государственной регистрации права на него.

9. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

НАСТАЎНІК З АРЭПІЧАЎ І ЯГО ВУЧНІ

Падчас адной з камандзіровак у Сцяпанкаўскі сельсавет Жабінкаўскага раёна звярнула ўвагу на камень-валун з мемарыяльнай дошкай і недабудаваны дом у маляўнічым, са слядамі адзічэлага саду, месцы. На дошцы накрэслена прозвішча земляка, а таксама слова «НАСТАЎНІК». Гэтае слова напісана вялікімі літарамі і на сціплым помніку, што ўстаноўлены на вясковых могілках, і на пастаменце бюста, які стаіць у школьным музейным пакоі. Цімафея Карнілавіча Лася яго землякі і вучні шануюць менавіта як настаўніка.

Яго імем названа вуліца ў Арэпічах. Гэтага высокаадукаванага чалавека памятаюць многія старэйшыя жыхары вёскі. Бацькі яго былі патомнымі сялянамі, земляробамі. Можа, ад цяжкай працы сваёй, ад спрадвечных мазалёў марылі пра святло навукі. І мары іх пазней увасобіліся ў дзецях, унуках, праўнуках і далейшых нашчадках. Для гэтага Карнілій і Агрыпіна на мяжы XIX і XX стагоддзяў здолелі даць чацвярым з шасці сваіх дзяцей вышэйшую адукацыю. Дык вось старэйшы іх сын Цімафей у 1900 годзе скончыў Свіслацкую семінарыю і атрымаў паважанае тады званне народнага настаўніка. Малады настаўнік стаў выкладаць грамату вясковым дзеткам у суседняй вёсцы Агароднікі. Яго старанасць і здольнасці былі заўважаны, удачы сельскага педагога адзначала нават губернская прэса. Першыя поспехі акрылілі, і вясковы хлопец вырашыў атрымаць грунтоўную адукацыю, каб на настаўніцкай ніве дасягаць новых вышыняў, стаць арганізатарам адукацыі ў родных мясцінах. Ён паступіў на гуманітарны факультэт С.-Пецярбургскага ўніверсітэта, які, дарэчы, скончыў на выдатна ў 1916 годзе. Але жыццё гэтага чалавека выпала на эпоху войнаў, рэвалюцый, частых зменаў улады, што і абумовіла яго складаны, у многім драматычны лёс. Ды пад рознымі выпрабаваннямі, якія яму спасылаліся, інтэлігент з сялянскай закваскай выстаяў і як жа многа ён паспеў у сваім жыцці!

Першае цяжкае выпрабаванне яны вытрымалі ўжо з маладой жонкай — пецярбуржанкай Шурачкай Сталяровай у гады імперыялістычнай вайны. Жабінкаўскія родзічы вымушаны былі стаць бежанцамі ў глыб Расіі, а Цімафей з Аляксандрай і іх малыя дзеці перажылі гэты час на Віцебшчыне, дзе галава сям'і часова працаваў выкладчыкам гімназіі. Пасля рэвалюцыі Цімафей Карнілавіч прывёз сям'ю ў родныя мясціны. На радзіме была польская ўлада. Дыплом С.-Пецярбургскага ўніверсітэта нават не даваў права выкладаць у школе, давялося закончыць Віленскі педагагічны інстытут. І на пачатку 20-х гадоў Цімафей Лось стаў дырэктарам Брэсцкай рускай гімназіі. Пры ім гімназія хутка развівалася, з'явіліся кабінеты фізікі і біялогіі, даследчыцкія лабараторыі, спартыўная зала. Гімназія паступова станавілася культурным цэнтрам горада. Але ўлады западозрылі яго ў залішніх сімпатыях да ўсяго расійскага, і з пасадай давялося развітацца. Неўзабаве Цімафей вярнуўся ў фальварак Антанін каля Арэпічаў, які яшчэ раней купіў яго бацька. Тут ён працягваў справу жыцця і выкладаў у вясковых школах. Пасля ўсталявання Савецкай улады ў 1939 годзе, высокаадукаваны педагог быў некаторы час запатрабаваны ў вобласці, ён працаваў у абласным аддзеле адукацыі і шмат зрабіў для распаўсюджання асветы ў глыбінцы. Яго клопатамі тады адчынілі ў родных Арэпічах сямігодку. У Антаніне тым часам гаспадарыў сын Леанід, выпускнік Віленскага ўніверсітэта. Сын і адказаў за дзедаву сялянскую гаспадарлівасць, за куплены калісьці хутар. Адказаў дзясяткам гадоў лагераў. А Цімафея Карнілавіча ў чарговы раз пазбавілі пасадаў, зноў ён вярнуўся ў родныя мясціны.

Экскурсію ў музеі праводзіць дырэктар школы-садка Ларыса РАДКЕВІЧ.

І зноў найпершым яго клопатам стала школа. Ён дабіўся, што ў 1946 годзе школа ў Арэпічах стала сярэдняй. Дырэктар сабраў у калектыве такіх спецыялістаў, якімі наўрад ці магла пахваліцца якаянебудзь школа абласнога цэнтра. Тыя, хто баяўся рэпрэсій з-за сваіх «буржуазных» паходжання альбо адукацыі, прыязджалі ў Арэпічы. Вучні ўспамінаюць Рыгора Германовіча, Леаніда Чарвінскага. Выпускнік школы Яўграф Іванюковіч успомніў яшчэ адну настаўніцу, якая ўтойвала свой дыплом інстытута шляхетных дзяўчат, сваё веданне моў і глыбокую адукаванасць. Яна здала экстэрнам выпускныя экзамены за курс педінстытута і ціха выкладала ў Арэпічах. Паводле слоў Яўграфа Міхайлавіча, у іх была адзіная школа ў раёне, дзе ў кабінеце спеваў стаяў раяль. У школе вялікае значэнне надавалі заняткам фізічнай культуры, музыкі, замежных моў. Члены прыёмных камісій у шэрагу ВНУ на ўступных экзаменах па нямецкай мове пыталіся, з якога раёна прыехаў вясковы абітурыент, а пасля гаварылі «Пазнаю школу Германовіча».

Сярод выпускнікоў невялікай сельскай школы — два генералы, дактары навук у галіне медыцыны і тэхнікі, шэраг кандыдатаў навук і дзясяткі людзей, якія яшчэ ў савецкія часы, калі гэта было не вельмі распаўсюджана, атрымлівалі па дзве вышэйшыя адукацыі. У Арэпіцкай школе, відаць, прышчаплялі любоў і жаданне вучыцца.

І вось удзячныя вучні, выпускнікі школы, загарэліся ідэяй ўвекавечыць памяць свайго настаўніка. Узначаліў работу Яўграф Іванюковіч. І напачатку Яўграф Міхайлавіч вырашыў адшукаць нашчадкаў Цімафея Лася. Сам Цімафей Карнілавіч памёр у 1953 годзе і пахаваны побач са сваімі бацькамі. Дачка яго Лідзія Цімафееўна выехала разам са сваім мужам у Варшаву яшчэ ў канцы 30-х гадоў. Сын Леанід у 54-м быў рэабілітаваны, і на першай хвалі хрушчоўскай аддлігі выехаў разам з маці да сястры ў Польшчу. Цікава, што абое дзяцей арэпіцкага настаўніка, усе яго ўнукі і праўнукі атрымлівалі ў розны час вучоную ступень доктара навук. Леанід стаў доктарам юрыдычных навук, Лідзія — доктарам псіхалогіі. Яе дачка Ванда — доктар медыцыны, мае ў Чыкага клініку. Дачка Ванды Джоана, доктар лінгвістычных навук, ведае асноўныя еўрапейскія і кітайскую мову і працуе ў Ганконгу. Нашчадкі Леаніда абсталяваліся найболей у Парыжы. І вось многія з іх прыехалі па запрашэнні Іванюковіча на сустрэчу выпускнікоў у Арэпічы ў 1999 годзе. Акрамя нашчадкаў дырэктара на вечар сустрэчы сабралася 400 выпускнікоў школы. Што тады найбольш уразіла Іванюковіча, іншых арганізатараў сустрэчы, землякоў настаўніка, дык гэта нестальгічна-шчымлівае стаўленне да памяці, да гістарычнай радзімы замежных гасцей. Джоана, якая нарадзілася і вырасла ў ЗША, так размаўляе нібы яна заўсёды жыла тут. А калі ўнучкі і праўнучкі заспявалі песні, што навучыла бабуля Шура, усе заслухаліся. Нібы нешта магічна звязанае з памяццю прадзеда, яны трапятліва паднімалі з зямлі яблыкі здзічэлых яблынь і любаваліся імі, фатаграфавалі на памяць аграмадныя дрэвы, што разрасліся на месцы сядзібы Антанін.

Вынікам той сустрэчы сталі альбомы, прысвечаныя кожнаму з нашчадкаў настаўніка з Арэпічаў. І пакрысе стаў збірацца музей. Потым стараннямі Яўграфа Іванюковіча, яго таварышаў з'явіўся бюст Цімафея Лася, камень-валун з памятнай дошкай. І нарэшце былы вучань атрымаў дазвол на будаўніцтва дома на месцы колішняга хутара Ласёў, каб ажывіць-адрадзіць сядзібу і перанесці туды музей. Пакуль жа музейны пакой месціцца ў Арэпіцкай школе-садку.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Жабінкаўскі раён.

Камень-валун на месцы сядзібы.

Прадпрымальнікі ў невялікіх гарадах атрымаюць падатковыя льготы

У пералік населеных пунктаў, на якія не распаўсюджваецца дзеянне Дэкрэта нумар 1 ад 28 студзеня 2008 года «Аб стымуляванні вытворчасці і рэалізацыі тавараў (работ, паслуг)», у адпаведнасці з пастановай урада № 1451 увайшлі 22 гарады. Аб гэтым паведамілі ў Міністэрстве эканомікі Беларусі.

У прыватнасці, дзеянне Дэкрэта № 1 не будзе распаўсюджвацца на Баранавічы, Брэст, Пінск (Брэсцкая вобл.), Віцебск, Наваполацк, Оршу, Полацк (Віцебская вобл.), Гомель, Жлобін, Мазыр, Рэчыцу, Светлагорск (Гомельская вобл.), Гродна і Ліду (Гродзенская вобл.), Барысаў, Жодзіна, Маладзечна, Слуцк і Салігорск (Мінская вобл.), Бабруйск і Магілёў (Магілёўская вобл.), а таксама Мінск. У гэтых гарадах колькасць насельніцтва перасягае 50 тыс. чалавек. Ва ўсіх астатніх населеных пунктах Беларусі прадпрымальнікі змогуць выкарыстаць падатковыя прэферэнцыі, што дасць магчымасць актывізаваць дзелавую актыўнасць, падкрэслілі ў Мінэканомікі.

Спецыялісты таксама адзначылі, што ў пералік не ўключаны горад Кобрын, нягледзячы на колькасць насельніцтва 50,5 тыс. чалавек (на 1 студзеня 2008 года), таму што ўзровень беспрацоўя тут амаль у 2 разы перасягае сярэдні па Брэсцкай вобласці (адпаведна 2,1 працэнта і 1,2 працэнта). Прымяненне нормаў Дэкрэта № 1 павысіць інвестыцыйную прывабнасць дзейнасці камерцыйных арганізацый у гэтым горадзе, што дасць магчымасць стварыць дадатковыя рабочыя месцы.

Таксама не ўвайшоў у пералік Слонім, дзе па стану на 1 студзеня 2008 года налічвалася 50,9 тыс. чалавек. Зробленае выключэнне абумоўлена тым, што горад уключаны як праблемны ў пералік малых і сярэдніх гарадскіх паселішчаў у адпаведнасці з указам № 265 ад 7 чэрвеня 2007 года «Аб Дзяржаўнай комплекснай праграме развіцця рэгіёнаў, малых і сярэдніх гарадскіх паселішчаў на 2007—2010 гады».

БЕЛТА.

ПЛОТ–КРЭПАСЦЬ

в. Шантароўшчына Докшыцкага раёна.

Фота Анатоля КЛЁШЧУКА.

ВАМ АДКАЗВАЕ ЮРЫСТ

Алена ДЗЕВОЙНА

РУБРЫКУ ВЕДЗЕ

ДАМОЎЛЕНАСЦЬ ТРЭБА ВЫКОНВАЦЬ

Я працую па кантракце, тэрмін якога заканчваецца толькі праз два гады. Нядаўна я знайшоў новую перспектыўную работу, напісаў заяву з просьбай звольніць мяне па ўзгадненні бакоў праз два тыдні. Дырэктар пайшоў мне насустрач, з датай звальнення ён пагадзіўся. Прайшоў тыдзень, дырэктар вызваў мяне і паведаміў, што пакуль няма замены, звольніць мяне ён не можа.

Андрэй З., *г. Віцебск*

Згодна з артыкулам 35 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь адной з падстаў спынення працоўнага дагавора з'яўляецца пагадненне бакоў. Артыкулам 37 кодэкса ўстаноўлена, што спыніць па ўзгадненні бакоў у любы час можна як працоўны дагавор, заключаны на нявызначаны тэрмін, так і тэрміновы працоўны дагавор. Асноўнае, што для гэтага патрабуецца — гэта дасягненне ўзаемнай дамоўленасці паміж работнікам і наймальнікам аб спыненні працоўных адносінаў у вызначаны імі дзень. Якіх-небудзь патрабаванняў да формы пагаднення кодэкс не прад'яўляе. Гэта можа быць як вусная форма, так і пісьмовая. У спрэчнай сітуацыі, разумела, перавага надаецца пісьмовай форме пагаднення. Так, напрыклад, гэта можа быць напісаная работнікам заява з просьбай аб звальненні па ўзгадненні бакоў з указаннем пажаданай для яго даты звальнення і становіцца рэзалюцыяй наймальніка.

Паколькі пагадненне аб спыненні працоўнага дагавора з'яўляецца волевыяўленнем абодвух бакоў, то не дапускаецца аднабаковае яго ануляванне як работнікам, так і наймальнікам. Для гэтага неабходна зноў дасягненне ўзаемнай дамоўленасці. Так, калі бакі дасягнулі дамоўленасці аб спыненні працоўных адносінаў з вызначанай даты, але работнік працягвае выходзіць на работу, а наймальнік яго дапускае да работы, то працоўныя адносіны фактычна працягваюцца і па аналогіі з артыкулам 39 кодэкса працоўны дагавор лічыцца працягнутым на тых жа ўмовах і яго спыненне не адбылося.

Незалежна ад таго, у якой форме дасягнута пагадненне бакоў аб спыненні працоўнага дагавора, наймальнік абавязаны выдаць загад аб звальненні з даты, узгодненай бакамі, і азнаёміць з ім работніка пад роспіс, у дзень звальнення зрабіць адпаведны запіс у працоўнай кніжцы работніка і выдаць яму пад роспіс, канчаткова разлічыцца з работнікам.

Пунктам 17 пастановы Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 26.06.2008 г. № 4 «Аб практыцы разгляду судамі працоўных спрэчак, звязаных з кантрактнай формай найму работнікаў» прадугледжана, што калі пры разглядзе судом спрэчкі будзе ўстаноўлена, што наймальнік, нягледзячы на дасягнутае пагадненне аб спыненні кантракта з даты, указанай работнікам у заяве, не выдаў загад аб звальненні, а работнік спыніў работу, то аднабаковую адмову наймальніка ад дасягнутага бакамі пагаднення аб спыненні кантракта належыць прызнаваць неправамернай.

ДЗЕТАК — У КЛЕТКУ?

Сярод белага дня каля магазіна «Космас» у пяцідзесяцігадовай брастаўчанкі двое няпоўнагадовых зладзюжак спрабавалі вырваць з рук сумачку, але былі затрыманы міліцыяй. Абое — дзевяцікласніцы брэсцкіх школ. Прыкладна ў гэты ж час у цэнтры горада двое вучняў старэйшых класаў моцна збілі свайго равесніка, вучня гімназіі.

Яна СВЕТАВА.

ПРЫЗЫ АД «ЗВЯЗДЫ» — У КОЖНЫ ДОМ

У папярэднім нумары мы праанансавалі розыгрыш прызоў сярод нашых чытачоў па выніках падпіскі на 4-ы квартал 2008 года.

Адразу адзначым, што колькасць звяздоўцаў, якія захацелі паспрабаваць шчасця ў латарэі, была меншай, чым раней, што зусім зразумела: восеньскія клопаты вяскоўцаў і гараджан-дачнікаў не пакінулі часу на гульню. Тым не менш такая актыўнасць не адбілася на колькасці прызоў, сярод якіх было аж 7 каляровых тэлевізараў «Віцязь» і халадзільнік «Атлант».

Такім чынам, вось як размеркаваўся ўвесь прызавы фонд па выніках падпіскі на 4-ы квартал 2008 года

БЕЙСБОЛКА З ФІРМЕННЫМ ЛАГАТЫПАМ «ЗВЯЗДЫ»

Новік Таццяна Іванаўна, г.п. Урэчча, Любанскі раён, Мінская вобласць

Нагурны Яўген Пятровіч, в. Варацевічы, Іванаўскі раён, Брэсцкая вобласць

Блажэвіч Эліза Генрыхаўна, г. Міёры, Віцебская вобласць

Аскерка Таццяна Паўлаўна, п/а Глініца, Мазырскі раён, Гомельская вобласць

Балыш Мікалай Пятровіч, г. Ашмяны, Гродзенская вобласць

Кушнярова Марыя Ніканаўна, в. Далговічы, Мсціслаўскі раён, Магілёўская вобласць

Шахлевіч Іосіф Францавіч, г. Мінск.

МАЙКА З ФІРМЕННЫМ ЛАГАТЫПАМ «ЗВЯЗДЫ»

Кійко Міхаіл Сцяпанавіч, в. Обчын, Любанскі раён

Козел Тамара Іванаўна, г. Ляхавічы, Брэсцкая вобласць

Грык'ян Багдан Іосіфавіч, г. Паставы, Віцебская вобласць

Канцавая Тамара Пятроўна, г. Гомель

Юшкевіч Галіна Міхайлаўна, г. Навагрудак, Гродзенская вобласць

Лаўшук Аляксей Сцяпанавіч, г. Магілёў

Бондараў Рыгор Піліпавіч, г. Мінск

НАСТОЛЬНЫ ГАДЗІННІК З ФІРМЕННЫМ ЛАГАТЫПАМ «ЗВЯЗДЫ»

Курда Зінаіда Піліпаўна, в. Рэчань, Любанскі раён

Маліхтаровіч Леанід Іванавіч, в. Патапавічы, Ляхавіцкі раён

Кулеш Таіса Фёдараўна, в. Камаі, Пастаўскі раён

Чыркова Ірына Васільеўна, г. Рэчыца, Гомельская вобласць

Ган Кацярына Міхайлаўна, г. Ліда, Гродзенская вобласць

Вашкевіч Алена Іванаўна, г. Магілёў

Рачко Аркадзь Фёдаравіч, г. Мінск

КАЛЯРОВЫ ТЭЛЕВІЗАР «ВІЦЯЗЬ»

Казей Сяргей Астапавіч, в. Ніва, Уздзенскі раён, Мінская вобласць

Барнюк Сцяпан Васільевіч, г. Пінск, Брэсцкая вобласць

Савейка Аляксандр Аляксандравіч, г. Шаркаўшчына, Віцебская вобласць.

Маліноўская Зінаіда Канстанцінаўна, п. Лукскі, Жлобінскі раён, Гомельская вобласць

Няпраўскі Пётр Іванавіч, в. Шатораўцы, Навагрудскі раён

Бародзіч Сямён Дзмітрыевіч, п. Дараганава, Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць

Барысенка Таццяна Алегаўна, г. Мінск

ХАЛАДЗІЛЬНІК «АТЛАНТ»

Барбашынскі Браніслаў Іванавіч, г. Валожын, Мінская вобласць

Віншуем усіх шчасліўчыкаў з выйгрышам каштоўных прызоў. Спадзяёмся, што ў далейшым пашанцуе тым нашым чытачам, якім птушка ўдачы пакуль не ўсміхнулася.

Просім прабачэння, калі ў спісы пераможцаў раптам украліся недакладнасць, бо не ўсе купоны напісаны разборліва.

Свае прызы, паважаныя чытачы, вы можаце атрымаць у рэдакцыі газеты «Звязда», пачынаючы з сённяшняга дня, пры наяўнасці пашпарта і падпіснога квітанцыі. Кантактныя тэлефоны: (8 017) 287 17 79 альбо 287 17 81

УВАГА! Суперпрызы — 7 каляровых тэлевізараў «Віцязь» і халадзільнік «Атлант» супрацоўнікі газеты «Звязда» даставяць кожнаму шчасліўчыку асобна і ўручаць ва ўрачыстай абстаноўцы ў прысутнасці кіраўніцтва мясцовай «вертыкалі» і работнікаў РУП «Белпошта» ў час падпіснога кампаніі на 1-е паўгоддзе 2009 года. Чакайце і заставайцеся са «Звяздой»!

Кар. «Звязды».

«ШТО НАША ЖЫЦЦЁ — ГУЛЬНЯ?»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пры тым, што мясцовая прэса за гэты перыяд з гонарам паведамляе аб поспехах мясцовай медыцыны, аб правядзенні менавіта ў гэтай бальніцы першых аперацый на адкрытым сэрцы.

Я звярнуўся з пісьмом да міністра аховы здароўя, у якім падрабязна перасказаў усе падзеі і папрасіў разабрацца і даць адзнаку дзеянням медыцынскага персаналу. Аднак да гэтага часу (ліст напісаны 17 верасня 2008 года. — **Аўт.**), за два месяцы адказу не атрымаў.

Можа быць рэдакцыі і чытачам будзе цікава даведацца: як працуе наша медыцына і чаму людзі паміраюць прама ў бальніцы ад раптоўных інфарктаў?

Я прашу Вас назначыць правядзенне журналісцкага расследавання і даручыць яго прафесіяналу. Магчыма ён зможа развеяць мае сумненні ці, наадварот, прадставіць даставерную інфармацыю, якую не хочуць агучыць медыкі, выходзячы са сваіх карпаратыўных інтарэсаў.

Прыкладаю копію пісьма, адпраўленага Міністру аховы здароўя Рэспублікі Беларусь 09.07.2008 г.».

Відавочна, што дасланы ў рэдакцыю ліст быў напісаны ў скарочаным варыянце, у якім часткова былі апушчаны падрабязнасці. А магчыма штосьці проста прызабыта. Як-ніяк, з моманту смерці маці прайшло на той момант амаль тры месяцы. Праўда, свет на гэты трагічны выпадак большай часткай праліў пісьмовы зварот чытача «Звязды» да міністра аховы здароўя Беларусі Васіля ЖАРКО. Цытую.

«Паважаны Васіль Іванавіч!

Прашу Вас назначыць і ўзяць пад асабісты кантроль правядзенне службовай праверкі па факце смерці 25 чэрвеня 2008 года ў Брэсцкай абласной бальніцы маёй мамы — Шугай Юліі Мікалаеўны.

13 чэрвеня 2008 года Шугай Ю.М. была дастаўлена службай хуткай дапамогі ў аддзяленне траўматалогіі ў сувязі з пераломам шыйкі сцягна.

19 чэрвеня 2008 года ёй была праведзена аперацыя па замене тазасцегнавога сустава. Аперацыя прайшла паспяхова.

Пасля аперацыі знаходзілася ў аддзяленні рэанімацыі. Прыкладна праз 4-5 гадзін была пераведзена ў аддзяленне траўматалогіі.

У сувязі з тэлефонным званком, які паступіў ад суседзяў па палаце каля 20.00, у бальніцу хутка прыбылі родныя: сын Шугай В.П. і дачка Лобан С.П. У гэты час маці адчувала сябе вельмі дрэнна, скардзілася на рэзкую слабасць, сухасць у роце, галаўны боль, А/Д 95/50 (артэрыяльны ціск. — **Аўт.**).

Прычыны ранняга праводу з рэанімацыйнага аддзялення хворай з абцяжарвальным анамнезам (цукровы дыябет, ІБС (ішэмічная хвароба сэрца. — **Аўт.)**, гіпертанічная хвароба, перанесены інсульт, інвалід першай групы) урач Я. Сахарук растлумачыць родным, што прыехалі, адмовіўся.

Медыцынскі персанал траўматалогіі, нягледзячы на цяжкі стан маці, ніякай дапамогі не аказваў. Урач аддзялення траўматалогіі Навасад Л.І. літаральна заявіў: «Ваша маці — вы з ёй і сядзіце».

Толькі па патрабаванні родных была праведзена інфузійная тэрапія. Пасля чаго прыкладна да дзвюх гадзін ночы стан хворай палепшыўся.

На працягу некалькіх дзён яна адчувала сябе здавальняюча. Аднак, пачынаючы з 23 чэрвеня і 24 чэрвеня 2008 года скардзілася на пякучасць за грудзінай і пачуццё цяжкасці, аб чым паведаміла ўрачу, што лячыў, Шамоўскаму Л.В., у час абыходу.

З 17.00 да 19.45 24.06.2008 года побач з мамай знаходзілася пляменніца — Кірпічэнка Людміла Мікалаеўна. Яна неаднаразова звярталаса па дапамогу да паставой медыцынскай сястры, прасіла, каб маці без прамаруджвання агледзеў доктар, каб была зроблена ЭКГ (электракардыяграма. — **Аўт.**). Аднак медыцынская сястра паведаміла, што зрабіць ЭКГ няма магчымасці, прама на пасту перадала кроплі валакардзіну, іншай дапамогі аказана не было, доктар хворую за некалькі гадзін так і не агледзеў.

Дадзеныя факты могуць пацвердзіць не толькі родныя, якія ў гэты час падтрымлівалі сувязь па тэлефоне, але і суседзі па бальнічнай палаце.

Пасля 20.00 24.06.08 адбыўся абшырны інфаркт сэрца, што ў канчатковым выніку прывяло да лятальнага зыходу.

Смерць наступіла 25.06.2008 года ў 18.30.

З улікам вышэйсказанага прашу даць адзнаку дзеянням медыцынскага персаналу і адказаць на шэраг пытанняў, у прыватнасці:

1) ці былі захаваны стандарты аказання медыцынскай дапамогі ў пасляаперацыйны перыяд, а менавіта: ці правільна быў здзейснены перавод хворай адразу пасля аперацыі з аддзялення рэанімацыі ў аддзяленне траўматалогіі?

2) ці было назначана своечасовае і дастатковае лячэнне ў пасляаперацыйны перыяд у сувязі з наяўнасцю страты крыві ў працэсе аперацыі і наяўнасцю шэрагу спадарожных захворванняў?

3) як ва ўмовах стацыянара Брэсцкай абласной бальніцы мог развіцца абшырны інфаркт? Чаму на працягу даволі працяглага перыяду часу пасля з'яўлення тыповых прыкмет стэнакардыі і пры наяўнасці скаргаў ва ўмовах медыцынскага стацыянара ніхто з медыцынскага персаналу не толькі не аказаў дапамогі, але і не падышоў, каб правесці агляд і ацаніць стан хворай?

4) ці былі своечасова прыняты правільныя і дастатковыя дзеянні для прадухілення развіцця абшырнага інфаркту, а затым наступлення смерці?

5) ці праводзіўся поўны аб'ём дыягнастычных абследаванняў і лячэння пасля спынення сэрца ва ўмовах рэанімацыі?

Да якіх пор чалавечыя жыцці будуць знаходзіцца ў руках халатных, абыякавых, раўнадушных людзей у «белых халатах», якія ствараюць адмоўны вобраз ўсёй медыцыны?

Вельмі прашу Вас прызначыць праверку і даць аб'ектыўную ацэнку дзеянням медыцынскага персаналу...Спадзяюся, што гэта дазволіць не толькі прыцягнуць да адказнасці асобаў, якія не аказалі своечасовую дапамогу маёй маме, але і павысіць узровень адказнасці медыцынскага персаналу і захаваць жыцці грамадзян».

Наведаць Брэсцкую абласную бальніцу я мог толькі з дазволу яго галоўнага ўрача Аляксандра Карпіцкага, і толькі ён мог паспрыяць таму, каб журналіст, як прадстаўнік чацвёртай улады, змог сустрэцца з многімі медыцынскімі работнікамі, што фігуравалі ў пісьмах, і пагутарыць па душах. Аляксандр Сяргеевіч не стаў рабіць перашкод майму візіту ў вядучую медыцынскую ўстанову Брэстчыны. Выпісваючы ў рэдакцыі камандзіроўку, я меркаваў, што ў дадзеным выпадку магу выступіць толькі працейскім суддзёй. У любым выпадку пацярпелы бок будзе настойваць на непрафесіяналізме ўрачоў, а тыя ў сваю чаргу — на непахіснасці клятвы Гіпакрата. Іншымі словамі — на высокім прафесійным падыходзе пры лячэнні любога пацыента.

Мая інтуіцыя (за час сваёй журналісцкай дзейнасці даводзілася неаднойчы сутыкацца з падобнымі сітуацыямі ў розных сферах), аказалася правільнай, а прынцып «у кожнага свая праўда» — непахісным.

Аляксандр КАРПІЦКІ, галоўны ўрач Брэсцкай абласной бальніцы, прафесар: «МЫ НЕ БОГІ, АЛЕ ЗРАБІЛІ ЎСЁ, ШТО ЗМАГЛІ»

Кіраўнік гэтай медустановы Брэстчыны, разлічанай на 940 месца-ложкаў і 23 лячэбныя аддзяленні, лічыць прэтэнзіі пацярпелага боку неабгрунтаванымі, бо медыкі, паводле яго слоў, зрабілі ў дадзенай сітуацыі ўсё, што змаглі. З РАЗМОВЫ. «Мы не богі. Любая аперацыя, нават апендыцыт, нясе ў сабе рызыку лятальнага зыходу. Так здарылася, што ў гэтай жанчыны развіўся інфаркт. Праўда, інфаркт не гаворыць аб тым, што ў пасляаперацыйны перыяд чалавек быў недагледжаны, недаабследаваны, недалечаны. Мы лячылі хворую так, як запісана ў пратаколах і стандартах. Камісія, якая прыязджала сюды, гэта зразумела.

Я разумею родных: мама — гэта святое. І рэакцыя іх мне зразумелая. Праўда, яна павінна быць да разумнай ступені. У 74 гады чалавеку праведзена вельмі складаная аперацыя. Акрамя пералому шыйкі сцягна, у яе было шмат спадарожных захворванняў...»

Сяргей КІСЕЛЬ, загадчык аддзялення траўматалогіі і артапедыі: «ДЛЯ МЯНЕ ЛЮБАЯ СМЕРЦЬ ПАЦЫЕНТА — ГЭТА ЎКОЛ У СЭРЦА»

Сяргей Сямёнавіч — гэта той доктар, які праводзіў аперацыю. Паводле яго слоў, і да аперацыі, і пасля яе, за хворай быў наладжаны адпаведны догляд і назначаны неабходны курс лячэння, і ён асабіста ставіў яе на ногі пасля аперацыі.

З РАЗМОВЫ. «За год мы праводзім звыш 200 эндапратэзаванняў, прычым людзям самых розных узростаў. За год здараецца прыкладна дзве смерці. Але яны, як правіла, ад трамбаэмбаліі (закупоркі сасудаў тромбамі. — **Аўт.**). Пры гэтым хворым уводзіцца адпаведны прэпарат для разжыжэння крыві. Тым не менш людзі ўсё роўна паміраюць. Значыць, нешта ёсць, што вышэй за нашы магчымасці.

У гэтай пацыенткі інфаркт развіўся за дзве гадзіны. На плёнцы, якая была зроблена дзяжурным урачом, — толькі пачатковыя прыкметы інфаркту. За гэтыя дзве гадзіны хворая была пераведзена ў рэанімацыю, дзе памерла. Жанчыну рэаніматолагі паспяхова «завялі», і мы яшчэ два дні змагаліся за яе жыццё... Але пацыентка ўсё роўна памерла. Камісія Мінздрава з Інстытута траўматалогіі і артапедыі вінаватых у смерці жанчыны не выявіла...

Пры анатаміраванні ў яе не было сэрца: скразны некроз — абшырны інфаркт, г.зн. мышцы сэрца не было.

Для мяне смерць пацыента — гэта не дзяжурная падзея, а ўдар па арганізме. Яна памерла, а мне праз гадзіну зноў ісці на аперацыю. Што з маім сэрцам у гэты час робіцца — хто-небудзь пралічваў?»

Леанід НАВАСАД, траўматолаг: «Я РАЗУМЕЮ ПАЧУЦЦІ РОДНЫХ»

З РАЗМОВЫ. «Я да гэтай хворай меў дачыненне толькі на дзяжурстве. У дзень аперацыі. Разумею пачуцці родных і блізкіх. І тое, што яны імкнуцца знайсці недахопы ў лячэнні маці — гэта таксама зразумела, бо смерць — гэта заўсёды трагедыя. Між тым трэба рэальна ацэньваць сітуацыю. Гэта быў пажылы чалавек са спадарожнай паталогіяй. Урачы зрабілі вымушаную аперацыю, каб чалавека паставіць на ногі, зрабіць яго незалежным. Аперацыю яна перанесла нармальна, аднак потым пачалося ўскладненне. На жаль, звычайны медыцынскі выпадак.

Лёс такі ў дактароў — быць у адказе за кожнае жыццё. Прыдзецца перажыць гэтую смерць і працаваць далей. Наша прафесія такая — рызыкаваць. У разумных межах, вядома ж».

Леанід ШАМОЎСКІ, урач траўматолаг-артапед: «ЧАЛАВЕК НІ АД ЧАГО НЕ ЗАСТРАХАВАНЫ»

Урач Леанід Шамоўскі сказаў, што ён быў асістэнтам на аперацыі гэтай жанчыны і ведаў, што яе здароўем цікавяцца з даволі высокіх інстанцый. Нават з гэтага пункту гледжання было зразумела, што хворай патрэбен самы дасканалы догляд.

З РАЗМОВЫ. «Я яе лячыў, калі яна ляжала ў палаце. Хворая скардзілася, як правіла, родным ці сыну, якія падтрымлівалі са мной сувязь, як правіла, праз адміністрацыю. У той дзень я дзяжурыў, калі ў яе пачаўся першы прыступ. Гэта было 24-га чысла. Акрамя яе, у палаце было яшчэ двое маіх хворых — пасляаперацыйных. Ніякіх скаргаў мне яна не прад'яўляла. Аб пагаршэнні стану пацыенткі мне сказала медсястра, атрымаўшы адпаведны сігнал ад сваячкі хворай. Мы выклікалі дзяжурнага тэрапеўта, узялі аналіз крыві, які аказаўся добрым. Кардыяграма таксама была ў норме. Тэрапеўт распісаў хворай кропельніцу... Хворая не была кінутая. Яна расказвала мне многа аб сваіх праблемах.

Аналізы і кардыяграма хворай былі на кантролі ў загадчыка аддзялення і ўрача, які лечыць. Напрыклад, у пасляаперацыйны перыяд жанчыне прапаноўвалі пераліванне крыві, ад якога сваякі катэгарычна адмовіліся.

Тым не менш хворая атрымлівала тое лячэнне, якое ёй было неабходна. Ёсць пратакол лячэння. Зразумела, гэта не догма. Але прытрымлівацца яго мы абавязаны.

Бываюць выпадкі, калі смерць нельга растлумачыць. Чалавек ні ад чаго не застрахаваны. Відавочна, што так вырашылі наверсе. Я лічу, што медперсанал рабіў сваю работу кваліфікавана».

Валерый ШУГАЙ, старэйшы сын, загадчык 3-га гінекалагічнага аддзялення Брэсцкага абласнога раддома: «СВАЁЙ МАМЕ МЫ НАРАКЛІ ЖЫЦЬ ЯШЧЭ 20 ГАДОЎ»

Старэйшы сын упэўнены, што на нейкім этапе медыкі абласной бальніцы выпусцілі сітуацыю з-пад кантролю, з-за чаго ў маці пачаліся сімптомы інфаркту, а праз некалькі гадзін і здарыўся інфаркт. Як медык, ён выказаў сумненні, што многія лячэбныя маніпуляцыі пры лячэнні пацыенткі рабіліся са спазненнем ці па патрабаванні сваякоў.

З РАЗМОВЫ. «Яшчэ да аперацыі нам прапанавалі ўстанавіць маці беларускі пратэз, але мы не згадзіліся, бо яго трэба было мяняць праз 10 гадоў. Мы сказалі, што мама пражыве яшчэ 20 гадоў.

У апошні час у мамы было нармальна з сэрцам — яна прымала нармальныя таблеткі. У яе стабілізаваўся ціск. Калі штосьці і з'яўлялася, я дапамагаў ёй прыходзіць у норму. Мама была дастаткова моцным чалавекам. Я распадзяваўся на сваіх калег. А мне раптам тэлефонны званок ад хворых з палаты: «Валерый Паўлавіч, прыязджайце, кажуць, ёй дрэнна». Перш чым паехаць, я пачаў усім тэлефанаваць. Дазваніўся НАВАСАДУ Л.І. Папрасіў паглядзець маму, на што мне быў дадзены катэгарычны адказ: ваша мама — прыходзьце да яе і сядзіце. У 20.30 я са сваёй сястрой Светай прыехалі ў ардынатарскую. Далей я папрасіў танометр і памераў ціск. Ён быў 90х50. Для чалавека-гіпертоніка — гэта прамы шлях да інфаркту.

Пасля паўторнага змяшчэння ў рэанімацыю яна, не прыходзячы ў свядомасць, памерла. У

Рассакрэчаны архіў

ЖЫЦЦЁ АБО... ВЫКУП?

Гэта справа, магчыма, не настолькі гістарычная, архіўная, якімі былі папярэднія, размешчаныя ў дадзенай рубрыцы, паколькі размова будзе ісці аб досыць свежых падзеях 2004 года. Тым не менш, і гэта ўжо — гісторыя. Прычым гісторыя падзей, якімі Упраўленню Камітэта дзяржаўнай бяспекі па Мінску і Мінскай вобласці давялося займацца ўпершыню.

Дзёрзкія, нахабныя, здрадніцкія дзеянні зламыснікаў па выкраданні чалавека і запатрабаванні выкупу абыграны ў незлічонай колькасці замежных кінастужак. Аднак, на жаль, дзеянні гэтыя не абмяжоўваюцца віртуальнай рэчаіснасцю. У рэальным жыцці таксама знаходзіцца месца дзёрзкасці, нахабству і здрадзе. На шчасце, падобныя крымінальныя ўчынкі не застаюцца без адпаведнага пакарання.

У адзін з восеньскіх дзён 2004 года позняй ноччу на аўтамабільнай стаянцы, размешчанай каля спартыўна-аздараўленчага комплексу «Алімпійскі», двое мужчын напалі на намесніка генеральнага дырэктара аднаго са сталічных прадпрыемстваў. Пацярпелага аглушылі, пагрузілі ў машыну і вывезлі, як кажуць, у невядомым накірунку. Калі прадпрымальнік расплюшчыў вочы, то ўбачыў мабільны тэлефон, якім падсвечвалі яго твар і пачуў пытанне: «Колькі за цябе заплацяць?» Ён назваў нейкую нязначную суму... Аднак у выкрадальнікаў былі зусім іншыя разлікі.

Фота Артура СТРЭХА.

У момант затрымання аднаго са злачынцаў.

Зямлянка, у якой утрымлівалі закладніка.

Гэтай гісторыі магло б і не быць. Калі б дружба заўсёды была трывалай, а сябры — сумленнымі. У гэтым сэнсе пацярпеламу можна паспачуваць, паколькі ягоны сябар і «растрапаў» сваім знаёмым аб тым, як і чым жыве сям'я камерсанта. Прадпрыемства, якім той кіраваў і дзе працаваў у якасці менеджара яго бацька, сапраўды, паспяхова развівалася.

Па мабільніку «ахвяры» злачынцы пазванілі ягонаму бацьку і запатрабавалі ў якасці выкупу 40 тысяч долараў. Прыгразілі: маўляў, заявіш у міліцыю — сына жывым не пабачыш. Бацька сабраў долары і паехаў на сустрэчу. Самі зламыснікі на яе не з'явіліся. Проста перастрахаваліся. Аднак за бацькам, безумоўна, сачылі, бо як толькі той прыбыў на азначанае месца — станцыю метро «Магілёўская», яму пазванілі з мабільнага сына і загадалі пакінуць выкуп у баку для смецця на 379-м кіламетры шашы Брэст — Масква. Зямлянка, у якой утрымлівалі выкрадзенага камерсанта, была зусім непадалёк ад гэтага месца.

Як толькі выкрадальнікі атрымалі 40 тысяч долараў, яны выкінулі збітага, галоднага, змерзлага закладніка на абочыну шашы, дзе яго і падабраў бацька. Праз некалькі дзён усё ж такі вырашылі не пакідаць злачынцаў без пакарання, нават калі не ўдасца вярнуць велізарныя грошы...

Так сын з бацькам звярнуліся непасрэдна ва Упраўленне Камітэта дзяржаўнай бяспекі па Мінску і Мінскай вобласці.

— Адшукаць асобаў, якія ўчынілі выкраданне закладніка і ўжо атрымалі выкуп, было вельмі цяжка, — расказвае кіраўнік прэс-службы Упраўлення КДБ па Мінску і Мінскай вобласці Ігар КАВАЛЕЎСКІ. — Не было ніякіх доказаў, ніякага фактычнага матэрыялу. Пацярпелы не бачыў тварaў зладзеяў, не заўважыў ніякіх асаблівых прыкмет, не ведаў ні імёнаў, ні мянушак... Як паказвае сусветная практыка, справы па выкраданні людзей і вяртанні за выкуп раскрываюцца вельмі складана. Дарэчы, акурат напярэдадні гэтых падзей ахвярамі міжнародных тэрарыстаў сталі заможныя грамадзяне Францыі і Злучаных Штатаў. Закладнікаў тады ўдалося вызваліць, а вось затрымаць арганізатараў злачынства спецслужбы не здолелі... Мінскія «чэкісты» выйшлі на след выкрадальнікаў дзякуючы складаным аператыўнай рабоце...

Як толькі злачынцы — двое студэнтаў і адзін непрацуючы — атрымалі «шалёныя» грошы, тут жа «падзялілі» і пачалі траціць з неверагоднай хуткасцю. Непрацуючы, напрыклад, з'ехаў «развезяцца» ў Маскву, дзе шырока пагуляў у падпольных публічных дамах і казіно. Другі набыў мэблю, хатні кінатэатр, зрабіў дарагія падарункі сваякам, якія нават не пацікавіліся, адкуль у студэнта з'явіліся зберажэнні...

На момант вобыску ў падазроных удалося адабраць 25 тысяч долараў, якія і вярнуліся да пацярпелых. Беспрацоўнаму ў выніку «далі» 11 гадоў зняволення, аднаму студэнту 10,7 года, другому — 10 гадоў.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Прамая лінія

БЕЗ ПРЫШЧЭПАК — АНІЯК!

На пытанні чытачоў адказвае загадчыца кафедры дзіцячых інфекцыйных хваробаў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук Іна ГЕРМАНЕНКА

(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 7 і 8 кастрычніка.)

☎ — Непакоіць вас Раіса Андрэеўна з Магілёва. Некалькі гадоў таму Усход напалохаў нас атыповай пнеўманіяй... Скажыце, ці можна захварэць на яе ў Беларусі або ўдалося цалкам перамагчы гэта захворванне?

— Так, у 2002—2003 гадах свет быў уражаны цяжкім вострым рэспіраторным сіндромам — SARS, атыповай пнеўманіяй. Тады не адразу змаглі распазнаць прыроду гэтай хваробы, але хворых ізаляавалі, і на тэрыторыю нашай краіны атыповая пнеўманія не трапіла... Аказалася, што гэта быў каронавірус — мутант, адкрыў які Карлас Урбані, вядомы вірусолаг, які, на жаль, і загінуў менавіта ад гэтага мутанта. Справа ў тым, што ў хворых досыць імкліва развівалася сур'ёзная лёгачная недастатковасць, потым ацёк лёгкіх, і — гібель. Калі вірус распазналі, то аказалася, што гібель людзей можна было прадухіліць. З дапамогай ужо вядомага прэпарата, які не дазваляе вірусу счапіцца з клеткай і выкарыстоўваецца для лячэння звычайнага грыпу. Гаворка ідзе пра азэльтамівір, або таміфлю, нацыянальны запас якога ёсць і ў нашай краіне. Вынаходніцтва дазволіла спыніць ланцужок перадачы высока заразнага віруса.

— Наколькі эфектыўным сродкам супраць вірусных хвароб можна лічыць выкарыстанне такіх мазяў для носа, як аксалінавая?

— Насавыя хады сапраўды вельмі добра штодня, перад выхадам на вуліцу, змазваць маззю, і не абавязкова толькі аксалінавай. Можна прымяняць і бораментол, і эваментол. Аднак варта мець на ўвазе, што гэта не стопрацэнтная абарона супраць вірусаў грыпу, паколькі мы ўсё ж такі размаўляем... Эфектыўнасць прафілактыкі павышаецца з прымяненнем марлевай павязкі, якую, праўда, не зусім зручна насіць на звычайным працоўным месцы і якую трэба мяняць кожныя 2-3 гадзіны.

☎ — На провадзе Гомель. Вас турбуе Галіна Пятроўна, маці дваіх дзяцей школьнага ўзросту. Я чула, што лепшым сродкам для зніжэння тэмпературы ў дзяцей з'яўляецца парацэтамол. Не маглі б вы патлумачыць, наколькі бяспечны гэты прэпарат і як увогуле правільна зніжаць тэмпературу?

— Парацэтамол, або ацэтамінафен, уваходзіць у самыя розныя прэпараты для зніжэння тэмпературы ў дзяцей і дарослых. Парацэтамол дае найменшую колькасць пабочных эфектаў...

— А ў чым праяўляецца шкоднасць аспірыну?

— Ва ўсім свеце аспірын не прымяняецца для зніжэння тэмпературы ў дзяцей да 16 гадоў. У нас таксама не рэкамендуецца яго выкарыстанне для лячэння дзяцей да 12 гадоў з прыкметамі віруснай інфекцыі. Пры выкарыстанні аспірыну падчас грыпу і ветраной воспы быў апісаны сіндром Рэе, які праяўляецца наступным чынам. Спачатку дзіця становіцца санлівым, потым у яго з'яўляецца расстройства свядомасці, могуць быць сутаргі, боль у жываце, нарэшце, сопар і кома. Плюс падчас ультрагукавога даследавання ў такіх выпадках на печані можна ўбачыць нейкія тлушчавыя ўключэнні. У аснове такога становішча ляжыць мітахандрыяльная недастатковасць — спецыфічная асаблівасць арганізма, якая звычайна ніяк не праяўляецца. Каб пазбегнуць нечаканых непрыемнасцяў, Сусветная арганізацыя аховы здароўя рэкамендуе прымяняць для зніжэння тэмпературы ў дзяцей ацэтамінафен або ібупрафен.

— Ці можна для зніжэння тэмпературы выкарыстоўваць абгортванні халоднай вадой?

— Высокая тэмпература небяспечная перш за ўсё для цэнтра тэрмарэгуляцыі — прадаўгаватага мозгу, іншымі словамі, для галавы. Таму мэтазгодна прыкладаць холад да галавы. Калі ж мы пачынаем абціраць, абгортваць халоднай вадой усё цела, то, з аднаго боку, мы сапраўды ўзмацняем цеплааддачу, а з другога — сасуды рэагуюць на гэта спазмам. Таму ў адказ разаўецца белая ліхаманка — спазм на перыферыі, парушэнні мікрацыркуляцыі і цэнтралізацыі кровазвароту. На сёння такі метад шырока не выкарыстоўваецца, паколькі можа істотна пагоршыць стан хворага.

☎ — Капыльскі раён. Завуць мяне Зінаіда Уладзіміраўна. Маймуну унуку — паўтара годзіка. Не так даўно мы сутыкнуліся з такой непрыемнасцю, як ацёк. Ён узнік у адказ на прыём нейкага прэпарата. Прычым устанавіць, на які менавіта, пакуль не ўдалося. Ацёк адразу знялі, паколькі маці з унукам знаходзіліся ў бальніцы... Мяне цікавіць, што рабіць у хатніх умовах, калі на фоне ўжывання прэпаратаў з'яўляецца ацёк?

— Ацёк — праява алергіі. А з дзецьмі-алергікамі трэба быць заўсёды ўважлівымі. Калі ўзнік ацёк, я раю тэрмінова выклікаць «хуткую», каб увесці супрацьалергічныя прэпараты або кортыкастэроіды, якія знімуць гэта праяўленне алергічнага стану. Безумоўна, лепш за ўсё ведаць, на які прэпарат была рэакцыя, і далей не выкарыстоўваць яго для лячэння.

— А калі ўжывалі адразу некалькі, і не вядома, ад чаго ўзнікла рэакцыя?

— Тады прэпарат можна прымяняць «пад прыкрыццём» лекаў, што зніжаюць рызыку ўзнікнення алергіі. Або выкарыстоўваць іншы, на які алергіі не было. Варта яшчэ мець на ўвазе, што алергічная рэакцыя бывае не на сам прэпарат, а на форму яго выпуску. Напрыклад, той жа амаксіцылін ёсць у суспензіі, а ёсць у таблетках. Лепей аддаць перавагу таблеткам.

☎ — Таццяна з Лепеля турбуе. Калісьці маці змагалася з маім кашлем з дапамогай растопленага цукру. Маймуну дзіцяці — пяць гадоў. Цяпер, дзякуй богу, мы не кашляем, але я хачу ў вас на ўсякі выпадак паціквіцца, як наогул правільна змагацца з «бухіканнем»?

— Можна і такім чынам, як гэта рабіла ваша маці, а можна і з дапамогай травяных зборaў. Галоўнае — дабіцца рассмоктвання сакрэту. Варта мець на ўвазе, што на пачатку захворвання кашаль — абарончы рэфлекс. Ён абараняе дыхальныя шляхі ад чагосьці, што туды паступае. А паступае, часцей за ўсё, слізісты сакрэт, што трапляе з насавых хадоў. Так што з кашлем часам не трэба змагацца. Лепей параіцца з урачом, паколькі некатрычныя змяненні ў рэчыве мозгу. Змагацца з гэтай інфекцыяй можна, але своечасова. Пры спозненым звароце наступствы бываюць непапраўнымі. У выніку герпетычнага энцэфаліту можа сфарміравацца нават эпілепсія.

Дарэчы, у перыяд распаўсюджвання грыпу трэба памятаць і аб тым, што не спяць і мікробы, якія самі па сабе могуць выклікаць лакалізаваныя праявы інфекцыі — паражэнні носа і задняй сценкі глоткі, а таксама выклікаць паражэнні цэнтральнай нервовай сістэмы мозгу і мазгавых абалонак — менінгаэнцэфаліт, які праяўляецца млоснасцю, галаўным болем, санлівасцю, сутаргамі, сыпам і высокай тэмпературай. У такім стане нельга заставацца дома. Дзіця абавязкова неабходна агледзець. Менінгакакцэмія лакалізуецца ў выглядзе сыпу па задняй паверхні тулава, на ніжніх канечнасцях. Узбуджальнік захворвання — менінгакок, які можа пранікаць у кроў, выклікаць генералізаваную менінгакокавую інфекцыю. З пахаладнаннем мы заўсёды назіраем уздым менінгакокавай інфекцыі, узбуджальнік якой, дарэчы, адчувальны да звычайнага пеніцыліну. Так што пры своечасовым звароце хвораму можна дапамагчы.

☎ — Брэсцкая вобласць, Вольга. Майму брату калісьці рабілі пракол па прычыне гаймарыту. Чула, што цяпер для пазбаўлення ад такой непрыемнасці дастакова толькі ўжывання антыбіётыкаў. Як цяпер лечаць гаймарыты? Ці можна прымяняць дзецям сасудазвужальныя прэпараты?

— Гаймарыт утвараецца на фоне запушчанага сінуситу, які ўтвараецца ў адказ на дзеянні віруса, які трапіў у носавыя пазухі, у выніку чаго парушыўся кровазварот, запаволілася дыханне, утварыўся сакрэт, які не можа выцякаць з-за ацёку. Наша задача — прамываць носавыя пазухі, выслабаняць іх ад вадкага сакрэту, тады ўсё будзе добра. Калі ж сакрэт вязкі, гнойны, утвараецца застой, які і называецца гаймарытам. Дарэчы, дапамога лор-урачоў сёння цалкам даступная. У 3-й клінічнай бальніцы г. Мінска і ва ўсіх абласных бальніцах есць аддзяленні, дзе лор-дапамога аказваецца кругласутачна. Займацца самалячэннем у выпадку з гаймарытам не выпадае. У свеце сапраўды ідуць па шляху прымянення кансерватыўных метадаў. Да гэтага імкнёмся і мы, але важна, наколькі запушчаным быў працэс. Наша задача — вымываць сакрэт. На пачатку — фізіялагічнымі растворамі, якія прадаюцца ў любой аптэцы. Ёсць мясцовыя антыбактэрыяльныя прэпараты — фраміцыцін, або ізофра, біяпарокс, палідэкс. Схема лячэння гаймарыту наступная: прамываныя носа, сасудазвужальныя кроплі, прымяненне такога прэпарата, як лінафліміцыл, які рассмоктвае сакрэт. У цяжкіх выпадках без механічнага выдалення сакрэту не абысціся.

Што датычыцца сасудазвужальных кропляў, то лепш за ўсё параіцца з урачом. Трэба абавязкова чытаць інструкцыю, і мець на ўвазе, што чым меншы ўзрост дзіцяці, тым меншай павінна быць канцэнтрацыя. Нельга кроплі «для дарослых» выкарыстоўваць дзецям. Лепей прымяняць такія прэпараты, якія не ўтрымліваюць алеяў, таму што апошнія толькі ўзмацняюць ацёк. Пачынаць можна з нафазаліну, пасля — ксіларметазалін, і нарэшце — оксіметазалін. Апошні выкарыстоўваецца ва ўсім свеце для дзяцей пасля 6 гадоў.

☎ — Наталля Аляксандраўна з Мінска. У якасці прафілактыкі я выкарыстоўваю інтэрферон, і раю маёй сястры даваць прэпарат пляменніку. Раскажыце, калі ласка, якім чынам трэба прымяняць інтэрферон для дзяцей?

— Інтэрферон лейкацытарны выкарыстоўваецца энданазальна, і для прафілактыкі яго можна выкарыстоўваць і дзецям, і дарослым. На працягу месяца — па 3-5 кропель у кожны насавы ход 3-4 разы на дзень. Дзецям можна раніцай і вечарам, пасля ачышчэння носавых пазух. На працягу 2-3 тыдняў. З лячэбнай мэтай — і дзецям, і дарослым па 5 кропель у кожны насавы ход кожныя 2 гадзіны на працягу сутак. Потым ужыванне прэпарата лічыцца немэтазгодным.

— Многія матулі скардзяцца, што ў садках дзеці часта хварэюць. А, на вашу думку, ці сапраўды можна абараніць дзіця ад хваробаў, калі не пускаць яго ў садок?

— Насамрэч, верагоднасць таго, што ў старэйшым узросце дзіця будзе лягчэй пераносіць захворванні, невялікая. У любым выпадку пакуль не выпрацуецца натуральны імунітэт, тых жа прастуд не пазбегнуць.

— Ужо варта ўжываць вітамінныя комплексы?

— Вітамінапрафілактыку можна пачынаць праводзіць у лістападзе. Пакуль жа трэба карыстацца момантам і актыўна атрымліваць вітаміны жывыя — фрукты, агародніну. Штучныя вітаміны спатрэбяцца нам тады, калі мы расходуем запасы натуральных вітамінаў і калі іх будзе вельмі мала ў той жа гародніне. Вось тады, каб прадухіліць гіпавітаміноз, можна піць вітамінна-мінеральныя комплексы. Трэба быць асцярожнымі з вітамінамі ў сіропе, паколькі на гэту форму бываюць алергіі. Лічыцца, што вітамінная прафілактыка павінна быць нерэгулярнай, бессістэмнай, гэта значыць, не варта глытаць таблетку штодня, можна праз дзень-два. Вітаміны ўтылізуюцца ферментамі, і калі мы месяц іх пілі, а пасля кінулі, то атрымліваецца адваротны вынік, паколькі арганізм працягвае выпрацоўку ферментаў. Не варта забывацца і на натуральныя свежаадціснутыя сокі. Гіпаалергенным лічыцца грэйпфрутавы.

☎ — Аліна, Крупкі. Урач сказала, што да таго як плануваць нараджэнне дзіцяці варта зрабіць прышчэпку ад краснухі. Але ж, наколькі я разумею, нам усім у дзяцінстве рабілі прышчэпкі ад шэрагу інфекцый, у тым ліку і ад гэтай...

— Сучасныя дзеці па-ранейшаму прышчэпліваюцца ад адру, паратыту, краснухі. Дарэчы, што датычыцца адру, то ў Еўропе ўжо меркавалі, што перамаглі гэту інфекцыю, аднак там не ўлічылі сітуацыю ў такіх краінах, напрыклад, як Румынія, дзе нялёгка было правесці масавую вакцынацыю насельніцтва, паколькі частка яго з'яўляецца цыганскім і шмат вандруе, жыве па ўласных законах. Адкрыццё межаў спрыяла масіўнай міграцыі насельніцтва, а вядома, што для інфекцый межаў не існуе ў прынцыпе. Гэта сітуацыя перыядычна выклікае ўспышкі тых ці іншых інфекцый у свеце, у тым ліку і адру ў развітых краінах.

Вакцынацыя забяспечвае нам імунітэт толькі на 5-10 гадоў. Так што дарослым патрэбна рэвакцынацыя. Аднак паколькі гэтага не адбываецца, значыць, дарослае насельніцтва мае рызыку завезці вышэйзгаданыя інфекцыі з іншых краін...

Прышчэпліваецца ў нас і такая інфекцыя, як коклюш. Ад воспы цяпер прышчэпліваюцца толькі пацыенты групы рызыкі, дзеці з пэўнымі захворваннямі. Няма вакцыны толькі ад шкарлятыны, хоць яна таксама небяспечная сваімі ўскладненнямі. Такім чынам, рабіць прышчэпку ад той ці іншай інфекцыі — ваша права. Вы толькі павінны мець на ўвазе, наколькі небяспечная тая ж краснуха для плода.

«Прамую лінію» правялі Святлана БАРЫСЕНКА і Вольга ШАЎКО.

ГАЛОДНЫХ У СВЕЦЕ СТАНОВІЦЦА ЎСЁ БОЛЬШ

На 75 мільёнаў чалавек узрасла сёлета лічба галадаючых у свеце. Яны апынуліся па-за рысай, за якой пачынаецца голад. Прычына — рэзкі скачок цэнаў на прадукты харчавання.

Згодна з ацэнкамі Сусветнай харчовай арганізацыі (ФАО), агульная колькасць людзей, якія пастаянна пакутуюць ад недахопу ежы, летась склала 923 мільёны. Увогуле дынаміка гэтага працэсу выклікае заклапочанасць. Так, у 2003—2005 гадах хранічна галадаючых у свеце было 848 мільёнаў чалавек, ці на 6 мільёнаў больш, чым у 1990—1992 гадах. Тады іх налічвалася 842 мільёны. Але на працягу 2007—2008 гадоў рост сусветных цэнаў на прадукты харчавання склаў 52 працэнты, на ўгнаенні яны нават падвоіліся, таксама істотна падаражэла паліва. У выніку самая простая ежа стала яшчэ больш цяжкадасягальнай для бедных слаёў насельніцтва ў розных краінах. І гэта, як ні парадаксальна, адбываецца на фоне агульнага росту багацця ў свеце. Сёння выпускаецца прадуктаў харчавання больш, чым калі-небудзь на працягу апошняга дзесяцігоддзя. Тым не менш усё больш людзей трапляюць у пастку беднасці. ФАО выступіла з ініцыятывай рэалізацыі шэрагу надзвычайных праектаў, сярод якіх нават раздача бедным сем'ям у вёсках насення, угнаенняў, дробных інструментаў, кармоў для жывёлы.

Леанід ТУГАРЫН.

ОАО «КРАСНЫЙ ОКТЯБРЬ»
ИЗВЕЩАЕТ АКЦИОНЕРОВ

о проведении 22 октября 2008 года в 12.00 внеочередного общего собрания по адресу: г. Витебск, проспект ген. Людникова, 10.

Повестка дня:

1. Об условиях выделения средств из инновационного фонда концерна «Беллегпром» в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 25 августа 2006 г. № 528.

2. Избрание членов наблюдательного совета ОАО «Красный Октябрь».

С материалами по вопросам повестки дня акционеры могут ознакомиться в читальном зале библиотеки с 16 октября 2008 года, в рабочие дни с 11.00 до 16.00.

Регистрация участников собрания будет производиться с 10.00 до 11.45 на основании документа, удостоверяющего личность (представитель акционера должен иметь доверенность).

Дата составления списка акционеров для регистрации участников собрания — 13 октября 2008 года.

Справки по тел: (8-0212) 24 77 19

Дирекция ОАО «Красный Октябрь»

УНН 300003144

БЕЛАРУСКАЯ СЛАВІСТЫКА — «НА ПЯЦЬ»!

Дасягненні нашых вучоных у гэтай галіне гуманітарных ведаў атрымліваюць сусветнае прызнанне

У Македоніі прайшоў чарговы XIV Міжнародны з'езд славістаў. Вопытам сваіх даследаванняў абменьвалася больш як 700 вучоных з 40 краін свету. У гэтым найбуйнейшым навуковым форуме ўзялі ўдзел і айчынныя спецыялісты. Наша прадстаўніцтва там было вельмі плённым. У наступны раз — праз пяць гадоў — вучоных-славістаў з усяго свету прыме Беларусь, а Міжнародны камітэт славістаў цяпер узначальвае наш суайчыннік — дырэктар Інстытута мовы і літаратуры імя Янкі Купалы і Якуба Коласа Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ. Да яго мы і звярнуліся па ўсе падрабязнасці:

— Праграма Міжнародных з'ездаў славістаў ахоплівае шырокае кола праблем, звязаных з вывучэннем і даследаваннем славянскіх моў, літаратур, культур, фальклору. Такія навуковыя форумы рэгулярна праводзяцца з 1929 года — кожныя пяць гадоў па чарзе ў розных славянскіх краінах. Нашы суседкі — Расія, Украіна, Польшча — ужо прымалі гасцей у сябе. У нас жа такіх з'ездаў яшчэ не было...

Першы з'езд карыфеяў славістыкі прайшоў у Празе. І ўжо тады не без удзелу беларускіх вучоных. Нашу краіну прадстаўляў прафесар Пётр Бузук. Правядзенне з'ездаў фактычна мае бесперапынную традыцыю. Праўда, адзін са з'ездаў, які павінен быў адбыцца ў Бялградзе ў 1939 годзе, быў адменены ў сувязі з пачаткам Другой сусветнай вайны. Аднак пасля яе прайшла навуковая канферэнцыя, і быў выдадзены зборнік дакладаў трэцяга з'езда, таму лічыцца, што ён усё ж адбыўся...

— На такіх форумах заўжды разглядаюцца дасягненні славістычнай навукі ў свеце за папярэдні пяцігадовы перыяд, — расказвае Аляксандр Лукашанец. — І ў рабоце з'ездаў прымаюць актыўны ўдзел не толькі прадстаўнікі гуманітарнай навукі са славянскіх краін. Славістыка актыўна развіваецца ў розных навуковых цэнтрах краін Еўропы ды і ўсяго свету. Так, напрыклад, у з'ездах славістаў актыўна ўдзельнічаюць вучоныя з Германіі, ЗША, Канады, Францыі, Італіі і інш., у апошнія гады — з Індыі, Японіі. Таму важнасць гэтых мерапрыемстваў не толькі ў тым, што яны садзейнічаюць даследаванню славянскіх моў, літаратур, культур, але і спрыяюць пашырэнню ведаў пра іх у свеце, вывучэнню і ў неславянскіх краінах.

З дасягненнямі айчыннай славістычнай навукі знаёмілі сёлета міжнароднае супольніцтва 20 беларускіх вучоных. Вынікамі сваіх даследаванняў па шырокім коле славістычных праблем дзяліліся даследчыкі ў галіне славістыкі з Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (супрацоўнікі Інстытута мовы і літаратуры, а таксама Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору) і вядучых універсітэтаў краіны (выкладчыкі БДУ, БНТУ, універсітэта культуры, лінгвістычнага ўніверсітэта, а таксама Гомельскага і Гродзенскага дзяржаўных універсітэтаў).

— На жаль, Беларусь не была прадстаўлена ў такім важным праблемным блоку, як славянская анамастыка, — выказвае сваё шкадаванне навукоўца, — таму што кіраўніцтва Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта не палічыла патрэбным камандзіраваць на XIV з'езд загадчыка кафедры агульнага і рускага моўнаўства — прафесара Ганну Мезенку. А яна, між іншым, — найбуйнейшы спецыяліст па гэтай праблематыцы Беларусі. Дарэчы, яе кандыдатура рэкамендавана для ўключэння ў склад камісіі па славянскай анамастыцы, якая працуе пры Міжнародным камітэце славістаў. А гэта сведчыць аб прызнанні ўзроўню беларускай анамастычнай навукі ў славянскім свеце.

Наступныя пяць гадоў Беларусь старшынствуе ў Міжнародным камітэце славістаў.

Даклады ж тых беларускіх навукоўцаў, якія змаглі паўдзельнічаць у з'ездзе, атрымалі шырокі станоўчы рэзананс. Вучоныя ўдзячныя кіраўніцтву Нацыянальнай акадэміі навук і Міністэрства адукацыі, якія аказалі фінансавую падтрымку для ўдзелу беларускай дэлегацыі ў рабоце з'езда. Дарэчы, заўжды падчас работы такіх з'ездаў наладжваецца выстаўка навуковых выданняў па гэтай праблематыцы за апошнія пяць гадоў. Беларускую «кніжную калекцыю» сёлета высока ацанілі: яна была прызнана адной з лепшых — як па колькасці, так і па якасці.

— Удзел беларускіх вучоных у гэтым з'ездзе быў вельмі змястоўным, насычаным і ў значнай ступені садзейнічаў пашырэнню ведаў пра беларускую мову, літаратуру, культуру і фальклорыстыку — не толькі ў славянскіх краінах, але і ва ўсім свеце, — рэзюмуе Аляксандр Лукашанец. — Гэта, безумоўна, працуе на прэстыж і айчыннай гуманітарнай навукі, і самой Беларусі як незалежнай славянскай краіны, вызначае яе трывалыя пазіцыі ў сусветнай супольнасці.

У час работы з'езда адбыўся пленум Міжнароднага камітэта славістаў, на якім разглядаліся таксама і арганізацыйныя праблемы. У тым ліку пытанне аб месцы правядзення наступнага XXV — у нейкай ступені юбілейнага — Міжнароднага з'езда славістаў.

— Гэта абсалютна заканамерна, таму што Беларусь цяпер актыўна ўваходзіць у сусветную супольнасць як незалежная славянская дзяржава з выразным нацыянальна адметным абліччам, — каментуе Аляксандр Лукашанец. — Вельмі важна, што на пасяджэнні такое рашэнне было прынята аднагалосна. Гэта сведчыць і аб аўтарытэце беларускай славістычнай навукі, і аб аўтарытэце самой краіны.

Разглядалася таксама пытанне і аб новым кіраўніку Міжнароднага камітэта славістаў — ім стаў наш суразмоўца. Гэта падзея — яшчэ адна ганаровая старонка ў летапісе ўдзелу беларускіх навукоўцаў у Міжнародных славістычных форумах. Бо рэгулярны ўдзел у яго рабоце беларусы бяруць з 1958 года.

Што ж чакае прымаючы бок у гэтыя наступныя пяць гадоў?

— Увогуле Міжнародны камітэт славістаў каардынуе дзейнасць у галіне даследавання славянскіх моў і культур у свеце, садзейнічае пашырэнню ведаў пра іх і ў неславянскіх рэгіёнах, — адзначае новы старшыня Камітэта. — У гэты пяцігадовы перыяд асноўная наша задача — падрыхтаваць чарговы з'езд. Акрамя агульнанавуковай каардынацыі, ідзе распрацоўка навуковай праблематыкі з'езда, фарміруецца яго праграма, вызначаюцца формы работы на ім і квоты ўдзельнікаў ад краін.

Квота ўдзельнікаў, натуральна, вызначаецца ў адпаведнасці з дыяпазонам славістычных даследаванняў у кожнай краіне. Акрамя славянскіх краін, шырокае прадстаўніцтва на з'ездах звычайна маюць Германія, ЗША, Канада і іншыя. І гэта зусім нядзіўна, улічваючы, што, скажам, у Германіі славістыка мае працяглую гістарычную традыцыю, і сёння такія даследаванні праводзяцца фактычна ў кожным універсітэце. Ды і ўвогуле ў свеце расце цікавасць да славянскага рэгіёна.

— Пры Міжнародным камітэце славістаў працуюць 33 пастаянныя навуковыя камісіі, якія займаюцца даследаваннем розных аспектаў славістыкі, — інфармуе суразмоўца.

У большасці гэтых камісій працуюць і беларускія вучоныя. Напрыклад, Камісію па славянскім словаўтварэнні на наступныя пяць гадоў узначальвае наш суразмоўца. У яе рабоце таксама ўдзельнічаюць прафесар лінгвістычнага ўніверсітэта Зінаіда Харытончык і прафесар Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта Аляксей Нікіцевіч. Ёсць беларускія навукоўцы і ў складзе камісій па этна- і сацыялінгвістыцы, славянскіх літаратурных мовах, міжмоўных кантактах, у біблійнай камісіі і шэрагу іншых.

І далёка не апошняя задача Беларусі — як гаспадыні наступнага Міжнароднага з'езда славістаў — паказаць сваю гасціннасць, нацыянальную адметнасць, самабытнасць. Для таго і ладзіцца падчас навуковага форуму насычаная культурная праграма, дзе знойдзецца месца ўсяму: ад нацыянальных рамёстваў і помнікаў даўніны — да спеваў і танцаў. Нам сапраўды ёсць што паказаць, таму з задавальненнем чакаем гасцей.

Ала МАЧАЛАВА.

Сучасны філамат гатовы жыць у глыбінцы

Вучню школы № 56 горада Мінска Андрэю Жбанаву куды больш за весялушак-аднакласніц падабалася настаўніца беларускай літаратуры. Ён, сам таго не заўважаючы, нават пераняў яе адмысловы почырк, а яшчэ — непадробную цікавасць да прадмета.

У хуткім часе настаўніца пакінула школу, а любоў да мовы засталася з Андрэем, цяпер ужо дарослым мужчынам, работнікам Міністэрства замежных спраў Беларусі, на ўсё жыццё. За тры гады работы ў беларускім пасольстве ў Германіі ён пры кожным зручным выпадку ўстаўляў у размову роднае слова, так што пад канец яго візіту немцы віталіся з ім не інакш як «прывітанне» і добра ведалі песню пра «аксамітны летні вечар».

Гэтая кампазіцыя стала развітальнай на літаратурна-музычнай вечарыне Андрэя Жбанава, якая адбылася ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы. Бадай, гэта адзіная песня сярод тых, што прагучалі на творчай сустрэчы, да якой Андрэй не мае дачынення як аўтар. Да ўсіх астатніх словы і музыку ён напісаў сам, альбо толькі музыку, узяўшы за аснову творы вядомых беларускіх паэтаў.

Так, мелодыю да верша Адама Міцкевіча «Хай радасць з вачэй нашых блісне», які ў свой час быў гімнам таварыства філаматаў, Андрэй напісаў ад... зайздрасці. У гады вучобы на факультэце міжнародных адносінаў Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта ён даведаўся, як многа ў расіян студэнцкіх песень, і вельмі бедаваў, што ў беларусаў — аніводнай. Вось і вырашыў выправіць становішча.

Дарэчы, дакладна вядома, што ў дзевятнаццатым стагоддзі студэнты часта зацягвалі на вячорках песні на словы Міцкевіча, але іх ноты, як раней лічылася, да нас не дайшлі. А зусім нядаўна гісторык Аляксей Фралоў знайшоў у архіве сшытак з запісам мелодыі на верш «Хай радасць з вачэй нашых блісне». Так што цяпер Андрэю Жбанаву карціць даведацца, ці падобны яго варыянт гэтай песні да арыгінала.

Гімн таварыства філаматаў невыпадкова стаў кропкай адліку на творчым шляху паэта-барда.

— Калі б я жыў два стагоддзі таму, то, пэўна, быў бы сярод іх, — прызнаецца Андрэй Жбанаў. — Мне блізкая цяга філаматаў да навук і іх шчырая цікавасць да гісторыі нашай краіны, любоў да роднай мовы і літаратуры.

З літаратараў ён аддае перавагу Уладзіміру Караткевічу: у канцэрце прагучала дзве песні на яго словы. Андрэй не пакінуў без сваёй увагі і верш Францішка Багушэвіча «Хмаркі цёмныя, мае братанкі», які запаў яму ў душу яшчэ ў школьныя гады.

— На маё разуменне, гэта верш пра беларусаў, якія з'язджаюць за мяжу, — падзяліўся сваімі думкамі паэт і кампазітар.

Сам жа Андрэй Жбанаў за мяжу не збіраецца. Больш за тое, ён быў бы зусім не супраць памяняць Мінск на маляўнічую беларускую глыбінку, напрыклад, на горад Браслаў, якому ён таксама прысвяціў нямала вершаў і песень.

— Я зусім нядаўна зразумеў, што можна жыць у закінутым ад сталіцы месцы і адчуваць сябе не горш, чым сярод машын, магазінаў і кінатэатраў. Бо і тут і там — Бацькаўшчына. А на Бацькаўшчыне не можа быць дрэнна.

Вікторыя КРУПЯНЬКОВА.
Фота аўтара.

Імпартаваць алкагольныя напіткі ў Беларусь у IV квартале будуць 24 кампаніі

Права на ўвоз у Беларусь алкагольных напіткаў у студзені — снежні 2008 года атрымалі 24 кампаніі, паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве гандлю.

Пераможцаў конкурсу на вызначэнне юрыдычных асобаў, якія забяспечваюць рэалізацыю выключнага права дзяржавы на імпарт алкагольных напіткаў у чацвёртым квартале, на 9 кампаній больш, чым у папярэднім квартале. Так, у лік спецімпарцёраў уключаны ТАА «Энергія», ТАА «Класічныя віны», ААТ «Тытуньвінгандаль», РУП «Клімавіцкі лікёра-гарэлачны завод», РУП «Віцебскі лікёра-гарэлачны завод», ААТ «Мінскі завод пеністых він», СТАА «

АЛТАР ПАМЯЦІ Ў ЗАМУРАВАНЫМ АКНЕ

На тэрыторыі псіхбальніцы ў Магілёве захаваўся будынак, дзе немцы ў час акупацыі знішчылі каля 900 псіхічна хворых людзей. Там была зроблена газавая камера, дзе пацыентаў атручвалі выхлапнымі газамі ад аўтамабіляў. Фашысты лічылі душэўна хворых «недастойнымі жыцця людзьмі, якія не прыносяць ніякай карысці грамадству», і без літасці знішчалі іх.

Пра гэту трагедыю, як гэта ні дзіўна, магіляўчанам нагадалі немцы. Справа ў тым, што медыкі з псіхіятрычнай бальніцы Магілёва і ўніверсітэцкай клінікі Хайдэльберга супрацоўнічаюць ужо дзясятак гадоў. Сумесныя семінары былі прысвечаны праблемам псіхічна хворых людзей, стаўлення да іх грамадства, таксама і ў гістарычным кантэксце. Дакументальныя фотаздымкі, зробленыя ў акупацыю ў Магілёўскай псіхбальніцы, моцна ўразілі ўсіх: людзей, больш падобных на абцягнутыя скурай шкілеты, вядуць на бойню. Так узнік сумесны праект «У памяць аб загубленых душах». Ідэю стварэння помніка бязвінным ахвярам падтрымаў і гатовы фінансаваць нямецкі ўрад.

— Мы ведалі пра гэты сумны гістарычны эпізод, — сказаў дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Алег Сакадынец, які працаваў у Магілёўскай псіхіятрычнай бальніцы. — Мы чулі размовы, які перадаваліся ад старэйшых супрацоўнікаў да іх дзяцей і малодшых калег. Я падтрымліваю ідэю стварэння помніка, таму што людзі сёння ўсё ж недастаткова ўсведамляюць, якую страшную пагрозу нёс нямецкі сацыял-нацыяналізм і ад якога жаху нашы дзяды і бацькі абаранілі ўсю Еўропу.

У Магілёве медыкі, дэпутаты і грамадскія актывісты абмеркавалі, якім павінен быць мемарыяльны знак.

— Мы вырашылі прыцягнуць грамадскасць, таму што ён патрэбен самім людзям і будзе мець для іх значэнне, — сказала беларуская каардынатар праекта Ала Сярожкіна.

Былі самыя розныя прапановы: ад звычайнай каменнай пліты са словамі смутку ад нямецкага і беларускага народаў да алтара ў акне былой лабараторыі, якое немцы замуравалі для герметычнасці пры падрыхтоўцы душагубкі. Апошнюю слушную прапанову выслухала галоўны рэдактар тэлеканала «Магілёў-2» Алена Барысава. Урэшце ўдзельнікі дыскусіі вырашылі аб'явіць творчы конкурс. Яго ўмовы будуць распрацаваны ў лістападзе, а тры лепшыя работы атрымаюць узнагароды.

— І ёсць яшчэ адна важная прычына, каб ажыццявіць гэты беларуска-нямецкі праект, — нагадаў пра сучасныя праблемы дэпутат беларускага парламента Алег Сакадынец. — На вялікі жаль, і нашы людзі часта мяркуюць, што калі чалавек захварэў псіхічна, то ён — непатрэбны. Але гэта не так! Псіхічныя хваробы — такія ж, як і іншыя. Як, напрыклад, радыкуліт і ішэмічная хвароба сэрца. Пацыенты псіхбальніц лечацца і вяртаюцца да працы, сям'і і ўсіх радасцяў жыцця. Яны такія ж людзі, як і мы з вамі. І будзе вялікай перамогай, калі грамадства гэта ўсвядоміць.

Ілона ІВАНОВА.

Аляксандр ГАЎРЫЛАЎ:

«ВОПЫТ БЕЛАРУСІ Ў БАРАЦЬБЕ З ГАНДЛЕМ ЛЮДЗЬМІ АТРЫМАЎ ПРЫЗНАННЕ СУСВЕТНАЙ СУПОЛЬНАСЦІ»

Пачатак 90-х для нашай неабдымнай Радзімы быў адзначаны тым, што краіна, у якой не было ні сэксу, ні тым больш парнаграфіі, раптам, вобразна кажучы, пазбавілася цнатлівасці. Разам з жалезнай заслонай, якая рухнула, быццам мухі на мёд, пачалі роем злятацца ўсе радасці і заганы капіталістычнай цывілізацыі. Заканадаўчая сістэма адкрыта не паспявала за крымінальнай вынаходлівасцю. Латэнтнасць — скрытасць — стала адметнай рысай злачынстваў новага свету. Ужо праз непрацяглы час стала зразумела, што старымі «пілюлямі» новую «заразу» не вылечыш — краіне неабходны новы шчыт і новы меч.

Менавіта пад гэтымі лёсавызначальнымі сімваламі ў 1996 годзе ў Міністэрстве ўнутраных спраў утварылася ўпраўленне па незаконным абароце наркотыкаў. Аднак у хуткім часе гэта ж падраздзяленне пачало весці барацьбу з сэксуальнай і працоўнай эксплуатацыяй. І сёння члены калектыву, гісторыі якога спаўняецца ўжо 12 гадоў, называюць сябе супрацоўнікамі Упраўлення па наркакантролі і процідзеянні гандлю людзьмі МУС Беларусі.

Аб поспехах і праблемах у працы гэтага падраздзялення мы пагаворым з яго кіраўніком — палкоўнікам міліцыі Аляксандрам Гаўрылавым.

— Аляксандр Гаўрылавіч, згадзіцеся, 12 гадоў для гісторыі — гэта імгненне. Наколькі аўтарытэтныя вашы пазіцыі ў сферы міжнароднага ўзаемадзеяння?

— Мяркуйце самі. Напрыклад, вопыт Беларусі ў барацьбе з гандлем людзьмі ўжо атрымаў прызнанне сусветнай супольнасці. Нарматыўна-прававыя і практычныя аспекты беларускага вопыту па барацьбе з гандлем людзьмі былі прызнаны годнымі вывучэння, што прадвызначыла адкрыццё 19 ліпеня 2007 года на базе Акадэміі МУС Беларусі Міжнароднага навучальнага цэнтра падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі, перападрыхтоўкі кадраў у сферы міграцыі і процідзеяння гандлю людзьмі.

На сёння ў Міжнародным навучальным цэнтры прайшло навучанне 5 груп слухачоў з дзяржаў — удзельніц СНД і органаў унутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

Як паказчык больш высокай зацікаўленасці да вывучэння беларускага вопыту — запрашэнні, якія паступаюць ад замежных калег са Швейцарыі, Ізраіля, Фінляндыі, Узбекістана і інш. Свой інтарэс праяўляюць і дзяржавы Персідскага заліва.

— Як вы ацэньваеце ўзровень наркатызацыі насельніцтва Беларусі на сёння? Ці можаце вы сказаць, што сітуацыя знаходзіцца пад кантролем?

— Калі на мове лічбаў, то сёння гэта 109 наркаманаў на 100 тысяч насельніцтва. На шчасце, у нашай краіне гэты паказчык значна ніжэйшы, чым, скажам, у Расіі і ва Украіне.

Што да выразу «сітуацыя пад кантролем», дык, пагадзіцеся, мы не можам злавіць за руку кожнага, хто збіраецца паспрабаваць наркотыкі, і забараніць яму гэта зрабіць. А вось што датычыцца прафілактычных мерапрыемстваў (растлумачальнай работы ў калектывах, навучальных установах, стварэння і пракату сацыяльных ролікаў, выступлення на тэлебачанні і ў друкаванай прэсе), то тут мы стараемся выкласціся па максімуму.

— Згодны, што на патэнцыяльнага наркамана можна неяк уздзейнічаць перакананчай і красамоўнай інфармацыяй праз СМІ і г.д. Але прадаўцы — гэта не заўжды наркаманы, іх мэта — атрыманне прыбытку. Ці магчыма змагацца з прагай да грошай?

— Давайце ўдакладнім: з крымінальнай прагай. А з ёй ёсць сэнс змагацца заканадаўчымі мерамі.

Так, летась па нашай ініцыятыве ў нарматыўныя акты было ўведзена паняцце «асабліва небяспечныя наркатычныя сродкі і псіхатропныя рэчывы». Да іх аднесены найбольш «папулярныя» сярод нарказалежных асобаў гераін, амфетамін, ацэтыляваны і экстрацыйны опій.

Стала больш жорсткім пакаранне за захоўванне і распаўсюджванне наркатычных сродкаў у месцах масавага адпачынку, установах адукацыі і крымінальна-выканаўчай сістэмы.

У снежні мінулага года Міністэрства гандлю пастановай № 1711 забараніла продаж маку на рынках рэспублікі.

Акрамя таго, для недапушчэння выпадкаў перасылкі поштай наркотыкаў у папраўчыя ўстановы па ініцыятыве МУС Беларусі ў гэты ж час была падпісана і пастанова Савета Міністраў, якой унесены змяненні ў правілы аказання паслуг паштовай сувязі. Сутнасць новаўвядзення заключаецца ў абавязковым прад'яўленні дакументаў, якія пацвярджаюць асобу адпраўніка пры адпраўцы пасылак у месцы пазбаўлення волі.

— Не так даўно закончылася спецыяльная праграма «Мак». Якія яе вынікі сёлета?

— Нашымі падраздзяленнямі па рэспубліцы было канфіскавана і знішчана 51,5 тоны пасеваў нарказмяшчальных раслін на плошчы звыш 26 га.

У межах крымінальных спраў з незаконнага абароту выведзена больш за 438 кг наркатычнай сыравіны, у тым ліку звыш 364 кг макавай саломкі і больш як 70 кг макрыхуаны, а таксама амаль 23 кг гатовых наркотыкаў, у тым ліку звыш 12 кг экстракцыйнага опію і больш за 10 кг іншых наркатычных сродкаў, выяўлена 917 злачынстваў, звязаных з незаконным абаротам наркотыкаў.

— Каля 15 гадоў таму тэмы, якія мы закранаем, не насілі такога маштабнага і злабадзённага характару для насельніцтва Беларусі. Але варта адзначыць, што на працягу гэтага часу, — вядома ж, не без удзелу праваахоўных органаў і СМІ, — грамадзяне Беларусі навучыліся быць больш асцярожнымі, набылі новую ступень палітычнай і сацыяльнай граматнасці. Здаецца, вярбоўшчыкам на фальшывую «высокаплатную» працу даводзіцца ўсё цяжэй...

— І тым не менш яны вельмі выходлівыя, як і па-ранейшаму наіўныя і многія маладыя дзяўчаты. Хоць, безумоўна, ужо не так, як раней. Прафілактычная інфармацыя адыграла сваю пазітыўную ролю. Акрамя таго, прыкметна павысіўся ўзровень і якасць жыцця ў нашай краіне. Гэта таксама немалаважна. Групу рызыкі цяпер складаюць у большай ступені людзі, чыё матэрыяльнае і сацыяльнае становішча склалася не лепшым чынам. Лягчэй за ўсё менавіта яны становяцца ахвярамі як сэксуальнай, так і працоўнай эксплуатацыі.

Падкрэслю таксама, што дзейнасць суб'ектаў гаспадарання ў сферах мадэльнага і шлюбнага бізнэсу, а таксама па працаўладкаванні за мяжой узятыя пад жорсткі кантроль дзяржавы і патрабуюць атрымання адпаведнай ліцэнзіі. Такіх ліцэнзій дзейнічае сёння ў Беларусі ўсяго 70: 3 — у сферы мадэльнага бізнэсу, 19 — шлюбнай дзейнасці і 48 — па працаўладкаванні за мяжой.

Дарэчы, нядаўна МУС ініцыявала ўнясенне ў Крымінальны кодэкс артыкулаў, якія прадугледжваюць адказнасць за незаконныя дзеянні, накіраваныя на выкарыстанне прымусовай (рабскай) працы, а таксама ўзмацненне адказнасці за выраб і распаўсюджванне дзіцячай парнаграфіі. Цяпер законапраект знаходзіцца ў парламенце і, у выпадку яго прыняцця, у недалёкай будучыні злачынцы будуць несці пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін да 13 гадоў з канфіскацыяй маёмасці.

— Дарэчы, пра дзіцячую парнаграфію. Падобна, што галоўная цацка нашага часу — інтэрнэт — сёння мае большую небяспеку, чым раней «дрэнны дзядзька» з цукеркай на дзіцячай пляцоўцы.

— Так, інтэрнэт — гэта адна з крыніц праблемы. Цяпер рыхтуецца да разгляду ў судзе дзейнасць арганізаванай злачыннай групоўкі, у склад якой уваходзілі нашы сугамадзяне, а кіраўнікамі з'яўляліся трое грамадзян Расіі. На працягу шэрагу гадоў зламыснікі займаліся вырабам і размяшчэннем у сетцы інтэрнэт парнаграфічных матэрыялаў, у тым ліку з удзелам няпоўнагадовых. Злачынны даход, які яны атрымлівалі, дасягаў 40 тысяч долараў ЗША ў тыдзень, затым ён легалізаваўся праз афшорныя кампаніі. У нашай юрысдыкцыі знаходзяцца толькі беларускія сайты. Так што ў гэтым накірунку працы яшчэ шмат...

Гутарыла Аляксандра ГРУШЭЎСКАЯ.

ХРАП МОЖА ПРЫВЕСЦІ ДА СПЫНЕННЯ ДЫХАННЯ

Храп з'яўляецца прадказальнікам і галоўным сімптомам хваробы спынення дыхання ў сне (сіндрому абструктыўнага апноэ сну) і можа прывесці да смяротнага выніку, расказала галоўны пазаштатны атарыналарынголаг Міністэрства аховы здароўя галоўны ўрач Рэспубліканскай клінічнай бальніцы паталогіі слыху, голасу і маўлення Людміла Макарына-Кібак.

Паводле яе слоў, пры апноэ сну ў спячага чалавека раптоўна абрываецца храп і ўзнікае палохаючае спыненне дыхання, пасля чаго ён зноў пачынае дыхаць. Часам можа адзначацца ад 7 да 10 спыненняў дыхання за ноч. Парушэнні дыхання ў спячага чалавека прыводзяць да рэзкага пагаршэння якасці сну, галаўных боляў, пастаяннай санлівасці, раздражняльнасці, зніжэння ўвагі і памяці, парушэнняў патэнцыі. Акрамя таго, павялічваецца рызыка развіцця гіпертанічнай хваробы, інфаркту міякарда і інсульту.

Прынята лічыць, што ад храпу ў большай ступені церпяць бліжэйшыя сваякі чалавека са схільнасцю да «гучнага сну», а не ён сам. Але якраз менавіта для «мучыцеля» наступствы могуць быць вельмі сур'ёзнымі, аж да смяротнага выніку. «Храп — гэта толькі сімптом, але з ім неабходна змагацца тады, калі ён яшчэ не перайшоў у стадыю апноэ», — зазначыла спецыяліст.

Храп варта лячыць комплексна, прымяняючы хірургічныя і кансерватыўныя метады. Аператыўныя ўмяшанні накіраваны на расшырэнне дыхальных шляхоў. Хірургічная карэкцыя ўключае комплекс аперацый, якія паляпшаюць насавое дыханне, павялічваюць прасвет глоткі, змяншаюць памеры мяккага нёба і лімфоідных утварэнняў глоткі.

Па дапамогу найперш трэба звяртацца да отарыналарынголага. Ён растлумачыць, якое становішча для сну з'яўляецца аптымальным, парэкамендуе спецыяльныя практыкаванні. «Чалавеку з лішняй вагой пры лячэнні храпу абавязкова давядзецца пахудзець. Спадзявацца ў выпадку праблем з дыханнем у сне на цуда-аперацыю і зусім не даводзіцца — лячэнне толькі комплекснае», — рэзюмавала Людміла Макарына-Кібак.

Вольга ШАЛЯГОВІЧ, БЕЛТА.

Спорт-тайм

ТЭНІСІСТЫ ВЫЙГРАЛІ «СЕРАБРО» ЕЎРАФОРУМУ

Мужчынская зборная Беларусі па настольным тэнісе стала сярэбраным прызёрам чэмпіянату Еўропы, які ў гэтыя дні праходзіць у расійскім Санкт-Пецярбургу. У фінале наша каманда з лікам 2:3 саступіла нямецкай дружыне.

Нагадаем, жаночая каманда размясцілася ў выніковым пратаколе еўрафоруму на 12-й пазіцыі, прайграўшы ў заключным паядынку французжанкам — 2:3. Учора ў Санкт-Пецярбургу пачаліся індывідуальныя спаборніцтвы.

БЕЛАРУСКІЯ ТАЙСКІЯ БАКСЁРЫ ЗНОЎ ПЕРШЫЯ

Зборная каманда па тайландскім боксе Беларусі заняла першае месца ў агульнакамандным заліку на чэмпіянаце свету ў Карэі. Чэмпіянат свету праходзіў у рамках Сусветных спартыўных гульняў пад патранатам Міжнароднага алімпійскага камітэта ў Паўднёвай Карэі (горад Бусан). Медалі найвышэйшай пробы прывезлі дадому Марына Калініна, Андрэй Кулебін (вагавая катэгорыя да 67 кг), Віталь Гуркоў (да 70 кг), Дзмітрый Шакута (да 81 кг) і Андрэй Кудзін (звыш 90 кг).

ЮНІЁРЫ ЗАХОЎВАЮЦЬ ШАНЦЫ

Юніёрская зборная краіны па футболе (U-19) завяршыла выступленне ў адборачным турніры 1-га кваліфікацыйнага раўнда чэмпіянату Еўропы. У Барысаве яна выйграла ў каманды з Фарэрскіх астравоў — 1:0. Таксама ў 13-й групе іспанцы аказаліся слабейшымі за швейцарцаў — 0:2. Такім чынам, адразу тры дружыны набралі па 6 ачкоў. Нашы суайчыннікі з горшай розніцай забітых і прапушчаных мячоў занялі трэцяе месца, але яшчэ захоўваюць шанцы на выхад у асноўную стадыю. Туды трапяць дзве лепшыя зборныя з заняўшых трэцяя месцы ў сваіх квартэтах.

ЗЫГМАНТОВІЧ УЗНАЧАЛІЎ «КАЎНАС»

Галоўны трэнер літоўскага футбольнага клуба «Каўнас» партугалец Жазэ Каўсейру вырашыў засяродзіцца на рабоце са зборнай Літвы. Гэта звязана з удалым стартам нацыянальнай каманды ў адборачным цыкле чэмпіянату свету-2010. Літоўцы ўжо святкавалі перамогі над удзельнікамі мінулага кантынентальнага першынства румынскай і аўстрыйскай дружынамі. У гэтую суботу падапечныя Каўсейру у гасцявым супрацьстаянні памераюцца сіламі з сербамі, а праз чатыры дні прымуць дома фарэрцаў. Таму цяпер настаўнікам «Каўнаса» зноў будзе беларускі спецыяліст Андрэй Зыгмантовіч.

ВЕЛАСПОРТ МОГУЦЬ ВЫКЛЮЧЫЦЬ З АЛІМПІЯД

Віцэ-прэзідэнт Міжнароднага алімпійскага камітэта Томас Бах заявіў, што веласпорт можа быць выключаны са спісу алімпійскіх відаў спорту ў сувязі са шматлікімі допінгавымі скандаламі.

Выратаванне дзяцей

ПАРОК СЭРЦА — НЕ ПАРОК ДЛЯ ЖЫЦЦЯ

Беларускія кардыяхірургі могуць выконваць любыя аперацыі на сэрцы для дзяцей на ўзроўні вядучых клінік свету.

Першую аперацыю на сэрцы 18-гадовая Аляксандра з Дзяржынска перанесла ў 13 гадоў, у 14 — другую, заключную.

— Пасля першай аперацыі мяне досыць хутка выпісалі, — кажа Аляксандра. — Пасля другой я 11 сутак прабыла ў рэанімацыі, яшчэ месяц — у клініцы, пад наглядам урачоў, і тры тыдні — на рэабілітацыі, у Аксакаўшчыне... У мяне не варушыліся ні рукі, ні ногі... Я магла толькі ляжаць... Усяму давялося вучыцца наноў. Штодня, кожную раніцу, да мяне прыязджала мама і сядзела са мной цэлы дзень... Цяпер я вучуся ў Мінску, у Беларускім дзяржаўным медыцынскім каледжы, па спецыяльнасці «сястрынская справа». Думаю, буду паступаць у дзяржаўны медуніверсітэт... Цяпер у мяне стабільны стан здароўя, хоць фізкультуру я па-ранейшаму не наведваю, але ў цэлым маё жыццё нельга назваць неактыўным...

У Аляксандры была прыроджаная анамалія Эбштэйна — збой рытму, паталогія, пры якой процітаказаны любыя псіхічныя і фізічныя нагрузкі, і якая ў рэшце рэшт прыводзіць да заўчаснай гібелі. Аляксандра перажыла другое нараджэнне дзякуючы намаганням беларускіх кардыяхірургаў, якія прааперыравалі дзяўчынку падчас аднаго з візітаў у нашу краіну кіраўніка Міжнароднага фонду «Дзіцячае сэрца» (Мемфіс, ЗША), доктара Вільяма Новіка. Упершыню ён наведаў Беларусь па запрашэнні Беларускага дзіцячага фонду і Міністэрства аховы здароўя ў 1996 годзе. Са сваімі калегамі з розных краін ён абследаваў і прааперыраваў беларускіх дзяцей з найцяжэйшымі парокамі сэрца і сасудаў. Многія аперацыі пачалі рабіцца тады ў рэспубліцы ўпершыню.

На сёння ў межах праграмы «Дзіцячае сэрца» адбылося 18 візітаў замежных спецыялістаў, якія прааперыравалі звыш 400 дзяцей, а каля 1500 атрымалі кваліфікаваныя кансультацыі. Гэтымі днямі міжнародная брыгада 12 хірургаў, анастэзіёлагаў, кардыёлагаў, медсёстраў з ЗША, Вялікабрытаніі, Канады, Аўстрыі і Харватыі на чале з доктарам Новікам і разам з беларускімі калегамі праводзяць аперацыі і абследаванне хворых дзяцей з прыроджанымі парокамі сэрца на базе Дзіцячага кардыяхірургічнага цэнтра РНПЦ «Кардыялогія».

Паводле слоў намесніка дырэктара па дзіцячай кардыялогіі РНПЦ «Кардыялогія» Юрыя ЧАСНОВА, сёлета гэта ўжо трэці візіт замежных спецыялістаў. Цяпер гэтыя візіты — раўназначны абмен вопытам, паколькі падчас сумеснай работы беларускіх і замежных кардыяхірургаў удасканальваецца кардыяхірургічная дапамога, вядзецца пошук новых методык і тэхналогій аперацый.

— Працаваць у ізаляцыі немагчыма, — тлумачыць Юрый Часноў. — Сумесна прасцей абмяркоўваць адзінкавыя выпадкі парокаў. Наогул жорсткіх алгарытмаў вядзення аперацыі на сэрцы па прычыне пароку быць не можа — толькі індывідуальны падыход... Скажам, сёння мы аперыравалі 3-гадовага хлопчыка з паталогіяй мітральнага клапана. Калі б мы паставілі штучны клапан, то праз нейкі час хлопчык у прамым сэнсе вырас бы з яго і давялося б рабіць яшчэ адну аперацыю. Мы ж выдалілі недастатковасць клапана і захавалі яго. Адначасова ў аперацыі ўзялі ўдзел артапеды, паколькі ў дзіцяці была яшчэ і анамалія будавання грудной клеткі. Па вялікім рахунку, аперацыю можна назваць унікальнай...

Штогод у нашай краіне нараджаецца каля 800 дзяцей з парокамі сэрца рознай цяжкасці. Частка з іх мае патрэбу ў аператыўным умяшанні да 1-месячнага ўзросту, яшчэ частка — да гадавалага, астатнія могуць быць прааперыраваны ў іншы час. Як кажуць спецыялісты, для кожнага такога пацыента — свой тэрмін аперацыі.

Зараз у Дзіцячым кардыяхірургічным цэнтры, адкрытым яшчэ ў 1995-м, выконваецца каля тысячы аперацый у год. «Наша задача — рабіць гэту колькасць аперацый з найлепшай якасцю, — кажа Часноў. — І мы здольныя на гэта, паколькі цэнтр аснашчаны самай сучаснай апаратурай і адпавядае самым высокім стандартам».

Усе аперацыі для дзяцей з парокамі сэрца па-ранейшаму выконваюцца бясплатна для пацыентаў, хоць іх кошт у замежных клініках вагаецца ад 20 да 100 тысяч долараў. Дарэчы, сёлета беларускія спецыялісты ўпершыню працавалі ў складзе міжнародная кардыябрыгады пад кіраўніцтвам Вільяма Новіка ва Украіне.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Фота Наталлі АБЛАЖЭЙ, БЕЛТА.

ВЯЛІКІЯ ІТАЛЬЯНЦЫ

Скрыпкі вялікіх італьянскіх майстроў упершыню прывезлі ў Мінск. 7 кастрычніка ў беларускай сталіцы прэзідэнт Еўрапейскага аддзялення «Таварыства Страдывары» прафесар Эдуард Вульфсан *(на фота)* паказаў прадстаўнікам СМІ пяць «італьянцаў», самым дарагім з якіх з'яўляецца інструмент «Цыркл» Антоніо Страдывары. Скрыпка «Цыркл» зроблена ў 1701 годзе і ацэньваецца ў 5 млн. 500 тыс. долараў. Два інструменты з калекцыі кіраўніка таварыства — венецыянскіх майстроў Санта Серафіна (1732 год) і Дамініка Мантаньяна (прыкладна 1730—1735 гады), вядомага сваімі віяланчэлямі. Унікальныя інструменты ацэньваюцца ў 1 млн 200 тыс. і 1 млн 350 тыс. долараў адпаведна. Самая маладая з тых, што прыехалі ў Мінск, — скрыпка Жана Батыста Гуаданіні — зроблена ў 1769 годзе. Яе цана — 1 млн 250 тыс. долараў. Майстар яшчэ адной скрыпкі бацька Гварнеры Дэль Джэзу — Ёзеф Філіус Андрэас. Эксперты лічаць, што яна створана ў 1700—1705 гадах. Гэты інструмент ацэнены ў 1 млн 500 тыс. долараў. З пяці скрыпак маладыя беларускія выканаўцы — лаўрэаты спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, лаўрэаты міжнародных конкурсаў Улада Беражная і Арцём Шышкоў — выберуць інструменты, гучанне якіх змогуць ацаніць гледачы канцэрта III Міжнароднага фестывалю Юрыя Башмета.

Візіт

ПАБУДАВАЦЬ АДНО КРЭСЛА АРЭНЫ ЕЎРА-2012 КАШТУЕ 3000 ЕЎРА

У гэтыя дні Мінск наведаў Прэзідэнт польскага футбольнага саюза Міхал Ліскевіч. Ён прыбыў у беларускую сталіцу ў якасці дэлегата УЕФА на адборачны турнір чэмпіянату Еўропы сярод юніёраў (U-19). Разам са старшынёй аргкамітэта чэмпіянату Еўропы-2012 Адамам Альховікам яны сустрэліся з журналістамі і расказалі, як ідзе падрыхтоўка да Еўра-2012, а таксама не абышлі ўвагай і нядаўні скандал міністэрства спорту Польшчы з футбольным саюзам гэтай краіны, з-за якога нашу суседку маглі пазбавіць права правядзення еўрафоруму.

Адам Альховік расказаў, што ідэя сумеснага правядзення Еўра-2012 належыць Украіне. Кіраўнік федэрацыі футбола Украіны Рыгор Суркіс звярнуўся ў Польшчу з такой прапановай. «Спачатку мы адмовіліся, бо гэта нерэальна. А потым перадумалі. Наша прэзентацыя на паперы — тэксты, планы, карты, урадавыя гарантыі — заняла каля трох тысяч старонак. Калі з усім гэтым мы накіраваліся ў штаб-кватэру УЕФА, у аэрапорце лішняя вага багажу склала 286 кілаграмаў, за што дадаткова прыйшлося даплаціць чатыры тысячы долараў. Але гэтае таго варта...»

Адам Альховік растлумачыў, што шматлікія прэтэнзіі УЕФА да арганізатараў Еўра-2012 звязаныя з тым, што ў Польшчы дагэтуль не было ніводнага стадыёна, які адпавядае патрабаванням УЕФА, ва Украіне быў толькі адзін. І вось два тыдні таму ў Днепрапятроўску была адкрыта арэна, якая ўмяшчае 33 тысячы гледачоў. Гэта будзе самы малы стадыён, які арганізатары будуюць да першынства кантынента. Мяркуецца, што матчы еўрафоруму змогуць убачыць паўтара мільёна гледачоў, што дазволіць пераўзысці дасягненне мінулага першынства Еўропы на 450 тысяч. Арэна ў Варшаве будзе ўмяшчаць 50 тысяч гледачоў, у Кіеве — 73 тысячы. Дарэчы, стадыён у Варшаве будзе самым дарагім праектам Польшчы да чэмпіянату Еўропы. Ён цалкам фінансуецца з бюджэту дзяржавы (іншыя стадыёны будуюцца за бюджэтныя сродкі гарадоў) і каштуе 315 мільёнаў еўра. У будаўніцтве астатніх стадыёнаў дзяржава бярэ на сябе толькі трэць расходаў. «Мы лічым наступным чынам: адно крэсла — тры тысячы еўра. Калі на арэне сорак тысяч месцаў, то яе бюджэт — 1,2 мільёна еўра», — расказаў старшыня аргкамітэта.

Увогуле Польшча рыхтуе шэсць стадыёнаў, хоць задзейнічаны будуць максімум чатыры. Да таго ж, у краіне збіраюцца адкрыць 44 трэніровачныя цэнтры, хоць УЕФА патрабуе ўсяго 16. Плануецца пабудаваць 2012 палёў памерам 60 на 30 метраў. 126 будоўляў ужо завершаны, 590 — у самым разгары. Кошт аднаго поля — каля 300 тысяч еўра. «Акрамя гэтага, нам трэба будзе адрамантаваць больш за тысячу кіламетраў аўтадарог, зрабіць сучаснай чыгунку, каб цягнікі ехалі з хуткасцю не 60 кіламетраў у гадзіну, а 160», — расказаў Адам Альховік.

Міхал Ліскевіч заявіў, што ўнутраны канфлікт паміж польскім міністэрствам спорту і федэрацыяй ужо вычарпаны, і Еўра-2012 ад Польшчы нікуды не дзенецца. Ён расказаў, што за апошні год у федэрацыі прайшло не менш за 50 розных праверак. «Былі знойдзены невялікія неадпаведнасці патрабаванням статута, з-за чаго ў футбольны саюз быў прызначаны камісар, які павінен быў кантраляваць і дапамагаць нам адпавядаць нарматыўным дакументам. Аднак ФІФА і УЕФА былі супраць такога ўмяшання. Два гады таму ў нас быў аналагічны канфлікт з ранейшым міністрам спорту, які, дарэчы, зараз у турме... Знаходзячыся ў Мінску, я, магчыма, сотню разоў размаўляў па тэлефоне з прадстаўнікамі польскага ўрада і кіраўніцтвам УЕФА і ФІФА. Канфлікт вычарпаны, шкада толькі, што рахунак за гэтыя размовы будзе немалы», — расказаў кіраўнік польскага футбола. У бліжэйшую пятніцу ў Цюрыху (Швейцарыя) сустрэнуцца прадстаўнікі ўсіх канфліктуючых бакоў і «польскае пытанне» канчаткова будзе вырашана.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ЖЫВЫ ДОТЫК

Добрае сэрца

10 кастрычніка ў Палацы Рэспублікі адбудзецца дабрачынны канцэрт-марафон «Дотык да жыцця». Удзел у ім возьме гурт «Беларускія песняры», які прадставіць сваю сольную праграму, а таксама многія папулярныя беларускія артысты — Іна Афанасьева, Аляксей Хлястоў, Настасся Ціхановіч, Галіна Шышкова, Вольга Вронская, Ірына Ігнацюк, Венера, Вікторыя Алешка і іншыя. Сродкі, выручаныя ад продажу білетаў (а іх кошт складае ад 20 да 95 тысяч беларускіх рублёў), будуць накіраваныя на аказанне адраснай дапамогі дзецям, хворым на анкалогію і гематалогію.

Гэта — першы вялікі праект дабрачыннага дзіцячага фонду «Дотык да жыцця», арганізацыі якога садзейнічаюць Міністэрства адукацыі і Міністэрства аховы здароўя Беларусі, а таксама падтрымку аказвае Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.

Як расказала кіраўнік фонду, дырэктар аднаго са сталічных салонаў прыгажосці Ларыса Івашкевіч, афіцыйна зарэгістравана дабрачынная арганізацыя адносна нядаўна — сёлета ў ліпені, але фактычна сацыяльную, псіхалагічную, матэрыяльную падтрымку хворым дзецям некалькі энтузіястаў аказвалі ўжо даволі працяглы час. Толькі ў апошні час у шэрагу гэтых энтузіястаў — валанцёраў, мецэнатаў, проста нераўнадушных да чужой бяды — з'яўляецца ўсё больш людзей паспяховых, якія рэалізаваліся ў бізнэсе, і цяпер могуць дазволіць сабе не проста суперажыванне праблемам іншых людзей, а суперажыванне плюс актыўнае дзеянне — уласна кажучы, якраз дабрачыннасць. «Калі ў нас з'яўляюцца падобныя фонды, гэта сведчыць аб пэўнай стабільнасці — аб тым, што павялічваецца колькасць людзей, гатовых дапамагчы іншым і матэрыяльна, і душэўнай цеплынёй, — лічыць спявак Аляксей Хлястоў, які таксама выступіць у канцэрце-марафоне. — Асабіста я заўжды буду браць удзел у праграмах фонду і дапамагаць усім, што ў маіх сілах».

У планах фонду, якія былі агучаны, — абсталяванне бытавой тэхнікай і мэбляй кухні ў аддзяленні дзённага стацыянару Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра дзіцячай анкалогіі і гематалогіі ў Бараўлянах, абсталяванне гульнявых пакояў і пакою псіхалагічнай разгрузкі, набыццё цацак для дзяцей, якія праходзяць курс лячэння і рэабілітацыі, набыццё тэле- і відэатэхнікі, штатыўаў для кропельніц на колах ва ўсе аддзяленні цэнтра... Агульны спіс вялікі. І кіраўніцтва фонду пагаджаецца — толькі сродкаў ад рэалізацыі білетаў на дабрачынны канцэрт на ўсе гэтыя патрэбы не хопіць. Таму дадаткова будуць адкрыты спецыяльныя дабрачынныя рахункі для збору ахвяраванняў. Увогуле, канцэрт — гэта толькі старт вялікага марафону. Зімой плануецца рэалізаваць наступны праект — фонд «Дотык да жыцця» і рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Дзеці ў бядзе» сумесна будуць ладзіць у Рэспубліканскім анкацэнтры акцыю «Усмешка». На гэтай сустрэчы збяруцца разам сотні хворых на анкалогію дзяцей і іх бацькоў. Для дзяцей актывісты дабрачынных фондаў рыхтуюць падарункі. Але найвялікшы з іх, паводле словаў псіхолага Рэспубліканскага дзіцячага анкагематалагічнага цэнтра ў Бараўлянах Алены Шпакоўскай, — сама магчымасць такой сустрэчы: «Для тых, хто толькі-толькі сутыкнуўся з гэтай бядой і пачынае цяжкі шлях лячэння, падобныя святы, калі прысутнічаюць людзі з наглядамі прыкладамі рэмісіі, даюць веру ў выздараўленне».

Сапраўды, справа ж не толькі ў грошах — хоць і гэту дапамогу нельга скідваць з рахункаў. Скажам, цягам апошніх трох гадоў ГА «Дзеці ў бядзе» дапамагае набываць рэспубліканскаму анкацэнтру за мяжой рэдкія, але вельмі патрэбныя медыкаменты — штогод на 800 тысяч еўра. Але куды больш важна, што дзякуючы дабрачынным фондам у дзяцей ёсць надзея на лепшае. Прыклад таму — гісторыя 7-гадовай Ані Быкавай. Дзяўчынка год таму, фактычна застаўшыся сіратой, трапіла ў клініку ў найцяжэйшым стане, вельмі доўга знаходзілася ў рэанімацыі, моцна страціла вагу, і шанцы не тое што на выздараўленне — на выжыванне ўрачы ацэньвалі як мінімальныя. Муж і жонка, супрацоўнікі дабрачыннага фонду, сталі для Ані хроснымі бацькамі, апякалі дзіця і дапамагалі, чым толькі маглі. Адбыўся літаральна цуд — чалавечая любоў перамагла ракавую пухліну. А колькі такіх гісторый ведае цэнтр дзіцячай анкалогіі і гематалогіі, дзе ўсе 130, а рэч вострай неабходнасці да 190 ложка-месцаў запоўненыя маленькімі пацыентамі не толькі з Беларусі, але і з Расіі, Украіны, Малдовы, Казахстана, Азербайджана, Арменіі, Таджыкістана?

Дарэчы, некалькі дзясяткаў гэтых дзяцей будуць прысутнічаць 10 кастрычніка на вялікім, трохгадзінным канцэрце ў Палацы Рэспублікі. Гэтаксама як яшчэ больш за 2,5 тысячы гасцей — мецэнатаў, журналістаў, прадстаўнікоў міністэрстваў, дыпламатычных місій у Беларусі, Праваслаўнай царквы, і ўвогуле ўсіх, хто набыў білеты. Арганізатары ўпэўненыя, што душэўнай цеплыні, веры і любові ў зале хопіць на ўсіх. І што гэта — толькі першы

Marko®

СУМЕСНАЕ БЕЛАРУСКА-ГЕРМАНСКАЕ ТАВАРЫСТВА З АБМЕЖАВАНАЙ АДКАЗНАСЦЮ «МАРКО»:

ТРАДЫЦЫІ ЯКАСЦІ, КАМФОРТУ, СТЫЛЬНАСЦІ, ПРАВЕРАНЫЯ ЧАСАМ

Майстар участка аддзелкі жаночага абутку Іна БЕЛЯЗЕКА.

Назва абутку «Марко» даўно пераўтварылася ў абазначэнне абутку для ўсёй сям'і. «Марко — дружная сям'я», «Марко — спартыўная сям'я», «Марко — моцная сям'я» — вось асноўныя перадавыя ідэі кампаніі.

Сярод мноства абутковых брэндаў і звычайных гандлёвых марак, якія з пераменным поспехам прысутнічаюць на айчынным рынку, знойдзецца няшмат, якія вызначаюцца шырокім асартыментам і пастаянным спажывецкім попытам. Ён у сваю чаргу заснаваны цэнавай даступнасцю прадукцыі, зручнасцю абутку ў паўсядзённым карыстанні і высокімі якаснымі паказчыкамі. Усе гэтыя і многія іншыя характарыстыкі аб'ядноўвае ў сабе сумеснае беларуска-германскае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Марко».

СТАА «Вікоп Фагус»

Для таго, каб ствараць камфортны абутак, зручны для айчынных вытворцаў, у лістападзе 1999 года «Марко» арганізуе прадпрыемства «Вікоп-Фагус». На сёння гэта адзіная на тэрыторыі Беларусі вытворчасць, якая займаецца вырабам абутковых калодак. Адметна, што «Вікоп-Фагус» забяспечвае абутковымі калодкамі не толькі айчынныя прадпрыемствы, але і многія фабрыкі Расіі.

Можна смела сцвярджаць: задача шыць камфортны і зручны для паўсядзённага нашэння абутак у многім вырашана дзякуючы дзейнасці СТАА «Вікоп-Фагус».

СТАА «Марко» — гэта:

адзін з буйнейшых вытворцаў абутку не толькі ў Беларусі, але і ў краінах былога Саюза. Пры гэтым кампаніі з 17-гадовым стажам удалося зарэкамендаваць сябе як вытворцу высакаякаснай прадукцыі. Пацвярджэнне таму — мноства ўзнагарод. Прадпрыемства неаднаразова станавілася лаўрэатам конкурсаў «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь», «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь на рынку Расійскай Федэрацыі».

СТАА «Марко» прызнана Брэнд-лідарам у спажывецкай намінацыі ў таварнай групе «Абутак» і застаецца айчынным вытворцам № 1 у Беларусі. У свой час СТАА «Марко» стаў першым прадпрыемствам Беларусі, якое атрымала статус «добрасумленнага ўдзельніка знешнеэканамічнай дзейнасці». Цяпер гэты статус пралангіраваны, што накладвае вялікую адказнасць за прадпрыемства.

За 17 гадоў работы СТАА «Марко» інвеставала ў развіццё сваіх вытворчасцяў значныя фінансавыя сродкі. Агульная сума інвестыцый перавысіла 30 мільёнаў долараў.

Сёння з канвеера СТАА «Марко» павінна сысці 20-мільённая пара абутку! Так трымаць!

Штогод «Марко» рыхтуе дзве асноўныя калекцыі («вясна-лета», «восень-зіма»)

Цяпер у калекцыі кампаніі «восень-зіма 2008/2009» асартымент абутку «Марко» значна пашыраны і па колеравай гаме, і па матэрыялах, і па мадэльным радзе. Сезонная калекцыя абутку «Марко» стала настолькі вялікай і разнастайнай, што кампанія прыняла рашэнне раздзяліць абутак «Марко» на лініі: Marko-collection, Marko-sport, Marko-boots, Home-Marko, San-marko.

• **Marko-collection** — вызначальныя рысы гэтай лініі — лёгкасць, камфортнасць, надзейная якасць, універсальнасць, гарманічны дызайн і адпаведнасць сучасным тэндэнцыям моды. Перфарацыя, арыгінальныя прадзержкі, спражкі, фігурныя скураныя ўстаўкі ў спалучэнні з мноствам дэкаратыўных строчак, выкананых у кантрасце з тонам верху, выгадна падкрэсліваюць дэталі крою. Модны дэкор, несумненна, зробіць мадэлі лініі «Marko-collection» хітамі продажаў.

• **Marko-boots** — надзейная абарона ў непагадзь, клопат аб зручнасці і камфорце вашых ног. Абутак гэтай лінейкі валодае функцыянальнымі і якаснымі характарыстыкамі, аналагічныя замежным таварам-канкурэнтам, але больш танная па цане.

• **Marko-sport** — гэта не спецыялізаваны спартыўны абутак, а абутак для тых, у каго ў душы жыве спорт.

Калі ў рытме сучаснага жыцця ў вас не хапае часу, каб наведаць спартзалу, ці адчуванне лёгкасці пасля заняткаў спортам вы хочаце ўнесці ў паўсядзённае жыццё, тады абутак «Марко-спорт» для вас! Дзякуючы гібкасці і зручнасці гэтага абутку вы адчуеце сябе маладым, авангардным, а стыль і якасць матэрыялаў, нечакана кантрасныя рашэнні мадэляў «Марко-спорт» падкрэсляць вашу індывідуальнасць. Пакупнікі калекцыі «маркаўскага» спартыўнага абутку паспяховыя, незалежныя, упэўненыя ў сабе людзі, якія маюць высокае пачуццё свабоды.

• **Home-Marko** — гэты абутак створаны для таго, каб дарыць утульнасць, цяпло і камфорт сваім пакупнікам.

• **San-marko** — гэта шырокая лінейка школьнага асартыменту. Камфорт і бяспечнасць — вось асноўныя крытэрыі дзіцячага абутку, бо ўсе канструкцыі дзіцячага абутку зроблены ў адпаведнасці з анатамічнай пабудовай дзіцячай ступні.

СТАА «Марко» — больш чым абутковае прадпрыемства. Гэта своеасаблівы холдынг, у склад якога ўваходзяць пяць прадпрыемстваў.

СТАА «Сан Марко»

Слова «сан» у еўрапейскіх мовах перакладаецца як «святы» ці як «сын». Відавочна, што апошні пераклад найбольш дакладна адлюстроўвае сутнасць дзейнасці даччынай фірмы, якая ўтварылася ў 2003 годзе. Як-ніяк, тут акрамя «даросламу» мужчынскага і жаночага абутку вырабляецца дзіцячы і падлеткавы асартымент. Акрамя традыцыйнай камфортнасці і бяспекі — асноўных крытэрыяў дзіцячага абутку — тут шмат увагі надаюць колеру, дэкаратыўнаму аздабленню. Нездарма на «Сан Марко» ў жарт гавораць, што прадпрыемства выпускае такі абутак, побач з якім цьмянее нават вясёлка.

Фармоўшчык Раіса ВЫСАКОЎСКАЯ

Фірменны магазін «МАРКО» ў Віцебску на вуліцы Талстога, 5. Загадчыцу магазіна Наталлю БАДРЫЦКУЮ і прадаўца Вольгу ПАРФЁНАВУ фотааб'ектыў убачыў у зале мужчынскага абутку. Новыя мадэлі партфеляў з натуральнай скуры дэманструе прадавец Вікторыя ЦІШУЦІНА.

Фірменны гандаль СТАА «Марко» не толькі гонар прадпрыемства, але і неад'емная частка бізнэсу.

Фірменныя магазіны СТАА «Марко»:

• Гандлёвы дом «Марко-Стыль», вул. Талстога, 5, тэл. (+375-212) 37-63-80

• Гандлёвы дом «Марко», вул. Чарняхоўскага, 10, тэл. (+375-212) 22-78-00

• цэнтр абутку «Марко», пр-т Людніка ва, 16, тэл. (+375-212) 24-09-70

• магазін-салон «Марко», пр-т Маскоўскі, 8, тэл. (+375-212) 27-71-42

• павільён «Марко», Смаленскі рынак, тэл. (+375-212) 36-58-21;

г. Мінск

• вул. Казлова, 2, тэл. (+375-17) 2-849-154

• вул. Кашавога, 35, тэл. (+375-17) 2-307-303

• вул. Чкалава, 35, тэл. (+375-17) 2-190-297

• пр-т Незалежнасці, 43, тэл. (+375-17) 2-847-992

г. Бабруйск

• вул. Мінская, 15, тэл. (+375-17) 58-03-91

г. Полацк

• вул. Камуністычная, 28, тэл (+375-2144) 4-56-66

г. Наваполацк

• вул. Маладзёжная, 71, тэл. (+3752145) 3-24-88

г. Брэст

• пр-т Маскоўскі, 332, тэл. (+375-162) 42-45-01

• пр-т Машэрава, 39, тэл. (+375-162) 20-30-05

г. Гомель

• вул. Перамогі, 16, тэл. (+375-232) 77-63-66

г. Жлобін

• Мікраграён-1, 1, тэл. (+375-2334) 5-07-91

г. Магілёў

• вул. Ціміразеўская, 36, тэл. (+375-222) 32-75-95

• вул. Першамайская, 40, тэл. (+375-222) 28-74-90

г. Маладзечна

• вул. Б. Хмяльніцкага, 22А, тэл. (+375-1773) 5-35-97

г. Орша

• вул. Леніна, 23, тэл. (+375-2162) 1-16-42

г. Светлагорск

• м-н Першамайскі, 3А, тэл. (+375-2342) 2-31-33

г. Салігорск

• вул. Казлова, 26А, тэл. (+375-1710) 5-05-26

г. Баранавічы

• вул. Савецкая, 105А, тэл. (+375-0163) 41-03-84).

З гісторыі

Прадпрыемства «Марко» заснавана ў 1991 годзе як прыватная кампанія. Праўда, абутковую спецыялізацыю — вытворчасць высакаякаснага абутку з натуральнай скуры на падэшве з поліўрэтанавых кампазіцыйных матэрыялаў — фірма набыла толькі праз два гады. Не дзіўна, што ўжо першыя мадэлі аб'ядналі ў сабе камфорт, зручнасць, значны тэрмін эксплуатацыі і знешнюю прывабнасць.

Спатрэбілася ўсяго некалькі гадоў, каб у вытворчасць былі запушчаны дзіцячыя і падлеткавыя мадэлі. А калі ў 1997 годзе быў асвоены клеявы метад мацавання, мадэльныя мужчынскія і жаночыя туфлі «Марко» прыйшліся даспадобы многім моднікам і модніцам.

Сёння асноўная дзейнасць кампаніі — выраб і рэалізацыя скуранога абутку мужчынскага, жаночага і дзіцячага асартыменту.

За перыяд з 1994 года выпуск абутку павялічыўся амаль у 15 разоў і ў 2008 годзе, калі прадпрыемства асвоіла новыя вытворчыя плошчы абутковай фабрыкі «Чырвоны Кастрычнік», павінен скласці каля 3 мільёнаў пар. Адметна, што менавіта сёння з заводскага канвеера павінна сысці 20-мільённая пара абутку. Папярэднім знакавым перыядам для прадпрыемства стаў люты 2006 года, калі свет убачыла 15-мільённая пара чаравікаў.

Абнаўляльнасць мадэльнага раду ў год складае прыкладна 85 працэнтаў. За гэты перыяд мастакі-мадэльеры распрацоўваюць каля 1000 мадэляў, з якіх прыкладна палова запускаецца ў вытворчасць.

За тры пяцігодкі прафесійнай дзейнасці на абутковым рынку Беларусі і за яе межамі брэнд «Марко» заваяваў трывалыя пазіцыі. Галоўная перавага абутку «Марко» — лёгкасць, трываласць, камфортнасць, надзейнасць, гарманічны дызайн і адпаведнасць сучасным тэндэнцыям.

— Такі модны і практычны абутак мы прапануем да халоднага сезона, — кажа старшы майстар Аксана АНДРЭЕВА

СТАА «Марко»: 15 гадоў на абутковым рынку

• 1991 год — арганізавана фірма «ЛМ+МК». Пачаўшы як гандлёва-закупачная кампанія, яна хутка пачала развівацца як вытворчая фірма;

• 1993 год — уведзена лінія па вытворчасці мужчынскага абутку з натуральнай скуры на поліўрэтанавай падэшве;

• 1995 год (4 лістапада) — упершыню на «Марко» сталі выпускаць падлеткавы і дзіцячы абутак;

• 1996 год (красавік) — выпушчаны першы мільён пар абутку з таварным знакам «Марко»;

• 1996 год — створана ТАА «Марко-Сэрвіс»;

• 1997 год — асвоены клеявы метад мацавання, што дазволіла «Марко» пачаць вытворчасць жаночага мадэльнага абутку;

• 1997 год (люты) — адкрылася ПУВП «ВітМа». На прадпрыемстве пачалася вытворчасць аксесуараў: сумак, кашалькоў, паясоў, рамянёў;

• 1999 год (лістапад) — зарэгістравана сумеснае беларуска-германскае прадпрыемства «Вікоп-Фагус», якое не мае аналагаў у Беларусі. На гэтым прадпрыемстве наладжаны выпуск абутковых калодак;

• 2003 год (красавік) — з канвеера СТАА «Марко» сышла 10-мільённая пара абутку;

• 2003 год (ліпень) — адкрылася СТАА «Сан-Марко»;

• 2003 год — асвоены новы від зімовага абутку тыпу «унты», у якіх сучасныя модныя тэндэнцыі ўдала зліліся з традыцыйнымі для паўночных раёнаў матывамі;

• 2005 год (сакавік) — пачалася вытворчасць спартыўнага і прагулачнага абутку «Марко-спорт»;

• 2005 год (ліпень) — у продаж паступіла піва «Николаевское», выпушчанае на СТАА «Дзвінскі бровар»;

• 2006 год (люты) — на СТАА «Марко» выпушчана 15-мільённая пара абутку.

• 2007 год — прадпрыемства сертыфікавала вытворчасць на адпаведнасці сістэме якасці ISO-9001;

• 2008 год — СТАА «Марко» асвоіла вытворчыя плошчы на фабрыцы «Чырвоны Кастрычнік»;

• 2008 год (жнівень) — пачатак будаўніцтва новых гандлёвых плошчаў у Віцебску;

• 2008 год (9 кастрычніка) — з канвеера прадпрыемства сышла 20-мільённая пара абутку.

Прыватнае ўнітарнае вытворчае прадпрыемства «ВІТМА»

Вядома, што модны стыль стварае не толькі добры модны абутак, але і спадарожнікі-аксесуары. Не дзіўна, што на «Марко» была звернута ўвага на скургалантарэйныя вырабы.

Усё пачыналася ў 1996 годзе. На прадпрыемстве «ВІТМА» пачалі перапрацоўваць адходы асноўнай абутковай вытворчасці і шыць з іх партаманеты, футляры для ачкоў і іншую дробязь. Чарговым этапам развіцця даччынага прадпрыемства стаў выраб скураных сумак. За аснову вытворчасці былі ўзяты апошнія італьянскія тэхналогіі. А каб задаволіць патрэбы асноўнай вытворчасці ў камплектуючых, на прадпрыемстве «ВІТМА» была ўведзена лінія пашыву загатовак верху абутку.

Усе віды абутку, выпушчаныя на СТАА «Марко», маюць сертыфікаты адпаведнасці патрабаванням Нацыянальнай сістэмы сертыфікацыі Рэспублікі Беларусь і Дзяржстандарта Расійскай Федэрацыі. У 2007 годзе прадпрыемства сертыфікавала вытворчасць на адпаведнасці сістэме якасці ISO-9001.

За 2008 год праз фірменную гандлёвую сетку мяркуецца рэалізаваць каля мільёна пар абутку

Аператар ЭВМ Вераніка ШЭДЗЬКА.

Дзіцячы абутак для восені і зімы збірае Антаніна ГУРТАВАЯ.

Рабочае месца зборшчыка абутку Алега КОЛАСАВА насычана прыстасаваннямі для кіравання складанай аўтаматызаванай лініяй.

ТАА «Марко-Сэрвіс»

Першы ўласны магазін кампаніі «Марко» з'явіўся ў 1994 годзе. Ён поўнасцю апраўдаў надзеі кіраўніцтва «Марко»: штодзённыя кантакты з пакупнікамі, змяненне попыту на тую ці іншую мадэль, штодзень «жывыя» грошы, якія ідуць на развіццё вытворчасці. Дзякуючы гэтым фактарам вытворчасць абутку на прадпрыемстве «Марко» набыла неабходную гібкасць, фінансавую ўстойлівасць, а самае галоўнае — высокую папулярнасць сярод пакупнікоў. Развіваць брэнд «Марко» «на людзях» было даручана новаму прадпрыемству «Марко-сэрвіс», якое ўжо паспяхова праіснавала 12 гадоў. Цяпер ТАА «Марко-сэрвіс» уключае ў сябе 25 фірменных магазінаў і здзяйсняе транспартнае абслугоўванне прадпрыемстваў «Марко». Аўтапарк ТАА «Марко-сэрвіс» налічвае каля 40 грузавых і легкавых аўтамабіляў.

Фірменныя магазіны СТАА «Марко» размешчаныя ва ўсіх абласных і буйных раённых гарадах Беларусі. Толькі ў сталіцы іх чатыры, якія адкрыліся крыху больш чым за год.

У перспектыве «Марко» збіраецца ахапіць сваёй фірменнай сеткай усе беларускія гарады з колькасцю насельніцтва звыш 20 тысяч чалавек.

Магазіны «Марко» добра вядомыя і жыхарам Расіі. У Маскве працуюць 3 фірменныя гандлёвыя аб'екты.

Фірменныя магазіны «Марко» — непасрэдныя ўдзельнікі рэкламных акцый і арганізатары шматлікіх выстаў-продажаў.

Эканаміст Таццяна СКОБАВА неаднойчы бывала ў маляўнічых мясцінах, дзе знаходзіцца база адпачынку калектыву прадпрыемства.

Сёння «Марко» — гэта сплаў дзелавых ідэй, перадавой думкі і творчай фантазіі. Стаць паспяховым брэндам няпроста, і на сёння спажыўцы цэняць брэнд «Марко», а «Марко», у сваю чаргу, даражыць даверам сваіх пакупнікоў, іх эмацыянальным стаўленнем да гэтай маркі.

СТАА «Дзвінскі бровар»

У знакамітым Законе аб чысціні піва «Reiheitsgebot», выдадзеным ў Германіі яшчэ ў 1516 годзе, сказана, што «піва павінна ўтрымліваць толькі тры кампаненты: ваду, солад і хмель». Для прадпрыемства «Марко» Закон аб чысціні піва стаў такім жа абавязковым, як і для нямецкіх піваварaў.

Піваварaнае прадпрыемства «Дзвінскі бровар» пачало сваю гісторыю ў 2004 годзе, калі на тэрыторыі колішняга прадпрыемства «Віцебскае піва» пачалося будаўніцтва новай вытворчасці. Годам пазней аматары пеністага напітку змаглі па заслугах ацаніць піва «Николаевское». Яго галоўнае адрозненне ад іншых марак у тым, што зварана па арыгінальнай рэцэптуры, якая на працягу многіх стагоддзяў прыносіла поспех і перавагу баварскім піваварам.

Сёння «Дзвінскі бровар» — гэта:

• вада з уласнай 54-метровай свідравіны, якая прайшла праз спецыяльную шматступеньчатую сістэму ачысткі;

• хмель і солад, якія адпавядаюць патрабаванням нямецкіх піваварaў;

• вытворчасць пад кантролем нямецкіх піваварaў;

• уласныя піўныя рэстараны.

«Мікалаеўскі хутарок» — месца ў Віцебску, дзе любяць бываць многія аматары свежага фірменнага піва, смачна згатаваных страў і добрай музыкі.

УНН 300237279
Матэрыялы рэкламна-інфармацыйнай старонкі падрыхтаваў Уладзімір ЗДАНОВІЧ. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Мікалай МАРТЫНАЎ, генеральны дырэктар СТАА «Марко»:

«У НАШЫМ БІЗНЭСЕ ПАТРЭБНА СПАЛУЧЭННЕ ЭКАНАМІЧНАГА РАЗЛІКУ, АДПАВЕДНАСЦЬ МОДЗЕ І ДАСТУПНАСЦЬ У ЦАНЕ»

Даўно адзначана, што роля асобы ў гісторыі можа быць даволі значнай, а часам і ключавой. Фігура кіраўніка сумеснага беларуска-германскага таварыства з абмежаванай адказнасцю «Марко» Мікалая Мартынава для прадпрыемства — якраз той выпадак. Вось ужо на працягу 17 гадоў ён аднаасобна ўзначальвае перадавое ў краіне абутковае прадпрыемства, штогод прыўносячы ў гэты бізнэс свежыя модныя цячэнні і новыя ўзоры прадукцыі «а-ля Заходняя Еўропа». Без сумненняў, знойдзецца нямала людзей, у тым ліку і ад бізнэсу, якія ўпэўнены, што феномен паспяховасці Мікалая Мартынава закладзены ў ім самім. На Захадзе гэта мілагучна называецца Self made man. У нашай «транскрыпцыі» — чалавек, які зрабіў сябе сам. Хто ж ён, Мікалай Мартынаў? Сёння карэспандэнт «Звязды» знаёміць з ім сваіх чытачоў.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Мікалай Васільевіч, гэты год для прадпрыемства «Марко», хоць не юбілейны, але знакавы: сёння з заводскага канвеера сыходзіць 20-мільённая пара абутку. З гэтай нагоды вам не закраліся ў галаву словы з папулярнага шлягера «ты помніш як усё пачыналася?..»

— Сказаць, што я не памятаю, як пачынала сваю дзейнасць фірма «Марко» — значыць, пакрывіць душой. Таму, адказваючы коратка на ваша пытанне, перафразаванае з песні расійскага гурта «Машына часу», скажу: вядома ж, памятаю. Ды і ці можа быць інакш? Колькі часу патрачана і ўкладзена сілаў, каб знайсці сябе ў жыцці, стаць на ногі і ў рэшце рэшт набыць на айчынным і замежных абутковых рынках належную вагу...

—...з пастаяннымі імкненнямі да лідарства?

— А па-іншаму і нельга. Не мной прыдумана, што «калі ўзяўся за гуж, то не кажы, што нядуж». Можна сказаць, што як прадпрымальнік я фарміраваўся кіруючыся менавіта народнай мудрасцю. Думаю, што такі шлях і ў іншай дзелавой эліты нашага грамадства. Хоць чаго хаваць: дарога на вытворчы алімп не ўсеяна ружамі. Пакуль дабярэшся наверх — наб'еш сабе нямала шышак і сінякоў.

— На ваш погляд, бізнэс-асяроддзе сёння стала іншым, чым тады, калі вы пачыналі?

— Горш не стала — гэта дакладна. Вядома ж, у кожнага дзелавога чалавека, які выстраіў свае планы ў бізнэсе, свае погляды на праблемы ў гэтай сферы. Я маю на ўвазе заканадаўства ў мытнай сферы, у падаткаабкладанні, банкаўскай дзейнасці і г.д. Праўда, а хто сказаў, што будзе лёгка?

— Мікалай Васільевіч, не сакрэт, што наваспечаны бізнэсмен, ён жа кіраўнік прадпрыемства, рана ці позна сутыкаецца з праблемай, што вырабіць нават высакаякасны тавар — гэта яшчэ паўсправы. Трэба яго яшчэ выгадна прадаць.

— У гэтым і ёсць «цвік праблемы». Хоць кожны з нас яшчэ са школьных часоў вучыў закон капіталізму: грошы-тавар-грошы. Безумоўна, што ў савецкія часы, калі мне давялося рабіць няпросты выбар у рэгістрацыі фірмы «Марко», мы маглі не зусім адэкватна ўспрымаць гэты, здавалася б, элементарны выраз, які «адшліфавала» само жыццё. Нам думалася, што ён тычыцца не інакш як паслядоўнікаў «дзядзькі Сэма» ці «ўладальнікаў заводаў, газет, пароходаў». Але ж гэты закон аказаўся аднолькавым і для прадстаўнікоў постсавецкай прасторы. Пэўна, што прадпрымальнікам новай фармацыі псіхалагічна прасцей прыстасавацца да рынкавых умоў, бо малады чалавек ці жанчына ўжо ведаюць усе «вузкія месцы» буйнога, сярэдняга альбо малога бізнэсу. Хоць, як і раней, кожнаму з іх даводзіцца разлічваць у першую чаргу на свае сілы і магчымасці.

— Летась вы адзначылі свой 50-гадовы юбілей. Сёння можна сказаць, што ў спадара Мартынава нешта змянілася ў душы, у яго зменіліся погляды на вядзенне бізнэсу, ён пачаў часцей заглядваць у свой пашпарт?

— Ведаеце, што ў 19 гадоў, што ў 51 год — амаль ніякай розніцы для сябе, акрамя ўзросту паводле пашпарта, не адчуваю. Унутры я застаюся тым жа чалавекам, калі працаваў на «Белвесце», потым пачынаў сваю справу прадпрымальніка. Толькі са значна большым жыццёвым вопытам. Адно скажу дакладна — работы на вытворчасці стала намнога болей, і каб усюды паспець, даволі часта даводзіцца ахвяраваць сваімі выхаднымі і паўнацэнным адпачынкам.

— Як ваша сённяшняе дзецішча — СТАА «Марко» — выглядае ў лічбах?

— Адкажу не толькі арыфметычна, але і дазволю сабе крыху «лірыкі». Я ўжо сказаў, што цяпер не праблема вырабіць абутак. Дык вось мы стараемся вырасці ў колькасных аб'ёмах. З гэтай прычыны выкупілі новыя вытворчыя плошчы на Віцебскай абутковай фабрыцы «Чырвоны Кастрычнік», на якіх штогод мяркуецца выпускаць 500—700 тысяч высакаякаснага абутку. У агульным аб'ёме штогадовы выпуск павінен дасягнуць каля 3 мільёнаў пар. Пэўна, што гэта вельмі «добрая» лічба. Як гэты вялікі «паток» своечасова рэалізаваць? Дзякуй Богу, што ў нас наладжаны цесныя сувязі з многімі нашымі партнёрамі, у тым ліку і расійскімі. Як вынік — прыкладна 55 працэнтаў выпускаемага абутку рэалізуецца ў Расіі, дзе попыт на гэтую прадукцыю не стаў меншым. Астатняя частка абуткоага «пірага» прадаецца на ўнутраным рынку, у тым ліку і ў нашых фірменных магазінах.

— Значнае павелічэнне аб'ёмаў не выкліча праблем збыту на рынках збыту, дзе брэнд «Марко» мае сваю долю?

— Гарантаваць гэтага не бяруся, хоць мы прадбачым магчымую сітуацыю, таму, як кажуць, гуляем на апераджэнне. Так, са жніўня гэтага года ў Віцебску пачалося будаўніцтва новых гандлёвых плошчаў пад прадукцыю «Марко». Свае дзверы яны павінны расчыніць прыкладна праз два гады.

— А што з Расіяй? Там, кажуць, без «адкатаў» ніводнае сур'ёзнае пытанне не вырашыць?

— Так, там існуюць свае правілы гульні, што зусім не дзіўна: расійскі рынак, асабліва сталічнага і прысталічнага рэгіёнаў, надзвычай ёмкі і плацежаздольны, таму некаторыя хочуць на яго прарвацца любым шляхам, у тым ліку, як вы кажаце, і зацікавіць матэрыяльна каго трэба. У нас іншы шлях. Некалькі гандлёвых пунктаў прадпрыемства «Марко» ў Маскве ўжо мае. Цяпер вядзецца работа па далейшым прасоўванні нашай прадукцыі на Усход. Не так даўно ў нас у гасцях была дэлегацыя з расійскай сталіцы наконт гэтага пытання. Сустрэча аказалася даволі плённай: ідзе апрацоўка пададзеных намі дакументаў. За восень мы павінны атрымаць дазвол на будаўніцтва вялікага гандлёвага цэнтра ў Маскве на 9000 квадратных метраў, і ў 2009 годзе пачаць рэалізацыю ўказанага праекта.

— Трэба меркаваць, што выпуск 3 мільёнаў пар абутку ў год — гэта не мяжа?

— Нельга зрабіць дзясяты крок, не зрабіўшы першы. Пажывём — пабачым. Праўда, каб вам і чытачам газеты не здалося, што на СТАА «Марко» ўсё толькі ў ружовым колеры — скажу наступнае. Сёння вельмі многае залежыць не толькі ад матэрыяльна-тэхнічнай і сыравіннай базы прадпрыемства, але і ад падбору неабходных спецыялістаў.

— Крылаты выраз савецкіх часоў — «кадры вырашаюць усё» набывае новае жыццё?

— Мяркую, што ваша пытанне без падтэксту, бо праблема забеспячэння кваліфікаванымі спецыялістамі нашай галіны, а значыць і прадпрыемства «Марко», даволі сур'ёзнае. І прычын я бачу некалькі. Па-першае, мне здаецца, што наша Міністэрства адукацыі «перастаралася» ва ўмовах паступленняў для абітурыентаў, якія хочуць пачаць сваю працоўную дзейнасць у лёгкай прамысловасці з прыцэлам працы на тым СТАА «Марко». Для вельмі вялікай колькасці маладых людзей з-за надзвычай высокіх патрабаванняў падчас тэсціравання-экзаменаў мара аб беларускім студэнцтве аказваецца нязбыўнай, у выніку чаго юнакі і дзяўчаты знаходзяць сабе месца навучання ў Расіі, напрыклад, у Смаленску: там умовы паступлення ў ВНУ прасцейшыя на парадак. Як вынік, беларускія «расіяне» з дыпломам аб вышэйшай адукацыі «асядаюць» па ўсёй Расіі ці могуць адправіцца на заробкі ў той жа Кітай. Дарэчы, кітайцы з задавальненнем пераманілі да сябе і многіх нашых спецыялістаў.

— Лепшымі ўмовамі работы і заробкамі?

— Не думаю, што там лепшыя ўмовы работы, чым на «Марко». А пра заробкі я казаць не буду, бо не ведаю. Пэўна, што многім «маркаўцам» захацелася не толькі «доўгага рубля», але і ўсходняй экзотыкі. У гэтай сітуацыі мне зноў бачацца хібы ў нашым заканадаўстве. Зразумела, што дзяржава павінна на першае месца ставіць чалавека, яго патрэбы і запыты. Тым не менш адпаведным чынам павінна рэгулявацца і «міграцыя» асабліва падрыхтаваных спецыялістаў за мяжу. Атрымліваецца, што за 2-3 гады работнік на прадпрыемстве «Марко» стаў сапраўдным прафесіяналам. У яго яшчэ не закончваецца кантракт, а ён ужо ручкай памахаў. Калі б пры разрыве кантракта чалавек альбо фірма, куды ён наймаецца, заплаціл яшчэ няўстойку за навучанне, выплачаныя прэміі, пад'ёмныя — тады, калі ласка, у добры шлях. Наколькі я ведаю, у сусветнай практыцы пры «пераманьванні» супрацоўніка з адной фірмы на другую, заўсёды верхавенствуе прыстойнасць і этыка, і працуе сістэма матэрыяльнай кампенсацыі. На мой погляд, калі ў кожнай галіне мы будзем праводзіць хоць крыху няправільную палітыку, то будзем мець адпаведны плён.

— Няўжо ў вас яшчэ нешта на душы набалела?

— На жаль, так. Возьмем той жа «Славянскі базар» у Віцебску. Калі, пачынаючы з 2008 года, мы не будзем прыслухоўвацца да дзеячаў культуры і мастацтваў, то гэтае міжнароднае свята песні праз тры гады пераўтворыцца ў паказ магчымасцяў нашых сілавых структур. Сёлета я гэта адчуў на сабе: цябе пастаянна абшукваюць, забараняюць праносіць нават адкрытую ваду ў пластыкавай бутэльцы. Ніхто не спрачаецца, што бяспека для кожнага з нас патрэбна — за гэта мы плацім немалыя падаткі ў дзяржказну. Але не хаатычная, якая можа прынізіць гонар і годнасць простага грамадзяніна, а выстраеная ад першага кроку і да апошняга. Каб сумленны чалавек адчуваў сябе і камфортна, і бяспечна. Па прыклад далёка хадзіць не будзем. У пачатку лета ў Швейцарыі і Аўстрыі прайшоў фінал чэмпіянату Еўропы па футболе. Народу там было паболей, чым у Віцебску, але ж футбольныя балельшчыкі пасля кантактаў з паліцыяй і мясцовымі спецслужбамі адчувалі сябе і свабоднымі, і ў бяспецы.

— Мікалай Васільевіч, напэўна, вам будзе на чым засяродзіць увагу сваіх калег-парламентарыяў у Савеце Рэспублікі...

— Думаю, што работа ў беларускім парламенце дапамагла вырашыць многія пытанні і праблемы, якія сёння спадарожнічаюць айчынным вытворцам вялікага, сярэдняга і малога бізнэсу. Але ж, паверце, законы можна выконваць па-рознаму. На жаль, яшчэ не выйшла з ужытку адна народная прымаўка пра тое, што можна разбіць лоб, пакуль цябе навучаць маліцца.

— Калі вярнуцца да пачатку нашай размовы, то можна зрабіць адназначную выснову: СТАА «Марко» — бясспрэчны лідар на айчынным абутковым рынку. Напэўна, быць «наперадзе планеты ўсёй» да многага абавязвае?

— Калі ты лідар — а абутак «Марко», які разлічаны на сярэдні клас, займае каля 15 працэнтаў беларускага рынку, то груз адказнасці, вядома ж, цісне. Тым не менш, нават без сённяшніх пазіцый мы заўсёды імкнуліся вырабляць якасную, недарагую і функцыянальную прадукцыю. Увогуле ў нашым бізнэсе патрэбна спалучэнне эканамічнага разліку, адпаведнасць апошнім модным павевам і даступнасць у цане. Як гэта ні банальна гучыць, але хочаш развівацца — трэба крочыць у нагу з часам. Гэта значыць праваноўваць тое, што менавіта сёння і зараз патрэбна пакупніку. Прыемна, што СТАА «Марко» на працягу многіх гадоў рабіць гэта ўдаецца.

— Мікалай Васільевіч, ваша прадпрыемства сярод мноства мецэнацкіх захадаў падтрымлівае айчынную культуру...

— Цікава, да чаго вы хіліце?

— Пры добрым настроі, як сёння, вы маглі заспяваць, напрыклад, пад караоке? Як-ніяк, 20-мільённая пара абутку ўжо на канвееры.

— Безумоўна, пад добры настрой і ў добрай кампаніі можна і заспяваць. Праўда, у гэтай справе важна ведаць меру. Памятаеце байку пра страказу і мурашку. Галоўнае, «лето красное не пропеть», а то канкурэнты памахаюць табе ручкай. Таму са спевамі пакуль пачакаю.

Гутарыў
Уладзімір ЗДАНОВІЧ,
г. Віцебск.

Утерянные филиалом Белгосстраха по г. Минску **бланки страховых полисов** по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу **серии БЛ номера 382845 — 382847 и номера 591706 — 591709 считать недействительными**.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

на право заключения договора аренды земельного участка для размещения объекта строительства

Наименование предмета аукциона	**Право заключения договора аренды земельных участков для строительства транспортно-логистического центра**
Арендодатель земельных участков	Пинский городской исполнительный комитет, Брестская область, г. Пинск, ул. Днепровской флотилии, д. 21. Тел. 8(01653) 353881
Адрес земельных участков/ Кадастровый номер земельных участков	Брестская область, г. Пинск, ул. Достоевского, 14 земельный участок № 1 – № 144500000005000448 / земельный участок № 2 – № 144500000005000449
Размер (площадь) земельных участков, га	16,2465 в т.ч. земельный участок № 1 – 3,4121 га / в т.ч. земельный участок № 2 – 12,8344 га
Срок аренды земельных участков, лет	99
Целевое назначение земельного участка	для строительства транспортно-логистического центра
Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций и сооружений	Участки свободны от строений, сооружений, мелиоративных каналов. Подъезд к участкам предусматривается по существующей уличной сети, также к земельным участкам имеется железнодорожный подъезд. На земельном участке № 1 имеются ограничения в использовании земель напряжением 10 кВт на площади 0,6848 га, на земельном участке № 2 в охранной зоне линии электропередачи напряжением 10 кВт на площади 0,3360 га, в охранной зоне линии электропередачи напряжением 110 кВт на площади 1,8703 га
Начальная цена предмета аукциона, руб.	669 327 120
Размер задатка, руб.	66 932 700
Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельных участков для проведения аукциона, условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории	- внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка; - возмещение победителем аукциона: расходов, связанных с проведением аукциона и подготовкой документации, необходимой для его проведения; убытков в сумме 6 036 736 рублей, причиненных Пинскому государственному ПЛСХ производства изъятием земельных участков; потерь сельскохозяйственного производства в сумме 51120,8 тыс. руб., вызванных изъятием 7,0637 га сельскохозяйственных земель для использования их в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства, и перечисление средств на их возмещение на транзитный счет инспекции управления государственного казначейства по месту регистрации победителя аукциона, код для потерь сельскохозяйственного производства 05201; - заключение победителем аукциона с Пинским городским исполнительным комитетом договора аренды земельных участков и осуществления в 2-месячный срок после принятия решения райисполкома о передаче ему земельных участков государственной регистрации права на земельные участки; - получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения горисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года; - осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией
Организатор аукциона	***Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, д. 11. Тел. (0162) 23 44 06, 23 12 63, 20 87 85 www.brest-region.by, e-mail: fond@brest-region.by***

Аукцион состоится **14 ноября 2008 года в 11.00** по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе приглашаются юридические лица всех форм собственности и индивидуальные предприниматели. Участнику необходимо подать заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество». **Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают:** заверенные банком копии платежных поручений:

- о внесении суммы задатка на р/с 3642202530011 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538;

- о внесении специального сбора за подачу заявления на участие в аукционе в размере 4 базовых величин и платы за регистрацию участников аукциона в размере 0,5 базовой величины на р/с 3600201000015 филиал № 100 БОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 246, назначение платежа 03107, УНН 200300543, получатель платежа – финансовое управление Брестского облисполкома;

индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представитель индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;

представитель или уполномоченное должностное лицо юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представитель или уполномоченное должностное лицо иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представитель иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе индивидуальные предприниматели, представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Осмотр земельных участков на местности осуществляет арендодатель.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

Участник, ставший победителем аукциона, после проведения аукциона обязан: подписать протокол о результатах аукциона в день аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы в случае предоставления рассрочки), возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, формированием земельного участка для размещения объекта строительства, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка, после чего, но не позднее 2 рабочих дней, заключить с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договора аренды земельных участков», утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462 с учетом требований Указа Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007 г. № 667 «Об изъятии и предоставлении земельных участков».

Заявления на участие в аукционе с необходимым пакетом документов принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405 фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по рабочим дням с 9 октября 2008 г. по 10 ноября 2008 года включительно.

На конкурс апавяданняў

Адметнасць апавядання Валера Санько — настрой і інтанацыя. Настрой і інтанацыя ў святы і пад святы ўласцівыя амаль кожнаму з нас, калі мы павінны радавацца, а мы маркоцімся, падсумоўваючы пражытае.

Віктар КАЗЬКО.

Валер САНЬКО

МАРКОТНА Ў ГОРАДЗЕ ЎРАЧЫСТЫМ

Ігар Бадановіч з увагаю і стоеным, далёка захаваным болем адзінокага ўзіраўся ва ўрачыстыя святочныя вуліцы горада, упрыгожаныя сцягамі і транспарантамі, слухаў музыку, вурчэнне машын, лавіў абрыўкі звонкіх і глухаватых гутарак людзей — і ўсё болей хмурнеў. Смутак агарнуў старога душою чалавека, такі, як і ў мінулыя разы, калі быў далёка ад сяброў, аказваўся адзін у вялікім горадзе на свята.

Чым больш праходзіла часу, чым болей чужога шчасця падглядваў ён, тым спакайней, цішэй і гаротней ставала на душы глебазнаўца.

Успаміны, няпрошаныя і ў асноўным бязрадасныя, горычныя ахапілі маладога старога. Закалыхалі. Захацелася дадому, у далёкую родную вёску. У Вялікай Ігрушы прыветней. Там не будзеш праз увесь дзень панікла брысці па вуліцы. Цябе зачэпяць, што-кольвечы спытаюць, пазавуць да кампаніі. А тут ты чужак, лішніца. Бадановічу крыўдна, горка. Усплёскамі хваль паслужлівая памяць узнаўляла нярадаснае былое. Уяўлялася такая ж нярадасная і цяжкая будучыня. Ішоў, думаў. Гаротныя складкі на твары глыбелі.

У гаманкім натоўпе Бадановіч мог аддацца павевам успамінаў гэтак жа шчыра і поўна, як і на прыродзе, на адзіноце з цікімі гаямі роднай Случчыны, славутай густымі моцнымі садамі і дабрачымі працавітымі людзьмі.

Як жабраку нельга без торбы, а скрыпачу без скрыпкі, так думкамі рашучаму чалавеку, якім стаў Ігар Бадановіч, нельга заставацца без справы. Бязмэтавае трохгадзіннае сноўданне па вуліцах, калі няма звычаёвай паспешнай гарачкі — «хутчэй туды, не спазніцца да таго...» — прымусіла абвострана ўспрымаць любое пачутае слова, падгледжаную сцэну. Высвяціла нявартасць і няшчаснасць кандыдата навук. Нікому на свеце ён не трэба — ні сябрам, ні бабам.

Лепш з Ігрушаўкі ваду піць, чым са Свіслачы віно. Дарэмна ён пёрся ў бязладдзе гарадское. Калі ты адзін, чаякоў, грошай і памочнікаў-землякоў, у горадзе не толькі цяжка — млосна. Усе тут разам — і ўсе па адным. Кожны рохкае каля свайго карыта.

— Праўда і вера — сёстры, варагаваць не могуць. Шукай Бога, толькі на правільнай дарозе, — пераконваў сталага чалавека такі ж сталы. — Сэнс жыцця — спасціжэнне духу святога, а для цябе пакуль важнае — слава, грошы. Плюнь...

Тыповыя мамы вучаць неслухаў-дзетак.

Прачкі. Прагрэс цывілізацыі — цалуюцца прама перад табою. Паскудства эмансіпійнае...

Алкашы табуняцца на зручным скрыжаванні бліз крамкі. Скідваюцца на піва ці віно. «Недзе сярод іх Іван Самусевіч і Андрэй Тупік... Залатыя людзі загінуць з-за праклятага чарніла».

Звечарэла, апусцелі ад дзятвы азораныя агнямі вуліцы, аксамітавае неба стала шкляным, далёкім і халодным. Сцішаны добры Ігар Бадановіч вяртаўся назад. Чалавек ішоў па самых ціхіх вулачках. Ён стаміўся ад бязмэтнага бадзяння, прагнуў пазбыцца шуму і тлуму вялікага горада.

Кніга, прырода, музей, сімфанічны аркестр ачышчалі душу Бадановіча ў такой ступені, як і знаёмства з мудрым чалавекам, рэдкія бязмэтныя паходы па горадзе. Кожная падгледжаная сцэна вірлівага жыцця па-свойму расплюшчвала вочы.

Стома брала сваё. Бадановіч пачаў прыспешваць.

Зусім блізка раздаліся галасы, звонкія і глухія, адзінокія і суладныя. Гурма маладых рослых хлопцаў вываліла з правулка, вальяжна шыбавала па вуліцы. За імі дзвюма невялічкімі стайкамі плылі разадзетыя па апошняй модзе фасоністыя гонкія дзяўчаткі.

Адзін з хлопцаў, у цэнтры, высокі, модны, у прыгожым гарнітуры, з кучмай бялёсых валасоў з-пад надзетага набакір капялюшыка, заіграў на баяне шырокую раздольную незнаёмую песню. Усе, асабліва дзяўчаты, жартавалі, гучна смяяліся, падганялі баяніста. Спаважны ўпэўненец — чысты вясковы гарманіст па паставе трымацца — нічога не адказваў прыяцелям і прыяцелькам, ціснуў і ціснуў на планкі, як мага шырэй і весялей расцягваў мяхі. Дзве, з краю, дзяўчынкі тонкімі, ужо няломкімі галасамі завялі песню, чыстую і звонкую, заклікальную, песню-абяцанне для кожнага, хто чуе яе і разумее:

Колькі ў небе зор,
цяжка палічыць,
Толькі з іх адна найярчэй гарыць.
Гэта ты мая, зорка ясная,
Ты любоў мая, непагасная.

Голасна, шырока ўсёй гурмаю праспявалі другі куплет, трэці.

Нечакана, падавалася, без ніякага пераходу, баяніст і спевакі пераключыліся на новую песню, таксама галасістую, таксама звоністую, раздольную:

Па-над лугам зеляненькім
Брала ўдава лён драбненькі,
Яна брала, выбірала,
Тонкі голас падавала.

Вялі песню ўсе дзяўчаты, барытаніста і зычна падцягвалі хлопцы. І такі кантраст гэта быў — святочна-ўрачысты сучасны горад, модна апранутыя вясёлыя джынсавыя юнакі і дзяўчаты — і родная, да незвычайнасці мілая вясковая песня... Нешта хвалістае, любае хапліва і моцна-моцна ўхвацілася за душу Ігара Бадановіча, працяло ўсю істоту. Старыя душою чалавек стаяў і доўга пазіраў ім услед. Парыў зайздрасці да іх, маладых, вясёлых, легкадумных, паступова саступіў месца цяхаму маўклівому супакою, удзячнасці.

Баяніста і спевакоў падахвочвалі многія прахожыя — хто словам, падпевам, а хто, як Бадановіч, цёплаю ўсмешкаю, звычаннем здароўя. Спевакі бачылі гэта і пачуваліся ўпэўненцамі, шчаснеўнымі валадарамі.

Чым хутчэй блізілася спеўкая групка да праспекта з яго валам машын, джынсавымі безуважнікамі, строгімі міліцыянерамі, тым слабейшай ставала песня. Заціхала. Баяніст цягнуў мелодыю, бадзёрыўся, неўзабаве аціх і ён.

Роспач жорсткаю лапаю ахапіла зноў сэрца Бадановіча. Ніхто не забараніў песню, але і не падтрымаў. Спевакі проста адчулі халодную момантную зацікаўленасць абыякавага люду, зацікаўленасць як да дзівакоў, спевакі не пажадалі выстаўляцца шчырасцю і адкрытасцю, замоўклі. Нават рэплікавацца цішэй сталі.

Старыя і пажылыя азіраліся на спевакоў, маўчалі. Толькі яны былі здольныя ацэньваць мінулае, нараканць і стагнаць пры ўзгадках пра меркаваную будучыню. Рэдкія хвалілі прошласць, гэткую ж тлумную, як сённяшні морачны дзень.

Змоўклая спеўная моладзь растварылася на шырокіх скрыжаваннях вуліц, а Бадановіч стаяў, пазіраў у той бок, думаў. Не мог маркотны пэўна акрэсліць новае, незнаёмае дасюль пачуццё, выспелае і акрэплае ў грудзях. Ведаў, яно тычыцца горада, яго модная вопраткі, сучасных прыёмнікаў, хуткіх і безуважных насельнікаў, буркатлівых пажылых і старых людзей. І не ведаў, куды яму ісці далей.

МОЙ ВЕРНЫ ЗІК

7 кастрычніка ў Магілёве адбыўся ўрачысты выпуск в'етнамскіх афіцэраў, якія навучаліся ў Кіналагічным цэнтры ўнутраных войскаў.

Падпалкоўнік Нгуэн Зуй Хань працуе ў кіналагічным цэнтры Міністэрства грамадскай бяспекі Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам. Ён паўгода таму прыехаў у Магілёў у складзе групы з дзесяці в'етнамскіх вайскоўцаў, каб навучыцца ў Беларусі новым прагрэсіўным методыкам дрэсіроўкі службовых сабак.

Кожны в'етнамец атрымаў на выхаванне маладую нямецкую аўчарку і павінен быў на практыцы прымяніць тэарэтычныя веды: навучыць сабак весці пошук і знаходзіць выбуховыя рэчывы.

Цяпер беларускія сабакі разумеюць толькі па-в'етнамску: «дын» — стаяць, «мой» — сядзець. Некаторым з аўчарак новыя гаспадары змянілі імёны: калі Ёлка і Ітака яшчэ можна вымавіць з в'етнамскім пранонсам, то Йен — абсалютна не. Таму прынамсі падпалкоўнік Хань перайменаваў Йена ў Зіка.

— Самым цяжкім у нашым навучанні аказаліся не перамена клімату і адрозны ад в'етнамскага лад жыцця ў вашай краіне, а мова, — прызнаецца Хань. — Нам дапамагалі перакладчыкі, але руская мова — неверагодна складаная.

Перакладчык Ле Чак Чэнь расказаў, што яго група за паўгода здолела асвоіць толькі самыя простыя словы на рускай мове — прывітанне, развітанне і пажаданне смачна есці. Затое ў навучанні сваёй прафесійнай справе яны выявілі зайздросную ўпартасць.

— Вось чаму нам трэба павучыцца ў в'етнамцаў, дык гэта стараннасці і руплівасці, — з павагай гаворыць начальнік кіналагічнай службы Галоўнага ўпраўлення ўнутраных войскаў Усевалад Жытнік. — Ім па дзесяць разоў нічога паўтараць не трэба: адразу ўсё запомняць і выканаюць. Таму і на нядаўнім агульнавайсковым чэмпіянаце, дзе бралі ўдзел дзесяць камандаў, в'етнамцы сталі пятымі. Гэта поспех!

Сертыфікаты аб паспяховым праходжанні вучобы ў Кіналагічным цэнтры ўручыў намеснік міністра ўнутраных спраў — камандуючы ўнутранымі войскамі МУС Валерый Гайдукевіч. Ён выказаў надзею, што в'етнамскія кінолагі па вяртанні на радзіму пакажуць высокія вынікі практычнай дзейнасці.

Усё, чаму в'етнамскія афіцэры і іх верныя сабакі навучыліся ў Беларусі, яны прадэманстравалі на плацу ў дзень выпуску. Цяжка ўявіць, што яшчэ паўгода таму аўчаркі проста цягнулі на павадках сваіх гаспадароў. В'етнамскія афіцэры ў мундзірах колеру яркай травы з чырвонымі какардамі і пагонамі, здавалася, зусім не хвалявaліся на паказальных занятках: сабакі дысцыплінавана выконвалі ўсе заданні.

Асабліва ўразіў гледчоў той самы Зік, які разам з падпалкоўнікам Ханем мусіў знайсці выбуховыя рэчывы ў людзей на масавым мерапрыемстве. І сабака без памылкі сеў каля вайскоўца, які імітаваў чалавека з «поясам шахіда» пад звычайным адзеннем.

— Самыя вялікія ўражанні ад Беларусі: мірная краіна, прыгожая прырода, добрыя людзі, — сказаў на развітанне 45-гадовы падпалкоўнік Хань, якога на радзіме чакаюць жонка і дзеці.

В'етнамскія кінолагі вернуцца дадому разам са сваімі выхаванцамі. Зік і іншыя сабакі будуць служыць грамадскай бяспецы В'етнама і стануць прыкладам для іншых.

Дарадца пасольства Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам Нгуэн Мінь Хыонг, прыемна здзіўленая поспехамі кінолагаў, паабяцала ў Магілёве, што гэта група — першая, але дакладна не апошняя. У Беларускім Кіналагічным цэнтры яшчэ будуць новыя в'етнамскія выпускі.

Ілона ІВАНОВА.

Прэзентацыі найбольш запатрабаваных адміністрацыйных працэдур размешчаны ў інтэрнэце

паведаміў карэспандэнту БЕЛТА каардынатар інфармацыйнай дзейнасці ПРААН у Беларусі Уладзіслаў Хількевіч.

«Цяпер любы грамадзянін Беларусі пры дапамозе сеткі інтэрнэт можа даведацца, куды звярнуцца для атрымання таго або іншага дазволу або даведкі, якія дакументы прадаставіць і ў якім памеры заплаціць дзяржпошліну», — сказаў субяседнік. Дарэчы, вэб-прэзентацыі некаторых адміністрацыйных працэдур, за ажыццяўленнем якіх беларусы часцей за ўсё звяртаюцца ў дзяржорганы, былі ўпершыню прадстаўлены грамадскасці 3 кастрычніка ў Кіраўску (Магілёўская вобласць) у ходзе семінара-трэнінгу «Станоўчая практыка рэгулявання адміністрацыйных працэдур у Рэспубліцы Беларусь», арганізаванага праектам Праграмы развіцця ААН.

Работа па візуалізацыі адміністрацыйных працэдур вядзецца праектам ПРААН «Садзейнічанне ўдасканаленню адміністрацыйных працэдур у Рэспубліцы Беларусь» сумесна з Акадэміяй кіравання пры Прэзідэнце Беларусі і каардынуецца Нацыянальным цэнтрам заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь. На сайце цэнтра ў раздзеле «У дапамогу грамадзянам» размешчаны прэзентацыі найбольш актуальных і запатрабаваных адміністрацыйных працэдур.

БЕЛТА.

Утерянный представительством № 3 по г. Минску Белгосстраха **бланк квитанции** о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) **формы 1 СУ, серия ГС № 8496167 считать недействительным.**

Замор'е

СМЕШНА

АБ СУР'ЁЗНЫМ

10 САМЫХ ЗАБАЎНЫХ ПАДАТКАЎ

Вось ужо 315 гадоў мінула з увядзення ў Расіі знакамітага «падатку на бараду»: Пётр I загадаў ацэньваць дваранскія бароды ў 60 рублёў, першарадныя купецкія — у 100 рублёў, радавыя гандлёвыя — у 60 рублёў і бароды халопаў — у 30. Селянін у сябе ў вёсцы насіў бараду дарам, але пры ўездзе ў горад, як і пры выездзе, плаціў за яе 1 капейку.

Вашай увазе самыя вядомыя ў гісторыі чалавецтва забаўныя падаткі.

10-е месца. Яшчэ адно вынаходства Пятра — падатак на лазні. Паводле ўказа 1704 г., думныя людзі і першарадныя купцы павінны былі плаціць з хатніх лазняў па 3 рублі, простыя дваране, купцы і ўсякія разначынцы — па рублю, сяляне — па 15 капеек. Або плаці — або не мыйся.

9-е месца. Рымскі імператар Веспасіян, які правіў у 70-х гадах нашай эры, увёў падатак на прыбіральні. Менавіта з таго часу існуе выраз «Грошы не пахнуць». Калі сын Веспасіяна папракнуў бацьку ў тым, што ён увёў падатак на грамадскія прыбіральні, той паднёс да яго носа грошы, якія паступілі па гэтым падатку. На жаль, для рымлян — яны не змаглі адмовіць сабе ў задавальненні карыстацца шыкоўнымі мармуровымі прыбіральнямі, паколькі туды, як і ў знакамітыя тэрмы, хадзілі не толькі па прамой патрэбе, але і дзеля сустрэч і гутарак.

8-е месца. У Бюртэмбергу ў XVIII стагоддзі бралі падатак на вераб'ёў. З гаспадара кожнага дома патрабавалі знішчаць тузін вераб'ёў, за што ён атрымліваў 6 крэйцараў. Калі ж хто быў не ў стане ўчыняць гвалт, з яго бралі падатак у памеры 12 крэйцараў. Для таго, каб ухіліцца ад выплаты гэтага падатку, жыхары куплялі патрэбную колькасць дохлых вераб'ёў у падпольнага гандляра, які даставаў іх на гарадской звалцы.

7-е месца. Падатак «на мір», які дагэтуль утрымліваюць у Гвінейскай Рэспубліцы. Кожны год без вайны там ацэньваюць у 700 бельгійскіх франкаў.

6-е месца. Самы вядомы падатак у СССР — гэта падатак на бяздзетнасць. Ён быў уведзены ў 1941 годзе з мэтай мабілізацыі дадатковых сродкаў для аказання дапамогі шматдзетным маці. Гэты падатак не мае аналагаў у гісторыі і ўтрымліваўся толькі ў СССР і Манголіі.

5-е месца. Самы вялікі падатак — 4000 працэнтаў ад сабекошту! Менавіта такім падаткам абкладалася брытанцамі ў Індыі соль.

4-е месца. У Арменіі ў канцы XX стагоддзя быў уведзены падатак на пыл. Каб пазбавіцца ад лішкаў пылу ў дварах, Міністэрства эканомікі пастанавіла: «Насельніцтва павінна аплачваць выдаткі па выдаленні пылу з разліку 2 драмы за 1 квадратны метр».

3-е месца. Падатак на цень. Ён спаганяецца ў Венецыі з 1993 года. Пад падатак патрапілі навесы і парасоны, якія належаць крамам і кафэ, цень ад якіх падае на камунальную ўласнасць — зямлю. Дарэчы, яшчэ ў Візантыі плацілі «падатак на паветра», памер якога залежаў ад памеру будынка.

2-е месца. Падатак на сэкс. У Бельгіі ім абкладаюцца ўладальнікі вітрын, у якіх стаяць прастытуткі

ў квартале «чырвоных ліхтароў». Падатак прыносіць бюджэту каля 4 мільёнаў франкаў.

1-е месца. «Гіпсавы падатак». Яго плацяць у Аўстрыі гарналыжнікі пры кожным спуску з гары. Атрыманыя сродкі перадаюцца аўстрыйскім клінікам. Паводле статыстыкі ў Аўстрыйскіх Альпах штогод атрымліваюць траўмы каля 150 тысяч лыжнікаў, і на іх лячэнне марнуецца прыкладна адзін мільярд шылінгаў у год.

СКАРДЗІМСЯ ХОРАМ

У Германіі атрымлівае ўсё большую папулярнасць новы музычны жанр — «харавы спеў скаржнікаў». Нямецкія музыкі аб'ядноўваюцца, каб спяваць аб самых разнастайных праблемах: дрэнным надвор'і, шлюбнай няслушнасці, агідной працы камунальных службаў і недальнабачных палітыках.

Адметная асаблівасць «хораў скаржнікаў» складаецца ў тым, што трэба спяваць аб набалелым весела і мажорна. Напрыклад, у Кёльне 140 музыкаў-аматараў выступаюць прама на вуліцах, радасна апяваючы праблемы гарадскога побыту. «Хор скаржнікаў» стаў настолькі папулярны, што кёльнская філармонія зараз перыядычна запрашае «выцікаў» на сваю сцэну, і выступленні хору праходзяць з аншлагамі. Адзначаецца, што кёльнскі хор — самы шматлікі ў свеце. Творчасць калектыву пастаянна асвятляецца ў германскіх СМІ.

Першы ў міры «хор скаржнікаў» з'явіўся ў брытанскім Бірмінгеме ў 2005 годзе. Пазней такія калектывы з'явіліся ў Фінляндыі, Венгрыі, Сінгапуры, ЗША і Расіі. Часопіс Stern тлумачыць папулярнасць «жаласнага спеву» так: «Нічога дзіўнага ў гэтым няма. Немцы, мусіць, больш за ўсіх у свеце любяць паскардзіцца на жыццё».

«Я Ж ВАМ КАЗАЎ...»

Адна з самых смешных эпітафія, высечаная на магільным камені памерлага шэсць гадоў таму легендарнага брытанскага коміка Спайка Мілігана. Як чалавек пакідае гэты свет з апошнім выдыхам, сапраўдны гумарыст адыходзіць у свет іншы з апошнім сваім жартам.

Міліган памёр ад хваробы печані ў лютым 2002 года, калі яму было ўжо 83 гады. Яго пахавалі ў англійскім графстве Усходні Сасэкс у царкве Св. Томаса, непадалёк ад дома, у якім ён жыў. Аднак прыхільнікі, якія прыходзілі на яго дол, на працягу двух гадоў бачылі на ёй толькі кусты і невялікую статуэтку анёла. І толькі ў 2004 годзе яго сваякам і епархіі царквы Св. Томаса атрымалася дамовіцца аб тэксце эпітафіі на магільным камені, якую Міліган паказаў у сваім завяшчанні. Duirt me leat go raibh me breoite, напісана на помніку на гаэльскай мове — мове шатландскіх кельтаў. Што перакладаецца як «Я ж казаў вам, што хварэю».

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

ЗАКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО
«Кредэксбанк»

ул. Некрасова, 114, 220040, г. Минск, Республика Беларусь
МФО 153001273, УНП 807000030, ОКПО 37560001
Т/факс (+375 17) 287 83 21
E-mail:mail@credexbank.by
S.W.I.F.T.NOIBBY2X Телекс: 252100 NIBBY

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 1 октября 2008 г. (в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	На 1 октября 2008 г.	На 1 октября 2007 г.
1	2	3	4	5	6
1	АКТИВЫ				
2	Денежные средства	1101	1	409,9	0,0
3	Средства в Национальном банке	1102	2	435,1	173,1
4	Ценные бумаги:	1103		1 327,2	0,0
	для торговли	11031	3		
	удерживаемые до погашения	11032	3.1	1 327,2	0,0
	в наличии для продажи	11033	3.2		
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	4	17 617,7	23795,9
6	Кредиты клиентам	1106	5	22 030,4	578,1
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	6		
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	7	570,2	166,4
9	Прочие активы	1109	8	1 067,0	173,5
10	ИТОГО активы	110		43 457,5	24887,0
11	ОБЯЗАТЕЛЬСТВА				
12	Средства Национального банка	1202	9		
13	Кредиты и другие средства банков	1205	10	1 000,0	0,0
14	Средства клиентов	1206	11	8 996,8	6840,8
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208			
16	Прочие обязательства	1209	12	358,9	138,9
17	ВСЕГО обязательства	120		10 355,7	6979,7
18	КАПИТАЛ				
19	Уставный фонд	1211	13	24 677,5	14201,4
20	Эмиссионный доход	1212			
21	Резервный фонд	1213		3 880,9	488,7
22	Накопленная прибыль	1214	14	4 536,0	3216,3
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	15	7,4	0,9
24	Всего капитал	121		33 101,8	17907,3
25	ИТОГО обязательства и капитал	12		43 457,5	24887,0
26	ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ				
27	Требования	1301	16	32 635,1	19243,5
28	Обязательства	1302	17	27 150,7	19534,3

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ
на 1 октября 2008 г. (в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	На 1 октября 2008 г.	На 1 октября 2007 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		3 038,4	1555,0
2	Процентные расходы	2012		101,1	18,4
3	Чистые процентные доходы	201	18	2 937,3	1536,6
4	Комиссионные доходы	2021		1 766,6	727,2
5	Комиссионные расходы	2022		980,7	396,6
6	Чистые комиссионные доходы	202	19	785,9	330,6
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	20	4 387,7	2550,2
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	21	0,0	0,0
9	Доход в форме дивидендов	205		0,0	0,0
10	Чистые отчисления в резервы	206	22	9,5	0,0
11	Прочие доходы	207	23	214,2	0,0
12	Операционные расходы	208	24	3 175,3	936,5
13	Прочие расходы	209	25	237,2	44,2
14	Налог на прибыль	210		1 090,2	720,5
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		3 812,9	2716,2

И.о. генерального директора А.А. Аксеневич
Главный бухгалтер Н.П. Круглова

Лицензия на осуществление банковских операций № 19 от 28.01.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь.
УНП 807000030

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.27	18.26	10.59
Віцебск —	7.18	18.14	10.56
Магілёў —	7.17	18.16	10.59
Гомель —	7.12	18.14	11.02
Гродна —	7.42	18.41	10.59
Брэст —	7.40	18.44	11.04

Месяц

Першая квадра.
Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны

Пр. *Івана, Уладзіміра, Ціхана, Яфрэма.*
К. *Анастасіі, Арнольда, Багдана, Вінцэнта, Людвіка, Яна.*

Надвор'е на заўтра



Дзве даты

9 кастрычніка

1596 год — на Брэсцкім царкоўным саборы была прынята Брэсцкая царкоўная унія — акт аб'яднання праваслаўнай і каталіцкай цэркваў на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Беларускія і ўкраінскія праваслаўныя ўладыкі прызналі вяршэнства папы рымскага, але захавалі пры гэтым свае ранейшыя абрады. Галоўнай прычынай заключэння уніі было імкненне да кансалідацыі царкоўных і свецкіх феадалаў ВКЛ і Польшчы. Унія спыніла сваю дзейнасць у 1839 годзе.

1547 год — нарадзіўся Мігель дэ Сервантэс Сааведра, славуты іспанскі пісьменнік, «бацька» «Дон Кіхота».

Цытата дня:

«Какецтва — гэта мастацтва зрабіць першы крок так, каб мужчына думаў, што гэта ён яго зрабіў».
Андрэ Масон (1896—1985), французскі мастак.

БЯСШЛЮБНАСЦЬ

Бясшлюбнасць — стан дарослых людзей, якія пад прымусам нейкіх абставінаў ці па запавеце (клятве) ніколі не бралі шлюб. Такіх людзей у народзе звалі «старымі дзевамі» ці халасцякамі. Функцыянальна сюды таксама адносілі людзей, якія былі ў шлюбе, але страцілі сваю «другую палавіну». Бясшлюбнасць у народзе ўспрымалася як смерць. Ці не таму людзей, якія прынялі манаства, у сям'і аплаквалі, быццам памерлага?

● Сярод людзей жыла пагалоска, што пасля смерці адзінокая дзяўчына на «тым» свеце будзе жаць тры надзелы крапівы, а халасцяк будзе пасвіць казлоў.

● Адзіноці чалавек — бяда не толькі сям'і, але і ўсёй вёскі. Да адзіноких людзей ставіліся з пэўным адценнем асуджэння і спачування. Халастога чалавека лічылі непаўнацэнным (непаўнавартасным), а знычыцца, і непаўнапраўным членам грамадства. Пра гэтых людзей узгадвалі ў размове толькі адмоўна, з падкрэсленым грамадскім асуджэннем: векавуха, засядзелася ў дзеўках, стары халасцяк, дзяцюх.

● Халастых, а значыцца, і бяздзетных людзей, не прымалі ў кампаніі жанатых людзей, не запрашалі прымаць удзел у выкананні вясельных абрадаў (напрыклад, у святы або ў каравайніцы), не бралі хроснымі бацькамі.

● Пасля сарака гадоў адзінокім (нежанатым) людзям усё часцей і часцей прыходзілася ўдзельнічаць толькі ў пахавальным абрадзе.

● На працягу года былі святы, калі грамада выказвала сваё ганьбаванне той моладзі, якая не стварыла сям'ю. Так, на Каляды незамужнім дзяўчатам у хату прыцягвалі вялікае бервяно, да якога маглі прывязаць дзяўчыну на некалькі дзён. А бацькі пакорна глядзелі на ўсё, а потым павінны былі выкупіць сваё дзіця. На Масленіцу халасцякам на ногі прывязвалі драўляныя «кандалы» або калодку, якую трэба было цягнуць аж да хаты або шчодра адкупіцца. Часам хлопец ці дзяўчына ў пакаранне за сваю ўпартасць ці «пераборлівасць» павінны былі цягнуць бервяно праз усю вёску. Такія меры вырашэння праблемы лічыліся вельмі эфектыўнымі, таму што пасля гэтага ў вёсцы гулялі адразу некалькі вяселляў.

● Пасля смерці дзяўчыну, якая не ўзяла шлюб пры жыцці, сімвалічна аддавалі замуж. Яе апраналі і хавалі ў вясельным строі. Казалі, што на тым свеце яна стане «нявестай Хрыстовай».

● Бясшлюбнасць магла быць «насланай» (знахары маглі з дапамогай рытуальных дзеянняў і рэчаў забраць шлюбную долю чалавека) ці «праклятай» (калі маці наслала праклён на ўласнае дзіця).

У народнай культуры ўсходніх славян і сёння існуе шмат спецыяльных рытуальных дзеянняў, накіраваных на папярэджанне бясшлюбнасці:

● Ужо пры нараджэнні дзіцяці бацькі праграмавалі яго будучыню. Так, калі нараджалася дзяўчынка, пад парогам закапвалі яе «дзіцячае месца», каб яна своечасова пакінула бацькоўскую хату, г.зн. узяла шлюб.

● На працягу года бацькам неабходна было выконваць шэраг забаронаў і абмежаванняў. Напрыклад, для таго, каб дачка выйшла замуж у гэтым годзе, трэба было, каб на Благавешчанне ўся сям'я была дома; асабліва забаранялася запрашаць у гэты дзень да сябе старонніх дзяўчат і жанчын.

● Каб дачка хутчэй выйшла замуж, на Юр'я (6 мая) трэба было абавязкова адчыніць усе вокны і замкі.

● Каб выйсці замуж, напярэдадні свята святой вялікапакутніцы Кацярыны (7 лістапада), незамужнім дзяўчатам неабходна было прытрымлівацца строгага посту.

● Каб выйсці замуж і на будучы год зацяжарыць, незамужнія дзяўчаты на Вербніцу плялі вянок з галінак вярбы.

● Асабліва эфектыўным лічыўся абрад на парушэнне бясшлюбнасці, выкананы на Вадохрышча. Для гэтага бралі хрышчэнскую ваду, дзялілі на тры часткі і казалі пры гэтым: «Во имя Отца и Сына и Святого Духа». На ваду чыталі замову: «Беда лиха, отдай жениха рабе Божьей (имя) в супружество, к замужеству, к мягкой подушке, к брачной постели. Заведи глаза женихам, чтобы они на рабу (имя) глядели, не нагляделися, смотрели, не насмотрелися, скучали, не наскучалися. И была бы раба (имя) для них краше солнца красного, слаще меда майского. Аминь». Адной часткай трэба было напаіць дзяўчыну, другой — памыць яе, а трэцюю частку выліць за парог хаты.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Паважаных ***В.К. СЯРКО, А.М. БАРАНОЎСКУЮ, Г.Ул. ЗАХАРАВУ*** *— работнікаў РУПС-9 г. Слуцка віншую са святам Сусветнага дня пошты. Жадаю поспехаў у працы, здароўя і дабрабыту. Заставайцеся такімі ж добрасумленнымі і добразычлівымі, якімі я вас ведаю.*

З павагай Т.І. НОВІК.

Чалавек больш не будзе эвалюцыянаваць

Генетыкі з Універсітэцкага каледжа Лондана лічаць, што чалавек больш не будзе эвалюцыянаваць.

Яны звязваюць гэта з тым, што такія фактары эвалюцыі, як натуральны адбор і генетычная мутацыя, больш не адыгрываюць важнай ролі ў жыцці чалавека. Праблема сучаснай цывілізацыі ў тым, што знікаецца колькасць мужчын, якія становяцца бацькамі ва ўзросце 35 гадоў і больш. Між тым, менавіта такія мужчыны — добрыя генератары мутацый, без якіх эвалюцыя немагчымая. Пазбегнуць нараджэння дзяцей сем'ям ва ўзросце дапамагае таксама развітая ў сучасным свеце кантрацэпцыя.

Вучоныя прыйшлі да высновы: нягледзячы на тое, што хімічнае і радыеактыўнае выпраменьванне можа выклікаць мутацыі геному, гэта не асноўны фактар эвалюцыі, і праз 1 млн гадоў людзі не будуць адрозніваца ад сучасных жыхароў планеты.

Кар. БЕЛТА.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81

№ 30 (280)

КОЖНАМУ САДЖАНЦУ — СВОЙ НАХІЛ

Гэта асноўнае правіла пасадкі чорных парэчак, агрэсту, бружмелю ядомага. Для гэтых культур на дзярнова-падзолістай глебе пасадачныя ямы капаюць прыблізна аднаго памеру: шырыня 40—50 см, глыбіня 40 см. Верхні ўрадлівы слой глебы раўнамерна змешваюць з угнаеннямі і засыпаюць у яму. Ніжні слой раскідваюць паміж радкамі.

Саджанцы **агрэсту** звычайна высаджваюць прама, але гатункі са слабай і сярэдняй парастка-аднаўляльнай здольнасцю (Мускатны, Англійскі жоўты, Фінік, Маскоўскі чырвоны) — з нахілам. Гэты прыём найбольш эфектыўны на цяжкіх глебах: лепш утвараюцца прыдатачныя карані і прыкаранёвыя парасткі. Саджанцы заглыбляюць на 6—8 см. Пасля пасадкі расліны абразаюць, пакідаючы некалькі пупышак.

Пры пасадцы **чорных парэчак** расліну высаджваюць пад вугломам 45 градусаў, паглыбляючы каранёвую шыйку на 6—8 см. Карані ў яе старанна распраўляюць, пры пасадцы расліну злёгку патрэсваюць для запаўнення паветраных пустот паміж каранямі, затым засыпаюць глебай без угнаенняў. Глебу вакол саджанца асцярожна ўшчыльняюць, робяць ямку, паліваюць, потым мульчыруюць і абразаюць расліну, пакідаючы пянькі з 4-5 пупышкамі.

Бружмель ядомы высаджваюць прама і без заглыблення. Расліну пасля пасадкі не абразаюць — толькі выдаляюць зламаныя галінкі. Абразаць нельга, бо гэта затрымлівае рост і пачатак плоданашэння высаджаных кустоў.

ЦЫБУЛЯ ПАД ЗІМУ

Каб вясной атрымаць ранняе зеляніва, пасадзіце рэпчатую цыбулю ўжо ў сярэдзіне кастрычніка. Садзяць яе на градкі часта, не адступаючы адна ад адной, цыбуліны злёгку прыціскаюць і пакрываюць невялікім слоем перагною ці торфу. Калі надыходзяць устойлівыя замаразкі, можна насыпаць слой перагною (6 см) альбо пасыпаць пілавіннем. Пасяўны матэрыял адбіралі яшчэ пры ўборцы (у жніўні), прыдатныя толькі дробныя цыбуліны дыяметрам толькі да 1 см. Такія цыбуліны высаджваюць позна восенню, а інакш яны за зіму высахнуць. Астатнюю цыбулю захоўваюць пры пакаёвай тэмпературы (15—20 градусаў) у сетках ці заплятаюць у косы, перыядычна аглядваюць яе і вымаюць падсохлыя ці падгнілыя.

Цыбулю-парэй можна пакінуць зімаваць у глебе, акучыўшы і засыпаўшы торфам. Гэта дае магчымасць пры адсутнасці вялікіх маразоў выкопваць яе калі трэба. Мяккую зіму яна добра пераносіць, а вясной рана адрасце і дасць цудоўны зялёны ўраджай. Але большасць агароднікаў цыбулю-парэй выкопваюць ужо ў кастрычніку, крыху абразаюць карані, звязваюць у пучкі і ставяць у скрынкі са слоем вільготнага пяску на дне (2-3 см), складваюць цыбуліны адна да адной ушчыльную, прысыпаючы пяском так, каб поўнасцю засыпаць ножку. Захоўваюць у падвале, у такім стане ножка паступова адбельваецца, а вітамінаў у ёй толькі павялічваецца.

ЗАХОЎВАННЕ КАПУСТЫ

Калі вы збіраецеся захоўваць капусту ў качанах, пакідайце як мага даўжэйшыя храпкі і 2-3 верхнія лісты каля качана.

Лепш за ўсё капуста захоўваецца пры тэмпературы каля нуля градусаў. Самыя лёжкія гатункі — Падарунак, Амагер 611, Беларуская.

Некалькі праверaных спосабаў захоўвання капусты:

1. Качаны шчыльна загортваюць у газетную паперу, раскладваюць на невялікай адлегласці адзін ад аднаго ў сухім халаднаватым месцы. Калі з цягам часу папера на некаторых качанах стане вільготнай і пацямнее (прымета загнівання качаноў), яе трэба зняць, качаны ачысціць ад верхніх лістоў і загарнуць у свежую паперу.

2. У сухім падвале з сухога пяску робяць «градкі» вышынёй 30—35 см, знімаюць верхнія зялёныя лісты, ставяць качаны ў «градкі» храпкамі ўніз на адлегласці 5 см адзін ад аднаго.

3. Зніміце верхнія лісты, злёгку ачысціўшы храпкі ад зямлі, качаны развесьце на жэрдках, прывязаных пад столлю так, каб яны не дакраналіся адзін аднаго.

4. Калі капусту трэба захаваць да вясны, тут дапаможа снег (калі ён будзе ляжаць у лютым). Качаны трымаюць у склепе да лютага, затым — у снезе. Для гэтага ў лютым выбіраюць пляцоўку з паўночнага боку будынка, згрэбаюць снег амаль да зямлі, утоптваюць дно і выкладваюць тоўстыя сценкі са снегу вышынёй да 1 м. У створаны катлаван капусту складваюць пірамідай, перасыпаючы кожны слой качаноў снегам, таўшчынёй 5-6 см. Зверху насыпаюць як мага больш снегу, а затым укрываюць сховішча пілавіннем або стружкамі.

ЯК ВЫПРАМІЦЬ ДРЭЎЦА

Вы садзілі яблыню па ўсіх правілах — у вялікія, загадзя выкапаныя ямы з рыхлай чорнай зямлёй, падсыпалі якія трэба ўгнаенні, але дрэва чамусьці стала завальвацца набок. Ці назіралі вы такую карціну ў вашым садзе?

Звычайна гэта здараецца з дрэвамі на клонавых (карлікавых) прышчэпах, якія маюць паверхневую каранёвую сістэму. Іх вырошчваюць на апорах-шпалерах альбо ставяць каля кожнага дрэўца трывалы слуп. Але няўстойлівасць дрэва можа быць выклікана і іншымі прычынамі. Зямля ў пасадачнай яме аказалася вельмі рыхлай. Занадта прасторная яма з рыхлай зямлёй зусім не гарантуе правільнай пасадкі. Бывае, што чорны грунт — не заўсёды прымета высокай урадлівасці. Часцей за ўсё гэта звычайны торф, які ў чыстым выглядзе не мае пажыўнай каштоўнасці для раслін. Ім добра мульчыраваць паверхню зямлі, але не запаўняць пасадачныя ямы. Празмерная рыхласць непрыдатная для пладовых дрэў, таму на тарфяныя ўчасткі папярэдне завозяць гліністую глебу.

Шчыльнасць глебы вы можаце вызначыць самі. Для гэтага спатрэбяцца дакладныя шалі і металічная бляшанка без дна. Ускапайце глебу ў зоне размяшчэння каранёвай сістэмы. Праз некалькі дзён убіце ў яе да краёў бляшанку і паважце зямлю, якая памясцілася ў ёй, падзяліце на аб'ём бляшанкі — гэта і ёсць шчыльнасць глебы.

Як жа выпраміць дрэўца, якое нахілілася набок? Для гэтага трэба замацаваць ствол да трывалага слупа, які забіваецца побач з дрэўцам і пакідаецца, напрыклад, да восені. Потым з дапамогай рычага прыўзняць з ямы грунт і дадаць у яго, перамяшаўшы, неабходныя кампаненты (гліну, суглінак). Можна больш шчыльную глебу падбіць пад карані з боку нахіленай часткі і, выраўняўшы дрэва, замацаваць яго да трывала ўбітага слупа. Вясной трэба дадаць зямлі з аднаго і другога бакоў.

ЗІМОЎКА СУНІЦ

У бясснежныя зімы часта бывае, калі вымярзаюць суніцы. Як жа правільна падрыхтаваць расліны да зімы?

Такая з'ява, як вымярзанне суніц, сустракаецца даволі часта, але вымярзаюць расліны не зімой, як лічаць многія, у лістападзе—снежні, калі снегу ў нас амаль не бывае, а пасля цёплага надвор'я ў лістападзе ці калі ў снежні раптам ударыць мароз. Гэтыя неспрыяльныя фактары выклікаюць сур'ёзныя пашкоджанні не толькі маладых, але і дарослых насадак.

Пры адсутнасці «снежнай пярыны» мароз пашкоджвае перш за ўсё лісты суніц, затым стрыжань (у суніц гэта сасудзістая сістэма), а затым і кветканос. Але самае небяспечнае — пашкоджанне каранёвай сістэмы, якое можа адбывацца не толькі з-за нізкіх тэмператур. Гэта можа быць звязана і з нездаровым станам кустоў.

Многія садаводы стараюцца з восені прапалоць і старанна ачысціць суніцы ад старых лістоў — гэта вялікая памылка, бо глеба пад густой шапкай лістоты і пустазелля доўга не прамярзае. Яшчэ некаторыя садаводы знімаюць верхні слой зямлі, каб пры дапамозе такой працэдуры знішчыць інфекцыю, якая бывае якраз у верхнім слоі. Але такім чынам яшчэ больш агаляюцца расліны.

Трэба памятаць, што ў суніц ёсць свая біялагічная асаблівасць: па меры разрастання кустоў ушырыню каранёвая сістэма нарастае ўверх за кошт маладых карэньчыкаў. Таму суніцы трэба не толькі рыхліць, але і абавязкова акучваць зямлёй да разеткі маладых лістоў, не засыпаючы пры гэтым верхнія пупышкі. У выніку суніцы растуць на невялікіх грэбнях, паверхню якіх трэба абавязкова мульчыраваць. Чым больш рыхлы і больш тоўсты слой мульчы, тым большы шанц у раслін выжыць зімой, калі і не будзе снегу.

Усміхнёмся!

Калі ў метро дзяўчыну паляскаць па попе, дык:

— 9 працэнтаў з іх павернуцца і ўрэжуць табе аплявуху;

— 65 працэнтаў павернуцца і скажуць: «Ты што, дурань?»;

— 25 працэнтаў гэтага нават не заўважаць;

— 1 працэнт могуць стаць вашай жонкай.

Рэзюмэ: хоць працэнт ажаніцца і не вялікі, рызыкаваць не варта.

☺

Згублены жаночы мабільнік акупляецца за 2 месяцы за кошт эканоміі на размовах. А яшчэ праз два, такім чынам, павінен пачаць прыносіць прыбытак!

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.350 Індэкс 63850. Зак. № 5549. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12